Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 САКАВІКА 2008 г.
СУБОТА
№ 55 (26168)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Вялікдзень 23 сакавіка 2008 года

Дарагія суайчыннікі!

Прыміце сардэчныя віншаванні са светлым святам Вялікадня.

Чыстая, глыбокая радасць велікодных падзей зноў аб'ядноўвае вернікаў, напаўняючы іх пачуццём вечнай урачыстасці жыцця і ўсёпераможнай сілай любові.

Уваскрэсенне Хрыстова — галоўны сімвал духоўнага адраджэння і абнаўлення. Гэта свята ўсяляе веру ў перамогу дабра, дорыць надзею на тое, што ўсё дрэннае засталося ў мінулым, а сучаснасць і будучыня прынясуць толькі мір і дабрабыт.

Вялікдзень нагадвае аб высокім прызначэнні чалавека, натхняе на стваральную працу, маральнае ўдасканаленне, заклікае нястомна служыць блізкім, дапамагаць хворым і бедным.

Няхай гэтыя цудоўныя веснавыя дні будуць для вас і вашых блізкіх па-сапраўднаму святочныя, самыя лепшыя і шчаслівыя, сагрэюць цеплынёй і ўзаемаразуменнем вашы сем'і, азараць сэрцы нягаснучым духоўным святлом.

Жадаю вам, дарагія суайчыннікі, моцнага здароўя, удачы ва ўсіх справах і пачынаннях, невычэрпных жыццёвых сілаў і аптымізму.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Пастырскае пасланне на Вялікдзень 2008 г.

УВАСКРАСІ НАС, ПАНЕ, ТВАІМ СЛОВАМ!

Умілаваныя ў Змёртвыхпаўсталым Пану браты ў біскупскім і святарскім служэнні, кансэкраваныя асобы, браты і сёстры!

1. «Не бойцеся, бо ведаю, што вы шукаеце Езуса ўкрыжаванага. Няма Яго тут, Ён уваскрос, як сказаў. Падыдзіце, паглядзіце на месца, дзе быў пакладзены» *(Мц 28, 5—6)*. Гэтыя словы Анёла, які сядзеў на камені каля ўваходу ў грабніцу Пана, сёння гучаць у нашых касцёлах і капліцах, у нашых супольнасцях. Гэтыя словы глыбока пранікаюць у нашыя сэрцы, перамяняюць іх і напаўняюць радасцю, даючы нам новую надзею.

Радасным воклічам: «Хрыстус уваскрос! — Сапраўды ўваскрос!», — мы абвяшчаем праўду збаўчай урачыстасці Змёртвыхпаўстання Пана і дзелімся ёю з іншымі. Мы нясём яе ў свет, спяшаемся з ёю да іншых людзей, так, як паспяшаліся жанчыны-міраносіцы, калі, прынёсшы алеі для намашчэння, замест цела Езуса ўбачылі пустую грабніцу, куды яно тры дні таму было пакладзена.

2. Вечна жывое і заўжды актуальнае Божае слова, якое прыносіць нам гэтую радасную пасхальную вестку, павінна быць таксама і дзейсным *(пар. Гбр 4, 12)*, павінна заахвочваць да навяртання і духоўнага адраджэння. Для гэтага нам неабходна дазволіць Хрысту, каб Ён сваёю ласкаю ўваскрасіў нас да новага жыцця. Ці магчыма гэтага дасягнуць у наш секулярны час?

Жанчыны-міраносіцы непакоіліся, кажучы адна адной: «Хто адсуне нам камень ад уваходу ў магілу?» *(Мк 16, 3)*. У нашым жыцці адбываецца нешта падобнае. Жыццё здалёк ад Бога і Яго ласкі, або нават такое жыццё, як быццам Бог наогул не існуе, становіцца тым каменем, які закрывае перад Хрыстом уваход у нашыя сэрцы. Прычым часам нам здаецца, што гэты камень такі вялікі, што ніхто не ў стане адсунуць гэты камень.

Аднак праўда Уваскрасення сведчыць пра адваротнае. Няўжо ж Хрыстус, які ўваскрасіў Лазара *(пар. Ян 11, 38—44)* і сам паўстаў з мёртвых, не зможа нас вызваліць з грахоўнай няволі? Безумоўна, Ён — міласэрны Езус — можа гэта зрабіць і робіць гэта. Трэба толькі дазволіць Яму дзейнічаць. Сам Ён нікога ні да чаго не прымушае: прапануючы сваю дапамогу, Хрыстус паважае свабоду чалавека. Таму толькі ад нас залежыць, ці прымем мы яе, ці адмовімся ад яе.

Перажываючы год Божага слова — крыніцы надзеі, якая, як вучыць нас Папа Бенядыкт XVI, з'яўляецца асноўным словам біблейскай веры *(пар. SS 2)*, неабходна звярнуцца да яго сілы, каб яно разам з Традыцыяй Касцёла заахвоціла нас адсунуць камень ад уваходу ў цёмную пячору нашай душы, каб праўда Уваскрасення Пана заззяла ў нас.

3. Мы перажываем надыход вясны, якая на нашых вачах абуджае прыроду да новага жыцця. Таксама і моц Уваскрасення Хрыста, якая праяўляецца таксама ў Божым слове, павінна ажыўляць чалавека.

Вядома, што дрэва з пашкоджаным карэннем сохне і памірае. Таксама і хрысціянін, які па сваёй волі адмаўляецца ад уласных каранёў і не прымае праўды пра Уваскрасенне, такім чынам асуджае сябе на духоўную смерць. Таму, каб не змарнаваць збаўчай і жыватворчай ласкі Уваскрасення Пана, неабходна заўсёды захоўваць вернасць свайму хрысціянскаму пакліканню.

Недастаткова быць толькі намінальнымі і анамімнымі хрысціянамі, якіх з Касцёлам не аб'ядноўвае нічога, акрамя пасведчання хросту. Недастаткова толькі раз на год, на Вялікдзень, прыйсці ў касцёл, каб асвяціць святочныя стравы, пазахапляцца велічным спевам «Аллелюя», вялікімі натоўпамі вернікаў, а пасля зноў надоўга забыцца пра шлях да святыні. Толькі гэтага далёка не дастаткова...

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Месца нараджэння 84-гадовай Веры ШЫНКЕВІЧ (на здымку) — вёска Святы Дух Ашмянскага раёна. Яе, былой лепшай калгаснай звеннявой-ільнаводкі, працоўны лёс пачынаўся на святадухаўскіх палетках. І сёння пра гэта сведчаць некалькі медалёў за яе працоўныя дасягненні. І яшчэ ў многіх аднавяскоўцаў Веры Дамінікаўны ў пашпартах месцам нараджэння пазначана вёска з сакральнаю назвай. Але на сучасных картах такога населенага пункта даўно не знойдзеш, бо ўжо шэсць дзесяткаў гадоў у вёскі іншая назва — Будзёнаўка. Большасць тутэйшых жыхароў — католікі і належаць да парафіі ў Ашмянах. І толькі дзякуючы касцёлу ў памяці бераўліва захоўваецца рэдкая і, без перабольшвання сказаць, унікальная назва. Пра гісторыю паходжання Святога Духа і яе сённяшніх жыхароў чытайце на 3-й стар.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ПЕРШАЯ ПАЛОВА ТЫДНЯ — ХАЛАДНАВАТАЯ

Аб гэтым паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый Рабаў.

Чакаюцца працяглыя снег і завіруха. Парывы ветру месцамі будуць дасягаць 15—20 метраў у секунду. Ноччу ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, удзень — ад мінус 1 градуса да плюс 4. У другой палове тыдня — ад нуля да мінус 5 градусаў. Удзень тэмпература паветра складзе 2—8 градусаў цяпла.

У выхадныя дні на большай частцы рэспублікі будзе пераважаць воблачнае надвор'е. Чакаецца мокры снег, туман і галалёдзіца. Ноччу каля нуля, удзень — плюс 2—8 градусаў. Няўстойлівае надвор'е захаваецца і ў першай дэкадзе красавіка.

У ІНТЭРНАЦЕ НА ПАЖАРЫ ЗАГІНУЛІ ЛЮДЗІ

Учора раніцай у 5.20 у Ашмянскі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях паступіў сігнал аб задымленні на трэцім паверсе чатырохпавярховага будынка інтэрната, што належыць ААТ «Будаўнік».

Паводле слоў начальніка цэнтра прапаганды і навучання пры ўстанове «Гродзенскае абласное ўпраўленне МНС» Ігара Сандуленкі, першыя падраздзяленні прыбылі на месца ўжо праз чатыры хвіліны. Праводзячы разведку, яны знайшлі ў памяшканні два трупы з прыкметамі апёкаў рознай ступені цяжкасці. Яшчэ аднаго загінулага з пакоя крыху раней выцягнулі суседзі. Паводле слоў апошніх, напярэдадні кватэранаймальнік, непрацуючы 1956 г.н., і яго госці — нарыхтоўшчыкі лесу адной з мясцовых арганізацый, 1972 і 1975 г. н., ужывалі спіртныя напоі. Як мяркуецца, прычынай пажару стала неасцярожнасць пры курэнні. У памяшканні пацярпела маёмасць, сцены. Як дадаў Ігар Сандуленка, у інтэрнаце не было аўтаматычнай пажарнай сігналізацыі, пра што дагэтуль адзначалася пры праверках.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КОШТ РЫЭЛТАРСКІХ ПАСЛУГ — 1—3 ПРАЦЭНТЫ АД СУМЫ ЗДЗЕЛКІ З НЕРУХОМАЙ МАЁМАСЦЮ

Аб гэтым паведаміў журналістам міністр юстыцыі Беларусі Віктар Галаванаў, спасылаючыся на пастанову Савета Міністраў, выдадзеную ў мэтах выканання ўказа Прэзідэнта. «Гэта выгадна як карыстальнікам гэтых паслуг і самім добрасумленным рыэлтарам, так і кантралюючым органам», — сказаў міністр.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион

по продаже: здания дома животноводов об. пл.152,3 кв.м, здания коровника об. пл. 852,0 кв.м, расположенных: Логойский р-н, д. Заколюжье. Площадь зем. участка 0,8662 га. Начальная цена – 101 432 800 бел. рублей с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.02.2008 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 08.04.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 07.04.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион

по продаже здания магазина (об. пл. 105 кв.м), расположенного в Пуховичском районе, д. Заречаны. Площадь земельного участка 0,0322 га. Начальная цена с НДС — 25 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.02.2008 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 01.04.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 31.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

Рэпартаж з колаў

«Я ЎСІМ РАІЛА І РАЮ: ВЫПІСВАЙЦЕ, ЧЫТАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ».

Гуляйце. І некалі — абавязкова выйграеце!»

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 21 сакавіка).

Халадзільнік — дачцэ, фатаграфію — маме Яўгеніі Валяр'янаўне ШМЫГІНАЙ.

Не вам казаць: на карце краіны ёсць вёскі, ёсць гарады-мястэчкі, якія загадзя любіш. Яшчэ нават не ўбачыўшы... Ну сапраўды — хіба ж можна не любіць Любчу?! За адну толькі назву... Мы ж, яшчэ перад ад'ездам, з розных крыніц даведаліся, што мястэчка гэтае мела магдэбурскае права, што ў ім у XVII стагоддзі працавала друкарня і выдавалі-ся кнігі па гісторыі, медыцыне і філасофіі, што тут, на высокім беразе Дняпра, быў замак і чатырохгектарны парк, што адсюль ва ўсе куткі краіны і нават за межы вывозіліся (і вывозяцца) на дзіва смачныя хлябы-пірагі і сыры, што мясцовы СВК «Прынёманскі» — адна з лепшых гаспадарак раёна, што тутэйшую школу скончылі заслужаны ўрач Расіі прафесар Д. Хіневіч, генерал-лейтэнант авіяцыі Г. Ясінскі, дактары навук У. Шайбак, В. Баршчэўскі, У. Красоўскі, К. Кохан...

Асобных з выпускнікоў, з настаўнікаў пашчасціла асабіста ведаць. Прынамсі, галоўным акушэрам-гінекалогам Міністэрства аховы здароўя доўга працаваў Дзмітрый Міхайлавіч Міхнюк, матэматыку ў школе ўсё жыццё выкладаў ветэран Вялікай Айчыннай Аляксандр Паўлавіч Аляшкевіч, беларускую літаратуру і мову — яго жонка Клаўдзія Рыгораўна. Прыгажэнныя людзі і, дарэчы, пастаянныя падпісчыкі «Звязды»...

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў Мітрапаліта Філарэта з днём нараджэння

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі з днём нараджэння.

«Многія гады Вы прысвяцілі служэнню беларускаму народу, стаялі ля вытокаў адраджэння Праваслаўя ў нашай краіне, — гаворыцца ў віншаванні. — Мы ведаем і высока цэнім Вашу актыўную жыццёвую пазіцыю, падзвіжніцкую працу па маральнаму выхаванню людзей, развіццю сацыяльнага служэння Царквы і яе супрацоўніцтву з дзяржавай і грамадствам».

«Вы ўнеслі неацэнны ўклад ва ўмацаванне праваслаўных традыцый, фарміраванне здаровага ладу жыцця дарослых і дзяцей, захаванне духоўнай і культурнай спадчыны Беларусі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прамая лінія

УСЁ ПРА ДАПАМОГУ З АДРАСАМ

З моманту ўвядзення новых умоў аказання адрасная сацыяльнай дапамогі прайшло больш за тры месяцы. Між тым гэта тэма — па-ранейшаму на слыху. Хто можа і хто не можа разлічваць на адрасную падтрымку, на каго з членаў сям'і яна прызначаецца, як вызначаюцца выплаты, што такое сукупны даход і каэфіцыент уліку эфекту ад сумеснага пражывання? Аб усім гэтым і іншым мы прапануем вам пагутарыць падчас «прамой лініі» з **начальнікам упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянцінай Пятроўнай СЯРГЕЕВАЙ.**

Канкрэтныя час і дата «прамой лініі» будуць вызначаны крыху пазней. А пакуль чакаем вашых папярэдніх пытанняў па нумары (8017) 287 17 57.

Нашчадкі вогненных вёсак

ЗНАК ЗВЕРА

У здраднікаў-злачынцаў няма нацыянальнасці

Праз 65 гадоў пасля Хатынскай трагедыі настаў час без «купюр» расказаць аб тым, што гэту беларускую вёску знішчыў 118-ы паліцэйскі батальён. Кіраваў карнай аперацыяй колішні начальнік штаба батальёна Васюра.

...Гэта ўзыходжанне да Праўды было доўгім і няпростым. Чаму?

Пра гэта мы гутарым з кіраўніком Белінюркалегіі Віктарам Васільевічам ГЛАЗКОВЫМ. У 1986 годзе ён быў старшынёй ваеннага трыбунала, калі на лаве падсудных сядзеў той самы хатынскі кат Васюра.

— Гляджу рэпартажныя здымкі судовага працэсу — і сэрца сціскаецца... Цяжкі быў працэс?

— Надзвычай складаны.

— Колькі часу ён доўжыўся?

— Прыкладна паўтара месяца. Было дакладна ўстаноўлена, што Хатынь знішчаў 118-ы паліцэйскі батальён. Ён быў сфарміраваны ў студзені 1942 года ў Кіеве. На яго крывавым рахунку — масавыя расстрэлы ў Кіеве, у Бабіным Яру. Потым батальён перадыслацыраваўся на тэрыторыю Беларусі для барацьбы з партызанамі.

— Якой была колькасць гэтага фарміравання?

— Каля 300 чалавек: здраднікі, якія добраахвотна сталі на службу гітлераўцам. Большасць з іх прайшлі ваенную падрыхтоўку на тэрыторыі Германіі. У нямецкіх лагерах, школах іх навучылі неверагоднай жорсткасці. Так званыя шэфы батальёна былі з ліку нямецкага камандавання.

118-ы паліцэйскі батальён складаўся ў пераважнай большасці з асобаў украінскай нацыянальнасці. Былі там і рускія, і, на вялікі жаль, беларусы. Але, паўтараю, абсалютная большасць — украінцы. Прычым выхадцы ў асноўным з заходніх рэгіёнаў Украіны.

Ва ўсіх іх была, па сутнасці, адна ідэалогія — фашызм. Яны верна служылі немцам. Верна. Аддана... Калі нападалі на вёску, усё знішчалі там — па-звярынаму жорстка. Яны ўспрымалі гэта як сваю работу — забіваць мірных жыхароў, паліць беларускія вёскі.

Хатынь — яскравае сведчанне таго, што яны нікога не шкадавалі. Ні старога, ні малога. Усіх сагналі ў хлеў, падпалілі. Хлеў гарыць, крыкі людзей... А побач стаяць кулямётчыкі з ліку ўкраінцаў. Страляюць...

Над злачынцамі 118-га батальёна прайшлі тры судовыя працэсы. У пачатку 1970-х судзілі Кнапа і Лазінскага, у 1975-м — Мялешку. У 1986-м — былога начальніка штаба батальёна Рыгора Васюру, які меў рэальную ўладу, хоць намінальна батальёнам камандаваў немец Эрых Кёрнер.

У 1986 годзе па матэрыялах крымінальнай справы нам удалося сабраць на працэс 26 так званых «свядак» — удзельнікаў хатынскага і іншых падобных злачынстваў. Прысутнічалі на працэсе Кнап і Лазінскі. Ваенны трыбунал прыгаварыў іх да расстрэлу, а Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР памілаваў і вызначыў тэрмін зняволення — 15 гадоў (невялікі тэрмін пакарання прызначаны за іх злачынныя дзеянні ў складзе 118-га паліцэйскага батальёна). Яны былі ў мяне сведкамі на працэсе. Ім заставалася каля трох гадоў да адбыцця тэрміну зняволення, іх даставілі ў Мінск пад канвоем з лагера ў Комі АССР.

— Ці ўсіх злачынцаў 118-га батальёна ўдалося прыцягнуць да адказнасці?

— На жаль, не. На момант суда карнік па прозвішчы Катрук пражываў у Канадзе. У нас былі дакладныя звесткі на гэты конт. Пасля завяршэння працэсу праз Міністэрства замежных спраў СССР (яго тады ўзначальваў А.А. Грамыка) былі пасланы ноты канадскаму ўраду з просьбай аб выдачы Катрука.

Было ўказана, дзе ён пражывае на тэрыторыі Канады. Аднак адказ канадскага боку быў надзвычай лаканічным: такі чалавек па гэтым адрасе не пражывае. А ў нас жа былі фотаздымкі разведкі: ён выходзіць з веснічак каля дома — гэткі прыязны дзядок... Менавіта гэты чалавек 22 сакавіка 1943 года насупраць палаючага хлява ў Хатыні страчыў з кулямёта па людзях, якія выбягалі з вогнішча. Катрук быў кулямётчыкам у 118-м батальёне.

А цяпер, мабыць, той-сёй ва Украіне яго, як і іншых карнікаў, назваў бы героем!?.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

Тамы крымінальнай справы.

Старшыня ваеннага трыбунала 1986 года Віктар ГЛАЗКОЎ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ХАТЫНЬ: усенародны боль і памяць

Сёння ў Дзяржаўным мемарыяльным комплексе «Хатынь» пройдзе мітынг-рэквіем, прысвечаны 65-й гадавіне трагедыі. Потым адбудзецца «круглы стол» на тэму «Хатынь: усенародны боль і памяць».

У ім плануюць узяць удзел сведкі хатынскай трагедыі Віктар Жалабковіч, Уладзімір Яскевіч і Соф'я Яскевіч, сведкі іншых беларускіх «вогненных» вёсак, а таксама прадстаўнікі мемарыялаў «Лідзіцэ» (Чэхія), «Арадур-сюр-Глан» (Францыя), «Саласпілс» (Латвія), «Пірчупіс» (Літва), музея Піскароўскіх могілак Санкт-Пецярбурга, а таксама гісторыкі, архівісты, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, аўтарскі калектыў хатынскага комплексу.

— Спецыяльна да гэтай жалобнай даты падрыхтавана сувенірная прадукцыя. З Белпоштай дасягнута дамоўленасць аб гашэнні маркіраванага канверта, — гаворыць дырэктар ДМК «Хатынь» Канстанцін Мішын. — Будуць абмеркаваны крокі па больш цеснай сумеснай дзейнасці мемарыялаў, прысвечаных падобнай трагедыі.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Стаўка падатку на даходы ад аперацый з акцыямі і аблігацыямі ў Беларусі з 1 красавіка зніжаецца з 40 да 24 працэнтаў

Стаўка падатку на даходы ад аперацый з акцыямі і аблігацыямі ў Беларусі з 1 красавіка зніжаецца з 40 працэнтаў да 24 працэнтаў. Прэзідэнт Беларусі 20 сакавіка выдаў адпаведны дэкрэт № 5, якім уносяцца змяненні і дапаўненні ў дэкрэт ад 23 снежня 1999 г. № 43 «Аб падаткаабкладанні даходаў, атрыманых у асобных сферах дзейнасці». Дэкрэт уступае ў сілу з 1 красавіка 2008 года, з'яўляецца часовым і прадстаўляецца на разгляд Нацыянальнага сходу Беларусі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АКЦЫЯНАВАННЕ МАЗА НЕ ВЫКЛЮЧАНА

Аб гэтым заявіў намеснік міністра прамысловасці Беларусі Валянцін Гурыновіч. «Не выключана, што будзе акцыянернае таварыства. Мы ездзілі ў Расію, атрымалі прапановы ад КАМАЗа і Групы ГАЗ. Прапановы па акцыяніраванню абмяркоўваліся, але пакуль мы не бачым прымальных умоў», — адзначыў Валянцін Гурыновіч.

БЕЛТА.

Открытое акционерное общество «Минский подшипниковый завод» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже объекта недвижимости «База испытаний новых видов сельскохозяйственной техники» в д. Якшицы Березинского района Минской области. Земельный участок 0,5143 га. Начальная цена снижена на 25 процентов и составляет 38 813 938 рублей без учета НДС.

Размер задатка составляет 10 % от начальной цены лота и перечисляется на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331 г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости». Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона. Договор купли-продажи заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона. Закрепление земельного участка за новым собственником будет произведено местной землеустроительной и геодезической службой. Объект продается при условии соблюдения ограничений в использовании земель в водоохранных зонах и прибрежных полосах малых рек, которые изложены в приложении к государственному акту на земельный участок. Оплата производится в соответствии с договором купли-продажи. **Аукцион состоится 9 апреля 2007 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 8 апреля 2007 г. до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Контактный телефон (8 017) 227 40 22

УНП 190398583

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 22.03.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 146,00
1 еўра	3 318,47
1 латвійскі лат	4 764,12
1 літоўскі літ	961,10
1 чэшская крона	130,29
1 польскі злоты	939,05
1 расійскі рубель	90,25
1 украінская грыўня	432,01

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	23,7773
10 UAH	46,9036
1000 BYR	11,0702
EUR	36,7526

Курс у гандлёвых кампаніях (на 21.03.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

0 8055 >

9 771990 763008

Налета на алеі балета...

Адной з жамчужын беларускай сталіцы нароўні з Нацыянальнай бібліятэкай назваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета. Рэканструкцыя знакамітага будынка ў цэнтры Мінска доўжыцца з 2006 года. Улічваючы культурную важнасць і гістарычную каштоўнасць аб'екта, кіраўнік дзяржавы ўзяў яе пад асабісты кантроль. Учора Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся, як выконваюцца дадзеныя ім даручэнні.

Будынак тэатра ўзведзены яшчэ ў 1935—1937 гадах. Таму нядзіўна, што поўны фізічны знос асноўных элементаў, інжынерных камунікацый, абсталявання сцэны зрабіў яго далейшую жыццядзейнасць фактычна немагчымай. Праект рэстаўрацыі і рэканструкцыі помніка архітэктуры, распрацаваны Інстытутам «Белдзяржпраект», прадугледжвае значнае пашырэнне рэпетыцыйнай базы, мадэрнізацыю тэхналагічнага абсталявання сцэны, і, пра што асабліва прыемна будзе даведацца гледачам, — павелічэнне колькасці месцаў у зале да 1207. Пры гэтым так званых «мёртвых зонаў», адкуль дрэнна бачна ці чутно тое, што адбываецца на сцэне, фактычна не застанецца. На фасадзе будынка тэатра размесцяць скульптуры муз танца, тэатра, паэзіі і музыкі.

Істотна зменіцца і выгляд пляцоўкі перад галоўным уваходам у тэатр. Добраўпарадкаванне прадугледжвае перанос помніка беларускаму песняру Максіму Багдановічу. Мяркуецца, што помнік застанецца на тэрыторыі парку, які прылягае да тэатра, але толькі змесціцца ў бок вуліцы, названай у гонар вялікага паэта. Аляксандр Лукашэнка адобрыў такую прапанову.

Паводле слоў Уладзіміра Мацвейчука, з нагоды пераносу помніка ёсць некалькі меркаванняў. Аднак згодна з праектам на яго месцы павінны размясціцца архітэктурны ансамбль, які ўключае скульптурныя кампазіцыі і фантан. Побач размесцяцца дзве алеі: алея балета і алея оперы.

— Лічыце, што рашэнне аб пераносе помніка прынятае, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы ж нічога не знішчаем, пераносьце і рабіце ўсё, што неабходна.

Падчас размовы з міністрам культуры Уладзімірам Мацвейчуком, мэрам Мінска Уладзімірам Паўлавым, дырэктарам генпадрадной арганізацыі Валерыем Поткіным, іншымі адказнымі асобамі, Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў жорстка вытрымліваць тэрміны здачы аб'ектаў. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўсе закупачныя аперацыі павінны праводзіцца толькі праз тэндар, а айчынныя вытворцы задзейнічаны па максімуму. У выпадку неабходнасці да праверкі выканання гэтых і іншых даручэнняў можа быць падключаны Камітэт дзяржкантролю.

Фактычна на сёння ўведзены ў эксплуатацыю першы пускавы комплекс. Адбылося перасяленне трупы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра балета Рэспублікі Беларусь і калектыву Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнт асабіста азнаёміўся з ходам рэканструкцыі будынка тэатра: наведаў фае глядацкай залы, пазалотную майстэрню, рэпетыцыйную залу, прымерачныя і артыстычныя пакоі, кафэ, ацаніў узоры жырандоляў, якія ўпрыгожаць памяшканні...

На развітанне Аляксандр Лукашэнка даручыў завяршыць усе работы па рэканструкцыі тэатра да 1 студзеня 2009 года. А ў пачатку сакавіка, як мяркуецца, да Міжнароднага жаночага дня адбудзецца ўрачыстае адкрыццё сцэны тэатра.

Сяргей ПРОТАС.

Пастырскае пасланне на Вялікдзень 2008 г.

УВАСКРАСІ НАС, ПАНЕ, ТВАІМ СЛОВАМ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пасхальныя традыцыі належыць прыняць і перажываць ва ўсёй глыбіні сэнсу гэтай галоўнай хрысціянскай урачыстасці. Так, напрыклад, асвячэнне велікодных страваў павінна дапамагаць у духоўным асэнсаванні свята Пасхі. Асвячоныя яйкі, якія з'яўляюцца сімвалам жыцця, — гэта знак таго, што Змёртвыхпаўстанне Пана вядзе да новага жыцця і дае надзею.

4. Уваскрасенне Хрыста павінна стаць часткаю нашага жыцця. Калі ўваскрослы Хрыстус стукаецца ў дзверы нашых сэрцаў, заваленыя цяжкімі камянямі грахоў, трэба перш адсунуць камяні, каб іх адчыніць. Для гэтага разам з марнатраўным сынам з евангельскай прыпавесці кожны павінен сказаць: «Ойча, я зграшыў супраць неба і перад табою» і кінуцца на шыю нашаму Міласэрнаму Айцу *(пар. Лк 15, 21)*.

Не памёршы для граху, мы не зможам уваскрэснуць да новага жыцця. Як не было ўваскрасення Хрыста без Яго крыжовай смерці, так не можа быць і нашага вызвалення з няволі граху без збаўчага крыжа пакаяння. Неабходна ўсвядоміць сваю слабасць і звярнуцца да Хрыста са словамі злачынцы, які пакаяўся: «Узгадай мяне, Пане, калі прыйдзеш у сваё Валадарства» *(Лк 23, 42)*. Гэта неабходна зрабіць, каб у адказ пачуць поўнае надзеі абяцанне: «Сапраўды кажу табе, што сёння будзеш са Мною ў раі» *(Лк 23, 43)*.

Крыж — гэта знак Божай міласэрнасці, ён вядзе нас да ўнутранай свабоды. Таму нельга абыякава абмінуць яго. Хоць чалавеку і нялёгка пакінуць свае дрэнныя схільнасці і звычкі, тым не менш неадменнаю ўмоваю ўваскрасення да новага жыцця з'яўляецца разрыў з мінулым. Гэта і ёсць крыж нашага жыцця, але крыж, праз які дасягаецца збаўленне.

5. У вандроўцы з егіпецкай няволі ў Абяцаную зямлю юдэі з жалем узгадвалі пра тое, як яны сядзелі пры катле з мясам і елі ўдосталь хлеба *(пар. Зых 16, 3)*. Перад абліччам часовых цяжкасцяў яны лічылі няволю лепшаю за свабоду, абы толькі мець ежы ўдосталь. Матэрыяльныя даброты сталіся для іх вышэйшымі за дар свабоды.

Калі ў жыцці месца Бога і Ягонага закона занятае ідаламі багацця, бездаказнай вольнасці, амаральных асалодаў, задаволення неўпарадкаваных жаданняў, лібералізму, маральнага рэлятывізму, хлуслівай «рэлігійнай палітыкарэктнасці» і іншых сучасных бажкоў, такі чалавек не зможа ва ўсёй паўнаце перажыць праўду Уваскрасення Хрыста. Замест радасці прыняцця Хрыстовых таямніцаў духоўна свабоднага чалавека яму больш даспадобы «кацёл з мясам» егіпецкай няволі ў яе новых формах.

6. Пазбаўлены ўнутранай свабоды і закуты ў кайданы грахоўнай няволі, чалавек не зможа перажыць усёй глыбіні таямніцы Змёртвыхпаўстання Пана, бо Пасха — гэта пераход з няволі да свабоды, Пасха — гэта вызваленне! Беручы прыклад са святога Аўгустына мы павінны баяцца свядома абмінуць Бога, пазбягаючы сустрэчы з Ім і імкнучыся ў няволю граху, спажывальніцтва, задавальненняў і іншых формаў залежнасці. У наш тэмпадэрнісцкі час неабходна прыняць Уваскрослага Хрыста так, як Яго прынялі апосталы. Таямніца Змёртвыхпаўстання Пана вярнула ім страчаную надзею, а спасланы ім Святы Дух натхніў на самаадданае абвяшчэнне Добрай Навіны.

7. Уваскрослы Хрыстус сёння звяртаецца да нас са словамі: «Не бойцеся!» *(Мц 28, 10)*, таксама, як сказаў гэта жанчынам-міраносіцам. Словы «Не бойцеся!» сталі дэвізам служэння Слугі Божага Яна Паўла II (*пар. МЗ, с. 26)*, трыццацігоддзе абрання якога на пасад святога Пятра будзе адзначацца сёлета. Яго заклік далей развівае Папа Бенядыкт XVI, падкрэсліваючы, што не варта баяцца Пана Бога, які нічога не забірае, а толькі дае (пар. WSP, s. 36).

Сёння, перад абліччам выклікаў секулярызму, рэлігійнай абыякавасці, а таксама праяваў адыходу ад веры, Хрыстус, які кажа: «Не бойцеся», бо «Я перамог свет» (Ян 16, 33), перамог грэх, смерць і сатану, заклікае нас спазнаць і палюбіць праўду, якою з'яўляецца Ён сам, наш Уваскрослы Пан.

Гэтая праўда даражэйшая за ўсе матэрыяльныя даброты і задавальненні гэтага свету. У святле праўды Змёртвыхпаўстання Пана, які адкрывае нам шлях да вечнага шчасця, неабходна ўсвядоміць і прыняць глыбока ў сваё сэрца тое, што з'яўляецца сапраўднаю каштоўнасцю, і адмовіцца ад ілюзій, якія вядуць да расчараванняў.

Нягледзячы на тое, што сучаснаму чалавеку, асабліва маладому, пагражае вялізная колькасць небяспекаў, перадусім для яго духоўнага жыцця, яму неабходна ўважліва ўслухацца ў заклік Хрыста: «Не бойцеся!», бо, калі Езус здольны ўваскрасіць памерлага з магілы, то Яму не будзе складана вырашыць і нашыя духоўныя праблемы. Трэба толькі спадзявацца на Яго і жыць у свабодзе дзяцей Божых.

8. Мы таксама павінны з пашанаю ставіцца да новых умоваў набытай свабоды веравызнання, захоўваць і абараняць першынство Божага закона, які з'яўляецца гарантыяй дабра для кожнага чалавека. Неабходна памятаць, што свабода з'яўляецца патрабавальнай; яна не захоўваецца аўтаматычна і знішчае сябе тады, калі жадае стаць неабмежаванаю, спрыяючы развіццю маральнага рэлятывізму, як падкрэслівае Папа Бенядыкт XVI *(пар. CPE, s. 133—135)*.

Таму перад абліччам небяспечных выклікаў сучаснасці нам неабходна прыняць праўду Уваскрасення Хрыста і жыць ёю; неабходна дазволіць Хрысту дзейнічаць у нас, бо будучыні не ўдасца пабудаваць толькі на мінімалісцкай этыцы, на павярхоўнай традыцыйнай рэлігійнасці, якой пагражаюць небяспекі секулярызму, маральнага рэлятывізму і «рэлігійнай паліткарэктнасці».

9. Браты і сёстры!

Уваскрасенне Хрыста напоўніла апосталаў радасцю і надзеяй. Таму пасля Вялікага посту — часу нашага навяртання — узрадуемся і мы светламу святу Пасхі, святу жыцця і надзеі!

Ад усяго сэрца віншую вас са збаўчаю ўрачыстасцю ўваскрасення Хрыстова. Віншую таксама хрысціянаў іншых веравызнанняў, якія сёння адзначаюць гэтае Свята святаў. Віншую вернікаў Праваслаўнай Царквы, якія перажываюць святы час падрыхтоўкі да Вялікадня і ад усёй душы жадаю, каб ён сапраўды стаў бласлаўлёным часам для нашых праваслаўных братоў і сясцёр. Перад абліччам выклікаў секулярызму мы пакліканыя да сумеснага сведчання пра хрысціянскія каштоўнасці і да іх абароны. Ад гэтага будзе залежаць, ці стане набыткам нашых сучаснікаў збаўчая праўда Уваскрасення Хрыста, якая вядзе да духоўнай свабоды.

Праз заступніцтва Марыі, якая з радасцю прыняла вестку пра Змёртвыхпаўстанне Яе Сына, усім вам жадаю шчасця, радасці і шчодрых ласкаў ад Уваскрослага Збаўцы і ад шчырага сэрца бласлаўляю ў імя Айца і Сына, і Духа Святога. Амэн.

Хрыстус уваскрос! — Сапраўды ўваскрос!

Арцыбіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі

Мінск, 15 сакавіка 2008 г.
Урачыстасць св. Юзафа

Выкарыстаная літаратура і прынятыя скарачэнні:

1. Бэнэдыкт XVI, энцыкліка Spe salvi (SS).
2. Иоанн Павел II, «Мысли о земном». Москва 1992 (МЗ).
3. Benedykt XVI, «Wedlug serca Pana». Warszawa 2005 (WSP).
4. Jozeph Kardynal Ratzinger, «Czas przemian w Europie». Wydawnictwo «M», Krakow 2005 (CPE).

Віктар ЗУБКОЎ:

«САНКЦЫІ ЗША СУПРАЦЬ «БЕЛНАФТАХІМА» — ПАЛІТЫЗАВАНЫ КРОК»

Учора ў Мінску адбылося чарговае пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы. Абмеркавана больш за 20 важных пытанняў, падпісаны шэраг дакументаў.

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі падкрэсліў, што рашэнне канкрэтных задач інтэграцыі накіравана на фарміраванне адзінай эканамічнай прасторы Беларусі і Расіі. Паводле яго слоў, летась былі ўрэгуляваны шэраг праблем у гандлёва-эканамічнай сферы, зняты пытанні па экспарту лекаў, транзіту тавараў, перавозках на чыгунцы. Старшыня ўрада Расійскай Федэрацыі Віктар Зубкоў падкрэсліў: за апошнія чатыры гады аб'ём узаемнага гандлю падвоіўся, а летась ён дасягнуў рэкорднай адзнакі — больш за 26 млрд долараў ЗША.

На сустрэчы з журналістамі Сяргей Сідорскі адзначыў, што асаблівая ўвага была звернута на забеспячэнне энергетычнай і харчовай бяспекі Саюзнай дзяржавы. З гэтай нагоды разгледзелі балансы попыту і прапаноў па электраэнергіі на гэты год і па найважнейшых відах харчавання да 2012 года.

Імклівы рост сусветных цэнаў на харчаванне (толькі летась яны ўзняліся амаль на 40 працэнтаў) прымушае саюзнікаў сумесна шукаць меры па супрацьстаянні гэтай тэндэнцыі. Віктар Зубкоў засяродзіў увагу: прыйшоў час шырокамаштабных інвестыцый у развіццё інфраструктуры сельскай гаспадаркі, захавання, перапрацоўку і транспарціроўку яе прадукцыі.

Вядома, апошнім часам асабліва вострыя спрэчкі паміж Расіяй і Беларуссю на такіх і іншых сустрэчах ішлі вакол цэнаў на пастаўкі газу. Гэта ў беларуска-расійскім эканамічным супрацоўніцтве, бадай, самая складаная тэма. На погляд Віктара Зубкова, трэба, каб усе пытанні, якія ўзнікаюць наконт газу, вырашаліся на падставе кантактных абавязацельстваў.

На пасяджэнні прагучала і тэма санкцый ЗША супраць «Белнафтахіма». Абодва кіраўнікі ўрадаў адназначна асудзілі такія меры. У прыватнасці, расійскі прэм'ер заявіў, што лічыць гэты крок палітызаваным. Замест дыялогу Вашынгтон працягвае ўзмацняць ціск на Беларусь. Такія дзеянні ЗША не ўпісваюцца ў міжнародна-прававы кантэкст міждзяржаўных адносінаў, сказаў Віктар Зубкоў.

На пасяджэнні Саўміна таксама ішла размова аб праграме дзеянняў у знешняй палітыцы, бяспецы дзвюх дзяржаў у святле новых геапалітычных рэалій, барацьбе са злачыннасцю, супрацоўніцтве ў космасе, фарміраванні агульнай адукацыйнай прасторы, стварэнні рынку паслуг сувязі Саюзнай дзяржавы.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

У разліках за газ на змену долару прыйдзе рубель?..

Некаторую разнастайнасць у банкаўскае жыццё рэспублікі ўнесла ўчора навіна, якую агучыла на сустрэчы з журналістамі ў Мінску кіраўніцтва ААТ «Белгазпрамбанк»: на агульным сходзе акцыянераў было вырашана павялічыць статутны фонд банка (цяпер ён складае 28 мільёнаў долараў ЗША) на 75 мільёнаў долараў.

Акрамя таго, налета плануецца павялічыць статутны фонд банка яшчэ на 75 мільёнаў долараў за кошт узносаў «Газпрама» і Газпрамбанка. Паводле слоў намесніка старшыні праўлення ААТ «Газпрам» Андрэя Круглова, пасля завяршэння падпіскі на акцыі Белгазпрамбанка ў красавіку доля «Газпрама» ў статутным фондзе фінансавай установы складзе 48,1 працэнта, ААТ «Газпрамбанк» — столькі ж, а доля беларускага боку — 3,8 працэнта. Згодна са стратэгічнай праграмай развіцця банка, якую прадставіў старшыня праўлення Белгазпрамбанка Віктар Бабарыка, мяркуецца, што да 2012 года банк наросціць уласны капітал да 277 мільёнаў долараў, а яго актывы ўзрастуць да 1,7—1,8 мільярда долараў. Такім чынам, да згаданага перыяду банк плануе замацавацца ў першай шасцёрцы лідараў банкаўска-фінансавай сістэмы краіны.

Закранаючы пытанне аб супрацоўніцтве нашых краін у будучым, у прыватнасці, па пастаўках газу ў Беларусь, расійскі бок не выключыў магчымасці пераходу ў разліках за блакітнае паліва з долара на расійскі рубель. Прычым, зазначыў Андрэй Круглоў, гэта датычыцца ўзаемаадносінаў не толькі з нашай рэспублікай, але і з іншымі краінамі постсавецкай прасторы таксама. «Гэтае пытанне аналізавалася, — паведаміў ён. — Аднак пакуль гатовага рашэння няма і не вызначаны тэрміны, калі гэта можа быць рэалізавана». Тым не менш, намеснік старшыні праўлення расійскага «Газпрама» падкрэсліў, што гэта тэма — цікавая для пастаўшчыка, і ў перспектыве можа быць рэалізаваны пілотны праект у гэтай галіне.

Што ж датычыцца кошту газу для Беларусі ў другім квартале, то ў гэтым пытанні пакуль ні расійскі, ні беларускі бакі ніякіх канкрэтных лічбаў не агучылі. Паводле слоў генеральнага дырэктара Белтрансгаза Уладзіміра Маёрава, перамоўны працэс праходзіць у нармальным рэжыме, без напружанасці, а ўсе абавязацельствы па транзіце газу і забеспячэнні патрэб Беларусі будуць, безумоўна, выкананы. Ён таксама ўзгадаў пра тое, што гэтая тэма, сярод астатніх, разглядаецца і на пасяджэнні Саюзнага Саўміна і выказаў упэўненасць, што адпаведныя дамоўленасці будуць дасягнуты. У сваю чаргу Андрэй Круглоў сказаў, што «Газпрам» заўсёды выконвае дасягнутыя дамоўленасці.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Абзац

● **З 1 красавіка па 30 мая ў сувязі з веснавым нерастам у краіне будзе забаронена аматарская лоўля рыбы. Зрэшты, як і ў папярэднія гады, рыбаловы-аматары нават у гэты час змогуць заняцца любімай справай. Праўда, лавіць рыбу можна будзе толькі адной вудай ці спінінгам з адзінарным, двайным ці трайным кручком памерам не больш за № 10 па міжнароднай класіфікацыі, і ў светлы час сутак з берага. На час нерасту, як заўсёды, будзе забаронена выкарыстанне маламерных суднаў, у тым ліку і маторных лодак.**

● Сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Рудаяварскі» Дзятлаўскага раёна асвоіў унікальную для Гродзенскай вобласці вытворчасць трусінага мяса. На гэты час атрымана амаль 700 кг прадукцыі. Амаль 400 кг трусяціны адгружана Аршанскаму мясакамбінату, які вырабляе кансервы для дзіцячага харчавання...

● **Канадзец, які знайшоў у бутэльцы вады мёртвую муху, сцвярджае, што гэты выпадак падарваў яго інтымнае жыццё, пазбавіў бізнэсу і адбіў жаданне мыцца. Мустафа запэўнівае, што пасля названага інцыдэнту ў яго пачалася «дэпрэсія, трывога, адмысловыя формы фобіі і дакучлівыя думкі». У 2005 годзе суд абавязаў кампанію, якая дастаўляла ваду, выплаціць Мустафе 341 тыс. 775 долараў, аднак праз год прысуд быў адменены пасля апеляцыі.**

● Жыхар Аўстраліі скончыў жыццё самагубствам, запраграмаваўшы робата стрэліць яму ў галаву. Цела 81-гадовага Фрэнсіса Тавэя было знойдзена на сцежцы, якая вяла да яго хаты. Паводле паведамленняў прэсы, прычынай эксцэнтрычнага ўчынку пенсіянера сталі паводзіны яго сваякоў, якія патрабавалі, каб ён адправіўся ў дом састарэлых. У запісцы, пакінутай Тавэем, гаворыцца, што ён аблазіў Інтэрнэт у пошуку чарцяжоў, і па іх стварыў складанага робата. У 7 раніцы па мясцовым часе самазабойца ўсталяваў робата на сцежцы дома коштам у 900 тысяч долараў і ўключыў яго. Усе чатыры кулі трапілі мужчыну ў галаву.

● **Супрацоўнікі беларускай міліцыі будуць дастаўляць п'яных грамадзян па месцы жыхарства за плату ў памеры 1 базавай велічыні. Такое наватворанне плануецца ўкараніць у дзейнасць медыцынскіх выцвярэзнікаў Беларусі сёлета, паведаміў начальнік аддзела арганізацыі працы спецыяльных устаноў МУС Беларусі Вадзім Рошчын на рэспубліканскім навучальна-метадычным сходзе кіраўнікоў медвыцвярэзнікаў, які прайшоў учора ў Віцебску. Дарэчы, цяпер кошт паслуг па працверажэнні ў спецустановах МУС вагаецца ад Br61 тыс. да Br105 тыс. у залежнасці ад рэгіёна. Тарыфы ўстанаўліваюцца паводле рашэння мясцовых органаў улады. Асобным грамадзянам ўдаецца пабываць ва ўстанове па 20 разоў за год.**

● 22 сакавіка 2008 года ў Ленінградскім заапарку адбудуцца афіцыйныя провады на пенсію асліцы Монікі, якая 18 гадоў іграла на сцэне Марыінскага тэатра ў спектаклях «Дон Кіхот» і «Ундзіна». Развітацца з артысткай прыедзе танцорка Марыінкі Анастасія Калегава, выканаўца партыі Кітры ў «Дон Кіхоце», якая падорыць Моніцы торт з морквы і яблыкаў. 21-гадовая Моніка, вядомая сваім памяркоўным характарам, будзе забаўляць дзяцей у заапарку. На сцэне Марыінкі Моніку заменіць 10-гадовая асліца.

● **Англійскае немаўля самастойна выклікала «хуткую дапамогу», калі яго маці страціла прытомнасць. Двухгадовы Джошуа Брукс набраў па тэлефоне нумар 999 і паведаміў аператару, што «мама не прачынаецца». Паліцыя за шэсць хвілін паспела вызначыць месца знаходжання Джошуа. Медыкам атрымалася прывесці жанчыну да прытомнасці, пасля чаго яе адправілі ў бальніцу. Як высветлілася пазней, маці Джошуа, трыццацігадовая Ізабела Брукс з Эштона-у-Мэйкерфілдзе ў Вялікабрытаніі, пакутуе на рэдкае сардэчнае захворванне. Таму яна навучыла сваіх дзяцей, Джошуа і яго старэйшую сястру Эмі, выклікаць «хуткую дапамогу» з таго часу, як яны пачалі размаўляць.**

Поўны абзац

● **Кітаянка, пагражаючы разрывам адносінаў, прымусіла свайго жаніха зменшыць грудзі. Сяо Фэн заявіла, што пачуваецца некамфортна побач з Чжан Цзянго, бо яго грудзі больш прыкметныя, чым яе. Чжан пры росце прыкладна 1 метр 70 сантыметраў важыць каля 95 кілаграмаў. Лекары адпампавалі з яго грудзей больш за 200 мілілітраў тлушчу і злучальных тканак.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармацыйных агенцтваў.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАЕ ЭКАНАМІЧНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ БУДЗЕ ПАГЛЫБЛЯЦЦА І Ў ДАЛЕЙШЫМ

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 сакавіка на сустрэчы ў Мінску са старшынёй урада Расіі Віктарам Зубковым.

«Я вельмі рады, што пасля нашых сустрэч заўсёды ёсць пазітыўны рух у рэалізацыі двухбаковых дамоўленасцяў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да госця. Ён дадаў, што ўдзячны прэзідэнту і прэм'ер-міністру Расіі за хуткае і паспяховае развіццё нядаўніх беларуска-расійскіх праектаў, у прыватнасці, па будаўніцтве Алімпійскіх аб'ектаў у Сочы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, «сёння няма ніякіх сур'ёзных перашкод у беларуска-расійскім гандлі». «Думаю, што калі і існуюць нейкія нацягнутасці, то яны цалкам вырашальныя», — дадаў ён.

Гаворачы аб актуальных пытаннях знешняга гандлю Беларусі, прэзідэнт упамянуў аб санкцыях, уведзеных ЗША ў адносінах да краіны. «Пазіцыя ЗША абсалютна надуманая, дзеянні амерыканскіх уладаў у гэтай сітуацыі з'яўляюцца грубым парушэннем міжнародных дагавораў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Тым не менш эканамічная абстаноўка ў Беларусі абсалютна нармальная, наш тавараабарот дынамічна расце, і ён дыверсіфікаваны — гэта значыць, паспяхова развіваюцца гандлёвыя адносіны як з Расіяй, так і з ЕС і іншымі краінамі», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. Тэмп росту ВУП у гэтым годзе ўжо склаў амаль 110 працэнтаў, па выніках года павінен дасягнуць 111 працэнтаў, дадаў ён. Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што беларуская прадукцыя поўнасцю запатрабавана ў Расіі.

У сваю чаргу кіраўнік расійскага ўрада паведаміў, што большая частка пытанняў парадку дня пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, якое адбудзецца сёння ў Мінску, ужо, па сутнасці, вырашана ў ходзе перагавораў віцэ-прэм'ераў Беларусі і Расіі.

«У двухбаковым супрацоўніцтве нашых краін справы ідуць вельмі нядрэнна, агульная сітуацыя эканамічных адносінаў пазітыўная», — адзначыў Віктар Зубкоў. «Мы зможам і ў далейшым рушыць наперад па многіх пазіцыях», — дадаў расійскі прэм'ер. Тавараабарот паміж Беларуссю і Расіяй у 2007 годзе вырас прыкладна на 30 працэнтаў і перасягнуў $26 млрд.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

МАЛЫМ ГАРАДАМ — ВЯЛІКУЮ ПАДТРЫМКУ

У Паставах праходзіў рэспубліканскі семінар кіраўнікоў дзяржаўных СМІ па пытаннях інфармацыйнага забеспячэння хода рэалізацыі Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў на 2007—2010 гады. Адкрыў семінар міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч.

У Беларусі прадугледжваецца паступова адмяніць абмежаванні на абарачэнне акцый адкрытых акцыянерных таварыстваў, паведаміў намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур на рэспубліканскім семінары кіраўнікоў дзяржаўных СМІ.

Гэта мера закладзена ў праект дэкрэта аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у дэкрэт ад 20 сакавіка 1998 года № 32.

Прадугледжваецца прыватызацыя дзяржаўнай уласнасці на падставе адпаведных перспектыўных планаў, зацверджаных Саветам Міністраў. Плануецца продаж акцый на конкурсах і аўкцыёнах, будуць выключаны нормы, якія прадастаўляюць дзяржаве пераважныя права набыцця акцый камерцыйных арганізацый, створаных на аснове раздзяржаўлення і прыватызацыі. Гэтым арганізацыям будзе аказана дзяржпадтрымка.

Распрацаваны таксама праект указа аб парадку распараджэння дзяржмаёмасцю. Ён накіраваны на актывізацыю далучэння да гаспадарчага абароту невыкарыстоўваемай дзяржаўнай нерухомай маёмасці. Такіх аб'ектаў у краіне больш за 18 тыс. Праект прадугледжвае дэлегаванне частки паўнамоцтваў па распараджэнню маёмасцю ад Прэзідэнта ўраду, ад урада — рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, іншым дзяржаўным арганізацыям, падпарадкаваным ураду.

Падрыхтаваны праект дэкрэта аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у дэкрэт ад 23 снежня 1998 года № 43 па пытанню падаткаабкладання ў асобных сферах дзейнасці. Праект прадугледжвае стварэнне спрыяльных эканамічных умоў для развіцця рынку каштоўных папер.

«Стварэнне фондавага рынку стымулюе як экспартную дзейнасць, так і інвестыцыйную з пункту гледжання імпарту, — сказаў Андрэй Тур. — Фондавы рынак — адзін з важнейшых механізмаў антыінфляцыйнай дзейнасці, ён заўсёды стрымлівае інфляцыю. На дзве трэція фінансавы рынак развітых краін складаецца з каштоўных папер. Калі хто-небудзь мае ілюзію, што сусветны фондавы рынак нас не закране, таму што ў краіне рынак каштоўных папер не развіты, — то гэта не так. Ён закране нас праз крызісныя, інфляцыйныя працэсы ў краінах, з якімі ў нас наладжана асабліва прадукцыйнае супрацоўніцтва, — Расію і краіны Еўрасаюза».

Праект указа Прэзідэнта аб некаторых мерах па рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, што фінансуюцца за кошт знешніх дзяржаўных пазык (крэдытаў) падрыхтаваны ў мэтах актывізацыі работы арганізацый па прыцягненню замежных рэсурсаў у выглядзе крэдытаў і пазык пад гарантыі ўрада.

У малых гарадах Беларусі ў гэтым годзе плануецца стварыць 21,9 тыс. рабочых месцаў, паведаміў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётр Грушнік на рэспубліканскім семінары.

Да канца 2010 года будзе прадоўжана паэтапная работа па стабілізацыі сітуацыі ў найбольш складаных малых гарадах: Ганцавічы, Мікашэвічы, Іванава, Паставы, Новалукомль, Васілевічы, Краснаполле, у пасёлках гарадскога тыпу Акцябрскі і Урэчча.

У 2007 годзе ў малых гарадах створана 28,7 тыс. рабочых месцаў, што склала 136,2 працэнта да задання. У малых гарадах пачалася рэалізацыя амаль 1 тыс. інвестыцыйных праектаў, на гэтыя мэты выкарыстана звыш Br5,5 трлн. Праводзімая палітыка па стварэнню рабочых месцаў знізіла напружанасць на рынку працы ў такіх гарадскіх паселішчах, як Арэхаўск, Добруш, Жыткавічы, Масты, Скідзель, Плешчаніцы, Глуша, Гluск, Дзяржынск і Копысь.

БЕЛТА.

ВЯРБОЎШЧЫКА ЎЗЯЛІ НА ВАКЗАЛЕ

На чыгуначным вакзале «Мінск-Пасажырскі» праваахоўнікі затрымалі 40-гадовага гандляра «жывым таварам» з Расіі, які спрабаваў вывезці ў Маскву трох беларускіх дзяўчат. Грамадзянін суседняй краіны «спакусіў» 25-гадовую жыхарку Уздзенскага раёна і двух 22-гадовых дзяўчат з Лагойскага раёна і Мінска на працу ў расійскай сталіцы, дзе ім было б прапанавана займацца прастытуцыяй. Непрацуючыя беларускі не трапілі ў сэксуальнае рабства толькі дзякуючы своечасоваму ўмяшанню супрацоўнікаў аддзела па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

Украіна зацікаўлена ў еўрапейскім шляху Беларусі

Пра гэта заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Украіны ў Беларусі Ігар Ліхавы на прэс-канферэнцыі ў Мінску, прысвечанай гандлёва-эканамічнаму і сацыяльна-культурнаму супрацоўніцтву Украіны і Беларусі.

Украіна гатова падтрымаць ўваходжанне Беларусі ў Савет Еўропы, садзейнічаць развіццю яе адносінаў з ЕС. «Я асабліва ганаруся тым, што ўкраінцы пры любых зменах урада казалі пра бесперспектыўнасць ізаляцыі свайго паўночнага суседа, — падкрэсліў пасол. — Думаю, што далучэнне Украіны да Сусветнай гандлёвай арганізацыі таксама стане пэўным стымулам для Беларусі ў жаданні супрацоўнічаць з гэтай арганізацыяй і дазволіць атрымаць пэўную дапамогу».

Гэта не можа адмоўна паўплываць на гандлёва-эканамічныя адносіны Украіны і Беларусі, упэўнены Дзмітрый Ліхавы, бо яны развіваюцца надзвычай дынамічна: кожны год больш за 20 працэнтаў прыросту таваразвароту. Летась узровень таваразвароту паміж краінамі дасягнуў 3 млрд долараў ЗША. «У нас вельмі збалансаваныя гандлёва-эканамічныя адносіны, дзе экспарт і імпарт знаходзяцца ў парытэтных умовах, — заўважыў пасол. — Для Беларусі гэта важна яшчэ і таму, што Украіна — на трэцім месцы сярод яе сусветных партнёраў пасля Расіі і Германіі».

Што тычыцца імкнення Украіны да ўступлення ў НАТА, Дзмітрый Ліхавы заявіў: «Уступленне ў НАТА не мае на ўвазе размяшчэнне ваенных баз на тэрыторыі Украіны».

На прэс-канферэнцыі Дзмітрый Ліхавы таксама заявіў, што Украіна гатова ўдзельнічаць у будаўніцтве атамнай электрастанцыі на тэрыторыі Беларусі. «Мы маем багаты вопыт, у нас працуе 15 энергаблокаў і 5 атамных электрастанцый, — сказаў ён. — Той жа Чарнобыль — хоць і страшны, але ўрок, які мы добра засвоілі. Да таго ж, супрацоўніцтва Беларусі і Украіны ў галіне энергетыкі з'яўляецца прыярытэтным».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

«Я ЎСІМ РАІЛА І РАЮ: ВЫПІСВАЙЦЕ, ЧЫТАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ».

Гуляйце. І некалі — абавязкова выйграеце!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На жаль, у прызначаны час у актавай зале гаспадаркі мы іх не ўбачылі, — убачылі іншых. Што, мо цікава: у першым радзе — уладальніцу галоўнага звяздоўскага прыза халадзільніка «Атлант» Яўгенію Валяр'янаўну Шмыгіну, ледзь не ў самым апошнім — сям'ю навагрудцаў Радзюкоў, што выйгралі «Віцязь». Ён красаваўся тут жа, на сцэне, а вось «Атланта» — не было. На пачатку сустрэчы мы так і сказалі, што прыз гэты — у Мінску пакінулі, горш за тое — ужо аддалі... Іншым людзям... А Яўгеніі Валяр'янаўне толькі картачку на памяць прывезлі.

Зала, пачуўшы такое, крыху насцярожылася, але ж потым убачыла, як засвяціўся радасцю твар зямлячкі! На той картачцы малодшая дачушка была, яе муж...

Яны і насамрэч у Мінску жывуць, дваіх малых гадуюць, кватэру будаваць узяліся... Як гэта лёгка цяпер, бацькі цудоўна ведаюць. Таму на сямейным савеце і вырашылі, што звяздоўскі падарунак, хоць ён і вельмі дарагі, трэба аддаць забудоўшчыкам, а самім — і стары халадзільнік паслужыць...

Пра жаданне гэта Яўгенія Валяр'янаўна спачатку сказала нам па тэлефоне, потым — даслала афіцыйны дакумент. Так што з нашага боку ніякай крамолы не было. Хутчэй, наадварот — зрабілі так, як хацела падпісчыца. Да таго ж — з трыццацігадовым стажам.

— У газеце ўсё падабаецца, — гаварыла Яўгенія

Святы дух

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Вёска Будзёнаўка пачынаецца адразу за Ашмянамі, калі кіраваць па адной з дарог у бок літоўскай мяжы. Звярнуўшы на першым вясковым скрыжаванні, трапляеш у куточак, у якім і дагэтуль захоўваецца дух колішняга Святога Духа — панскі асабняк, лямус, прыгожая сажалка. «Каля дома быў басейн з залатымі рыбкамі, шмат кветак, вялікая пасека і нават вяліся паўліны», — паведамляецца ў краязнаўча-гістарычным нарысе, які мне паказалі ў вясковай бібліятэцы. Мясцовы краязнаўца Валянціна Цішчанка, намаганнямі якой сабраны экспанаты і створаны вясковы музей, расказала невялікую легенду-быль пра паходжанне вёскі.

«У 1432 годзе ішла барацьба за кіраванне Ашмянамі паміж князямі Свідрыгайлам і Сігізмундам. Калі польскі кароль Ягайла сваім загадам аб'явіў Сігізмунда першакнязем на землях Вялікага княства Літоўскага, папярэдняму князю Свідрыгайлу давялося ратавацца і ўцякаць. Войскі Сігізмунда напалі на Ашмяны і захапілі княскі двор. Адзін з воінаў Свідрыгайлы знайшоў сховішча ў касцёле Святога Духа непадалёк ад павятовага горада. І калі бяда мінула, ваяр усклікнуў: цяпер гэтае месца і касцёл будуць называцца Святым Духам, бо выратаваў мяне не інакш як сам Святы Дух». А яшчэ ёсць паданне, што касцёл той нібыта праваліўся пад зямлю. Але ніхто са старэйшых жыхароў сёння не прыгадае ні самога касцёла, ні дакладнага месца, дзе ён стаяў.

Было б нават дзіўна, каб вёска з самай рэлігійнай назвай не была перайменаваная. У ліпені 1949 года, з утварэннем калгаса імя Будзённага, быў перайменаваны і населены пункт. І цяпер большасць вясковых жыхароў называюць сябе будзёнаўцамі. І толькі старэйшыя, адданыя веры і касцёлу, па звычцы кажуць, што жывуць у Святым Духу.

На здымках: *на галоўным уездзе ў Будзёнаўку намаганнямі базавага прадпрыемства «Аграпрамтэхніка» створаны сакральны куточак у гонар мінулага, сучаснага і вечнага вёскі і яе жыхароў; стваральніца, захавальніца і экскурсавод музея гісторыі вёскі Валянціна ЦІШЧАНКА; асабняк пана Стругача, у якім цяпер жывуць некалькі сем'яў — гэта толькі рэшткі заможнасці і бляску колішняга Святога Духа.*

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Неспартыўныя паводзіны

Тэндарныя «гульні ў адны вароты» давялі да кратаў дваіх спартыўных функцыянераў.

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю Генеральнай пракуратуры, былы першы намеснік дырэктара Навукова даследчага інстытута фізічнай культуры і спорту і начальнік аддзела памянёнай дзяржаўнай установы, з'яўляючыся кіраўнікамі тэндарнай камісіі, аказвалі садзейнічанне «сваім людзям» з камерцыйных структур. У прыватнасці, функцыянеры дапамагалі бізнэсменам заключаць выгадныя дамовы на пастаўку спартыўнага і медыцынскага абсталявання. А каб замаскіраваць сваю «гульню ў адны вароты», чыноўнікі накіравалі на адрас Рэспубліканскага цэнтра спартыўнай медыцыны і Міністэрства спорту і турызму не менш як 35 фіктыўных пратаколаў пасяджэнняў тэндарнай камісіі. Такім чынам, паводле інфармацыі генпракуратуры, рэальны кошт медыцынскага і спартыўнага абсталявання быў завышаны амаль на 113 мільёнаў рублёў. Нядаўна адбыўся суд над нядобрасумленнымі спартыўнымі функцыянерамі. Абодва былі прызнаны вінаватымі ў злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі і атрымалі па 4 гады пазбаўлення волі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Вялікая Расія, а злачынцам і даўжнікам там схавацца не ўдаецца...

Днямі на тэрыторыі Беларусі, РФ і іншых краін СНД адначасова быў праведзены цэлы комплекс міждзяржаўных аператыўна-прафілактычных мерапрыемстваў «Вышук».

Як паведаміў «Звяздзе» часова выконваючы абавязкі начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Алег Слепчанка, беларускія міліцыянеры сумесна з калегамі з блізкага замежжа актывізавалі працу па вышуку зніклых без вестак, а таксама ўцекачоў ад суда і следства. У прыватнасці, на тэрыторыі Беларусі падчас цяперашняй татальнай «аблавы» на злачынцаў былі затрыманы больш за 26 ламыснікаў і 9 асобаў, якія лічыліся зніклымі без вестак.

На тэрыторыі РФ, а дакладней у Маскоўкай і Ленінградскай абласцях, вялі пошук злачынцаў супрацоўнікі цэнтральнага апарату МУС Беларусі і рэгіянальных упраўленняў. Сумеснымі намаганнямі з расійскімі калегамі нашым міліцыянерам затрымана 10 парушальнікаў закона, 13 зніклых без вестак і 9 даўжнікоў, якія вышуквaліся беларускімі праваахоўнікамі.

Увогуле, у выніку правядзення спецмерапрыемстваў «Вышук» было затрымана больш за 320 злачынцаў, установлена месцазнаходжанне 170 зніклых без вестак і больш за 430 даўжнікоў, ідэнтыфікавана 14 неапазнаных трупаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

«Абуваць» летнія шыны яшчэ рана

Дзяржаўтаінспекцыя Беларусі раіць вадзіцелям пакуль што не здымаць са сваіх аўтамабіляў зімовыя шыны.

Як патлумачыў старшы інспектар упраўлення ДАІ МУС краіны Фёдар Гуліцкі, ранняя вясна ўвяла ў зман многіх кіроўцаў. І яны паспяшаліся перайсці на «лёгкі аўтаабутак». Аднак у апошнія дні істотна пахаладала, нярэдка выпадае снег. На беларускіх дарогах, звычайна ноччу і раніцай, утвараецца галалёд. Для паспешлівых вадзіцеляў транспартных сродкаў ён можа паднесці непрыемныя сюрпрызы. Рызыка трапіць у аварыю для іх істотна ўзрасла. Зразумела, што пераканаць гэтых кіроўцаў зноў «абуць» сваіх «жалезных коней» у зімовыя шыны, даволі цяжка. А вось тым вадзіцелям, якія яшчэ не паспелі «пераабуцца», спяшацца не трэба. Паводле слоў Фёдара Гуліцкага, адмовіцца ад зімовых шынаў можна будзе толькі пасля таго, як сярэднясутачная плюсавая тэмпература паветра ў нашай краіне ўсталюецца на рысцы не ніжэйшай за 8 градусаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Банкаўскія справы

Вынікі — рэкордныя

Леташнія вынікі дзейнасці «Пріорбанк» ААТ сталі рэкорднымі за апошнія гады. Так, яго сукупныя актывы выраслі на 80 працэнтаў, а прыцягнутыя сродкі кліентаў перасягнулі ўзровень у 1 690 мільярдаў рублёў. Банк застаецца адным з найбольш прыбытковых фінансавых інстытутаў краіны. У гэтым яшчэ раз пераканаліся яго акцыянеры на чарговым Агульным сходзе, што адбыўся на мінулым тыдні. Справаздача праўлення ўстановы аб рабоце за 2007-ы год , і планы наконт накірункаў дзейнасці ў гэтым годзе па-добраму ўразілі.

Так, мінулы год прынёс банку 73 мільярды рублёў прыбытку, пры гэтым рэнтабельнасць капіталу склала 23 працэнты. Адначасова фінансава-крэдытная ўстанова з'яўляецца лідарам сярод банкаў краіны па прыцягненні крэдытных рэсурсаў з-за мяжы для развіцця беларускай эканомікі. У мінулым годзе 1 437 мільёнаў долараў, якія ўклалі міжнародныя фінансавыя арганізацыі і камерцыйныя кампаніі ў эканоміку нашай краіны, «Пріорбанк» выкарыстаў для фінансавання буйных дзяржаўных прадпрыемстваў, арганізацый малога і сярэдняга бізнэсу. Па-ранейшаму банк арыентуецца на актыўную прапанову насельніцтву крэдытаў на пластыкавую картку. Аб'ём «пазычаных» такім шляхам сродкаў за мінулы год вырас прыблізна на 80 працэнтаў. Пры гэтым кліентам прапануецца ўсё больш і больш паслуг і магчымасцяў для выгаднага размяшчэння грошай. Бадай, «Пріорбанк» як ніякі іншы пастаянна ўкараняе новыя, самыя сучасныя банкаўскія паслугі і тэхналогіі абслугоўвання кліентаў. Прапанова па карысных і зручных для людзей аперацыях расце з кожным месяцам. А з пачатку 2008 года банк пачаў яшчэ і выдаваць крэдыты на набыццё жылых дамоў пад залог самой нерухомасці. І гэта з'яўляецца яшчэ адным крокам наперад. Адначасова ўстанова займае вядучую пазіцыю ў краіне і па крэдытаванні індывідуальных прадпрымальнікаў.

Акрамя таго, дзейнасць банка ідзе поруч з новымі распрацоўкамі ў галіне інфармацыйных тэхналогій. У прыватнасці, не так даўно ён пачаў прапаноўваць паслугу Інтэрнэт-банка для юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, дзякуючы якой у рэжыме рэальнага часу кліенты могуць аператыўна атрымліваць інфармацыю аб стане сваіх рахункаў і аб курсах у гандлёвай пляцоўцы сусветнага валютнага рынку Форэкс. Для шматлікіх арганізацый, якія сваю дзейнасць звязваюць з валютнымі аперацыямі, Інтэрнэт-банк з'яўляецца сапраўднай знаходкай. Як запланаваў «Пріорбанк», у будучым яго паслуга будзе «абсталявана» ўсімі функцыямі электронных плацяжоў. Гэта дазволіць кампаніям без асаблівых цяжкасцяў перайсці на кіраванне сваімі рахункамі праз сусветнае павуцінне. Спецыялісты прагназуюць, што праз некалькі гадоў сістэма Інтэрнэт-банка будзе здольная стаць дастойным канкурэнтам усім сённяшнім электронным спосабам кіравання матэрыяльнымі сродкамі і рахункамі. Таму работа па ўдасканаленні гэтага накірунку банкаўскіх паслуг працягваецца.

Дарэчы, без удзелу фінансавай установы ўжо даўно не абыходзіцца ніводная значная падзея ў жыцці краіны, няма розніцы, эканамічнага ці іншага аспекту яна датычыцца. Напрыклад, як банк, які ўваходзіць у аўстрыйскі холдынг «Райффайзен Інтэрнэшнл», «Пріорбанк» атрымаў спонсарскае права на тэлевізійную трансляцыю ў нашай краіне «Еўрабачання-2008».

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Приорбанк
Открытое акционерное общество

RZB Group

«Приорбанк» Открытое акционерное общество
г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-а

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

на 1 января 2008 года

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 1 января 2008	на 1 января 2007
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	99 902.0	76 621.8
3	Средства в Национальном банке	1102	2	129 589.0	121 690.2
4	Ценные бумаги:	1103		178 490.6	100 082.8
	для торговли	11031	3	178 490.6	100 082.8
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	0.0	
	в наличии для продажи	11033	3.2	0.0	0.0
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	859 953.2	92 131.9
6	Кредиты клиентам	1106	5	2 734 362.5	1 828 229.7
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	5 476.3	3 342.2
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	141 479.2	114 251.7
9	Прочие активы	1109	8	44 060.9	39 554.8
10	ИТОГО активы	110		**4 193 313.7**	**2 375 905.1**
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	7 377.3	1 748.6
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	2 010 246.9	672 758.7
14	Средства клиентов	1206	11	1 664 708.6	1 307 651.1
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		27 912.7	8.2
16	Прочие обязательства	1209	12	61 403.2	22 045.5
17	ВСЕГО обязательства	120		3 771 648.7	2 004 212.1
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	102 801.2	102 801.2
20	Эмиссионный доход	1212		0.0	0.0
21	Резервный фонд	1213		79 009.3	41 621.5
22	Накопленная прибыль	1214	14	170 217.7	165 160.4
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	69 636.8	62 109.9
24	Всего капитал	121		421 665.0	371 693.0
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		**4 193 313.7**	**2 375 905.1**
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	2 678 774.5	1 623 683.1
28	Обязательства	1302	17	965 306.0	1 073 607.4

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ

на 1 января 2008 года

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 1 января 2008	на 1 января 2007
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		290 943.1	175 237.5
2	Процентные расходы	2012		181 651.7	85 656.9
3	Чистые процентные доходы	201	18	109 291.4	89 580.6
4	Комиссионные доходы	2021		129 610.0	103 096.4
5	Комиссионные расходы	2022		30 814.2	18 091.7
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	98 795.8	85 004.7
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	34 782.0	27 979.8
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	205.8	264.6
9	Доход в форме дивидендов	205		119.1	227.3
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	3 289.0	-6 809.6
11	Прочие доходы	207	23	28 949.4	5 638.9
12	Операционные расходы	208	24	135 931.1	105 936.5
13	Прочие расходы	209	25	28 169.2	14 273.3
14	Налог на прибыль	210		31 723.0	27 318.0
15	**ПРИБЫЛЬ**	**2**		**73 031.2**	**67 977.7**

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2008 год

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статей капитала / Наименование показателей	Символ	Уставной фонд	Эмиссионный доход	Резервный фонд	Накопленная прибыль	Фонды переоценки статей баланса	Всего капитал
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	**Раздел I. За год предшествующий отчетному**							
2	**Остаток на 1 января 2006 г.**	**3011**	**102 687.2**	**0.0**	**16 621.5**	**152 552.8**	**47 329.4**	**319 190.9**
3	Изменение статей капитала	3012	114.0	0.0	25 000.0	12 607.6	14 780.5	52 502.1
	В том числе:							0.0
3.1.	прибыль (убыток со знаком «минус»)	30121	x	x	x	67 977.7	x	67 977.7
3.2.	направление прибыли на пополнение фондов	30122		x	25 000.0	-25 000.0		0.0
3.3.	операции с учередителями (участниками):	30123		0.0	x	0.0	x	0.0
3.3.1.	внесение в уставной фонд вкладов учредителей (участников)	301231		0.0	x		x	0.0
3.3.2.	выплаты дивидендов акционеров	301232	x	x	x	-26 292.8	x	-26 292.8
3.3.3.	операции с собственными выкупленными акциями	301233	x	x	x	x	x	0.0
3.4.	проведение переоценки статей баланса	30124	x	x	x	x	10 703.2	10 703.2
3.5.	перераспределение между статьями капитала	30125						0.0
3.6.	прочие изменения	30126	114.0			-4 077.3	4 077.3	114.0
4	**Остаток на 1 января 2007 г.**	**3013**	**102 801.2**	**0.0**	**41 621.5**	**165 160.4**	**62 109.9**	**371 693.0**
5	**Раздел II. За отчетный год**							
6	**Остаток на 1 января 2007 г.**	**3011**	**102 801.2**	**0.0**	**41 621.5**	**165 160.4**	**62 109.9**	**371 693.0**
7	Изменение статей капитала	3012	0.0	0.0	37 387.8	5 057.3	7 526.9	49 972.0
	В том числе:							0.0
7.1.	прибыль (убыток со знаком «минус»)	30121	x	x	x	73 031.2	x	73 031.2
7.2.	направление прибыли на пополнение фондов	30122		x	37 387.8	-37 387.8		0.0
7.3.	операции с учередителями (участниками):	30123	0.0	0.0	0.0	-30 586.1	x	-30 586.1
7.3.1.	внесение в уставной фонд вкладов учредителей (участников)	301231		0.0	x		x	0.0
7.3.2.	выплаты дивидендов акционеров	301232	x	x	x	-30 586.1	x	-30 586.1
7.3.3.	операции с собственными выкупленными акциями	301233	x	x	x	x	x	0.0
7.4.	проведение переоценки статей баланса	30124	x	x	x	x	7 526.9	7 526.9
7.5.	перераспределение между статьями капитала	30125						0.0
7.6.	прочие изменения	30126	0.0					0.0
8	**Остаток на 1 января 2008 г.**	**3013**	**102 801.2**	**0.0**	**79 009.3**	**170 217.7**	**69 636.8**	**421 665.0**

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ

за 2007 год

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2008 г.	2007 г.
1	2	3	4	5	6
1	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
2	Полученные процентные доходы	7010		290 943.2	175 237.5
3	Уплаченные процентные расходы	7011		-170 170.0	-82 062.3
4	Полученные комиссионные доходы	7012		129 612.5	103 325.9
5	Уплаченные комиссионные расходы	7013		-28 259.9	-17 984.4
6	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	7014		22 687.2	22 435.0
7	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	7015		205.8	264.6
8	Доход в форме дивидендов	7016		119.1	227.3
9	Прочие полученные доходы	7017		15 980.5	2 290.1
10	Прочие уплаченные расходы	7018		-140 402.2	-106 284.0
11	Уплаченный налог на прибыль	7019		-29 785.8	-25 695.9
12	**Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и обязательствах**	**701**		**90 930.4**	**71 753.8**
13	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	7020		39 101.7	-29 475.3
14	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах	7021		-75 966.0	78 776.1
15	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов и других денежных средств в банках	7022		-64 448.7	40 854.1
16	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам	7023		-817 975.1	-647 749.4
17	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	7025		-207 722.6	69 571.4
18	**Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов**	**702**		**-1 127 010.7**	**-488 023.1**
19	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	7030		5 650.9	-7 004.0
20	Чистый прирост (снижение) кредитов и других средств банков	7032		629 896.7	139 559.7
21	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	7033		301 939.3	467 228.2
22	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком	7034		27 449.7	-668.8
23	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	7035		667 241.0	-208 559.7
24	**Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств**	**703**		**1 632 177.6**	**390 555.4**
25	**Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности**	**70**		**596 097.3**	**-25 713.9**
26	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
27	Приобретение основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов	7110		-32 242.4	-31 737.6
28	Продажа основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов	7111		4 642.9	6 583.8
29	Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	7112		-2 134.1	-774.2
30	Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	7113		0.0	0.0
31	Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения	7114		0.0	0.0
32	Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения	7115		0.0	0.0
33	**Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности**	**71**		**-29 733.6**	**-25 928.0**
34	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
35	Эмиссия акций	7211		0.0	0.0
36	Выкуп собственных акций	7212		0.0	0.0
37	Продажа ранее выкупленных собственных акций	7213		0.0	126.6
38	Выплата дивидендов	7214		-30 473.4	-26 191.4
39	**Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности**	**72**		**-30 473.4**	**-26 064.8**
40	Влияние изменений официального курса на денежные средства и их эквиваленты	73		15 485.2	3 631.8
41	**Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов**	**74**		**551 375.5**	**-77 706.7**
42	**Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода**	**740**	**1**	**X**	**135 343.6**
43	**Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода**	**741**	**1**	**686 719.1**	**X**

ПРИМЕЧАНИЯ:

в миллионах белорусских рублей

	1. **ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ**	2008 г.	2007 г.
74011	Денежные средства в кассе	47 729.5	37 309.2
74012	Денежные средства в обменных пунктах	0.0	0.0
74013	Денежные средства в кассах с режимом работы <продленный день>	0.0	0.0
74014	Денежные средства в банкоматах	34 805.7	29 120.6
74015	Денежные средства в службах инкассации	0.0	0.0
74016	Денежные средства для подготовки авансов	2 998.3	878.5
74017	Денежные средства в пути	14 352.8	9 297.8
74018	Прочие средства платежа		0.0
7401	**Всего денежных средств**	**99 886.3**	**76 606.1**
74021	Корреспондентский счет в Национальном банке для внутриреспубликанских расчетов	45 762.9	1 017.2
74022	Корреспондентский счет в Национальном банке для расчетов в иностранной валюте	2 362.0	0.0
74023	Корреспондентский счет в центральных (национальных) банках иностранных государств	0.0	0.0
7402	**Всего средств на корреспондентских счетах в Национальном банке и центральных (национальных) банках иностранных государств**	**48 124.9**	**1 017.2**
74031	Прочие счета до востребования в Национальном банке	0.0	0.0
74032	Депозиты до востребования, размещенные в Национальном банке	0.0	0.0
7403	**Всего средств на счетах до востребования в Национальном банке**	**0.0**	**0.0**
74041	Срочные депозиты, размещенные в Национальном банке со сроком погашения до трех месяцев		0.0
7404	**Всего средств на срочных депозитах, размещенных в Национальном банке**	**0.0**	**0.0**
74051	Условные депозиты, размещенные в Национальном банке со сроком погашения до трех месяцев	0.0	0.0
7405	**Всего средств на условных депозитах, размещенных в Национальном банке**	**0.0**	**0.0**
74061	Корреспондентские счета в банках-резидентах	36 270.4	15 018.7
74062	Корреспондентские счета в банках-нерезидентах	502 437.5	42 701.6
7406	**Всего средств на корреспондентских счетах в других банках**	**538 707.9**	**57 720.3**
740	**Всего денежных средств и их эквивалентов**	**686 719.1**	**135 343.6**
	2. **НЕДЕНЕЖНЫЕ ОПЕРАЦИИ**		
7531	Операции замены активов и обязательств банка, включая исполнение требований или обязательств по получению денежных средств, путем передачи активов, отличных от денежных средств	478.0	644.8
753	Всего операций замены активов и обязательств банка	**478.0**	**644.8**

Проверенный годовой отчет соответствует требованиям законодательства Республики Беларусь. Достоверность форм годового отчета подтверждена во всех существенных аспектах.

Директор Аудиторского общества «Аудитэл» ПАПКОВСКИЙ А.И.

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 26 апреля 2007 года.

УНП 100220190

Вяртаем традыцыі

СМАЧНА ЕСЦІ, ПОСНІКІ!

Аднымі з першых распрацавалі спецыяльны асартымент страў для тых, хто трымаецца посту, — рэстараны!..

Шэф кухар рэстарана «James» Арцём ВОСІПЧЫК прапануе смачна пачасціцца.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«У сенях стаяць міскі з жоўтымі салёнымі агуркамі, з уторкнутымі ў іх парасончыкамі кропу і з сечанай капустай, кіслай, шчодра пасыпанай анісам, такая краса. Я хапаю пальцамі — так хрумсціць! І даю сабе слова не скароміцца ўвесь пост. ...Будуць варыць кампот, рабіць бульбяныя катлеты з чарнаслівам і шапталой, гарох, макавы хлеб з прыгожымі завіткамі з цукровага маку, ружовыя абаранкі, «крыжы» на Крыжапаклонным... Марожаныя журавіны з цукрам, заліўныя арэхі, зацукраваны міндаль, гарох мочаны, абаранкі і сайкі, разынкі збановыя, пасціла рабінавая, посны цукар — лімонны, малінавы, з апельсінчыкамі ўнутры, халва... Няўжо і там, куды ўсе выходзяць з гэтага жыцця, будзе такое поснае! І чаму ўсе такія сумныя? Усё ж — іншае, і шмат, так шмат радаснага». Так апісваў Іван Шмялёў Вялікі пост у дарэвалюцыйнай Расіі. У савецкія часы традыцыя пасціцца была перапынена. Сёння яна паступова вяртаецца. Тым, хто ніколі не спрабаваў, гэта, кажуць, цяжка, нязручна, нясмачна... Напэўна, нашы прабабкі здзівіліся б такім разважанням. Можа, ежа была для іх не галоўным, а можа справа ў тым, што раней жанчыны не працавалі, а людзі харчаваліся ў асноўным дома. Сучасны рытм і лад жыцця дыктуюць свае ўмовы. Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала высветліць, наколькі сёння лёгка трымацца духоўнай традыцыі ў той яе частцы, якая датычыцца стала. Для гэтага яна ацаніла поснае меню ў сталовай, бістро, рэстаране і... мужчынскім манастыры.

Падманны пост у сталовай

Па-першае, трэба ведаць, што поснай лічыцца ежа, калі яна не змяшчае ў сабе мяса і малочных прадуктаў. Вялікі пост — самы строгі: нельга ўжываць рыбу і нават раслінны алей. Паслабленне робіцца толькі ў суботу і нядзелю, калі дазваляецца гатаваць з алеем. Паснедаўшы дома салатай з капустай, я адправілася на працу. Прызнацца, я так і не прыдумала, які такі посны бутэрброд можна ўзяць з сабой і цалкам даверылася клопату грамадскага харчавання.

Сталовая № 72 на праспекце Незалежнасці ў Мінску — адзін з бліжэйшых такіх пунктаў ад месца маёй працы. Таму ў абедзенны перапынак я адправілася туды. Але, зірнуўшы ў меню, зразумела, што посныя стравы тут ніхто не вылучыў.

— У вас ёсць што-небудзь поснае? — спытала я жанчыну на раздачы.

— Можаце паспытаць адварную гавядзіну, — насцярожана прапанавала яна.

Тады слова «поснае» мне ў размове з супрацоўнікамі грамадскага харчавання давялося змяніць на выраз «без мяса». Мне быў прапанаваны фасолевы суп, салаты з морквы і грэцкіх арэхаў з часнаком, пюрэ з бульбы і тушаная капуста. Да супу прыкладаліся фрыкадэлькі, але кухарка не адмовіла мне ў просьбе не класці іх у талерку. Аддала я ўсяго нічога — 5 тысяч рублёў з невялічкім хвосцікам. Калі грошы былі ўжо заплачаныя, а талеркі пустыя, я зразумела, што ежа гэта была не посная — салата была з маянэзам, а суп звараны на мясным булёне...

«Бістроўскае» расчараванне

На наступны дзень я не згубіла надзеі знайсці посны абед у горадзе. Акрамя сталовых, шмат працоўнага і студэнцкага народу ў Мінску харчуецца ў бістро: там адносна нядорага, нармальная якасць і дастатковы асартымент. Знаёмая падказала мне «Максі-Біс», маўляў, там шмат ежы без мяса і нават рыбы. У думках я ўжо адмовілася знайсці ежу, прыгатаваную без алею. Папраўдзе, я і сама тады не ўяўляла, як без яго гатаваць. Таму шукала толькі стравы, якія не ўтрымліваюць мяса, рыбу, малочныя прадукты і яйкі. Поснае меню ў бістро, таксама як і ў сталоўцы, выдзелена не было, але... У агульным меню я знайшла наступныя стравы: супчык грыбны, бліны з капустай і грыбамі, з бананам і ківі, з вішняй, рыс з агароднінай, бульба смажаная, капуста тушаная, агародніна смажаная, некалькі відаў салатаў з агародніны. І ўся гэтая смаката — адносна нядорага. Напрыклад, блінчыкі з капустай і грыбамі каштавалі 1740 рублёў, суп — 2440, а рыс з агароднінай —1280 рублёў. Але, навучаная «няпосным» вопытам у сталовай, я, на ўсякі выпадак, вырашыла ўдакладніць... І тут чакала расчараванне! Кухары, на вялікі жаль, патлумачылі, што ў іхнія бліны і дранікі дабаўлены яйкі, а грыбны суп звараны на курыным булёне.

Рэстаранны пост

Падказка прыйшла з самага нечаканага боку. Пачуўшы пра мае прыгоды ў пошуку гарадскога поснага абеду, выхавальніца маёй дачкі прапанавала мне зазірнуць у... рэстаран. І нават падказала, дзе дакладна было тое, што мне патрэбна. Рэстаран «James», да таго ж, аказаўся даволі блізка ад месца працы.

— Раней посныя стравы трэба было шукаць у агульным меню, — патлумачыў мне шэф кухар Арцём Восіпчык. — Але апошнім часам нашы кліенты ўсё часцей сталі пытацца пра іх, і кіраўніцтва прыняло рашэнне распрацаваць асобнае поснае меню.

Для праваслаўных вернікаў рэстаран прапануе шэсць страў падчас Вялікага посту. Салата з агародніны, салата са спаржы і авакада, італьянскі суп-мінестронэ з агародніны, прыпраўленая гародніна на шпажках, рыс з агароднінай і грэцкім арэхам, кус-кус з кедравымі арэхамі, а на дэсерт — фруктовая салата. Шэф кухар добра ведае, што ў Вялікі пост рыба дазволена толькі на Дабравешчанне і Вербніцу, у гэтыя дні афіцыянт абавязкова прапануе чалавеку, які цікавіцца посным меню, сёмгу грыль, фарэль грыль, судак з агароднінай, рататуй і іншыя рыбныя стравы. У рэстаране нам дазволілі пафаталграфаваць поснае меню і нават далі некалькі рэцэптаў. Ежа выглядала надзвычай апетытна і прыгожа, аднак смак яе застаўся мне невядомы, бо цана надта «кусалася»: салата з агародніны — 31 тысяча 540 рублёў, кус-кус — 33 060 рублёў. Можа, такія цэны і не здзіўляюць кліентаў гэтага рэстарана, аднак мне такія абеды не па кішэні. Шэф кухар патлумачыў, што вялікі кошт страў складаюць даволі дарагія і рэдкія кампаненты.

Італьянскі суп-мінестронэ з агародніны

Карані пятрушкі, морквы, цыбулі наразаюць дробнымі кавалачкамі. Салодкі перац (двух колераў) і цукіні наразаюць кубікамі. Часнок дробна пасячы. Сельдэрэй наразаюць мелкімі лустачкамі. На аліўкавым алеі абсмажыць карані, часнок, моркву, затым дадаць сельдэрэй, салодкі перац, цвятную капусту, белае віно, заліць булёнам з агародніны і варыць да размякчэння. Затым дабавіць свежыя цукіні і памідор, давесці да бурлення, дадаць пасту-пені (макарону пёркамі), соль, перац чорны і чабор. Апошні штрых — упрыгожванне пятрушкай.

Асобнае меню для поснікаў ёсць далёка не ва ўсіх рэстаранах. З шасці, у якія я патэлефанавала па абласных цэнтрах, толькі ў гомельскім «Plaza Club» было такое. Цікава, наколькі рэстаран актуальны для тых, хто трымаецца посту?.. Напэўна, такім больш лагічна было б шукаць мацунку ў манастырах.

Чароўны пост манастыра

У Свята-Елісееўскі Лаўрышаўскі мужчынскі манастыр я прыехала з чатырохгадовай дачкой толькі ўвечары. Пасля службы гасцінныя манахі прапанавалі павячэраць. На стале стаялі запечаная бульба, якую манахі ядуць з лупінай — «так вітамінаў больш», салата з капусты і кукурузы, марынаваныя агуркі, кансерваваная стручковая фасоля і каша. Сама я ніколі не гатавала па-сапраўднаму посную кашу, мне заўсёды здавалася, што яна атрымаецца неядомай. Да таго ж мая Сашка кашу не ўпадабае, нават калі яна салодкая і зваранае на малацэ. Але і я, і маё дзіця з'елі манастырскую кашу з дабаўкай — такая яна была смачная. Посны крупяны суп мая малая таксама ўпісала. Потым мы пілі чай з мёдам, і мне з дачкой было так утульна ад чароўна-радаснай атмасферы, якая вітала ў паветры манастыра...

Ужо ў гасцініцы (звычайны сялянскі дом) я вырашыла, што заўтра абавязкова вазьму рэцэпт цуда-кашы. Яна аказалася аўтарскай! Паслушнік Сергій расказаў: у вялікай колькасці падсоленай вады ён варыў цёртую моркву, цыбулю і проса. Калі проса было амаль гатовае, дадаў грэчку, і ў самым канцы варкі — аўсянку.

Наступным днём пасля літургіі благачынны манастыра айцец Яўсевій (Цюхлоў) зноў папрасіў паломнікаў «падзяліць трапезу з браццяй манастыра». У трапезнай быў накрыты стол, які падаваўся святочным — капуста, каша, запечаная бульба, салата з капусты, салата з запечаных буракоў, чарнасліву і часнаку, салёныя грыбы, кансерваваныя агуркі, памідоры. На дэсерт нам прапанавалі апельсіны, грэйпфруты, яблыкі, сухафрукты і кампот. Я ніколі не адчувала сябе такой сытай і адначасова лёгкай...

— Посная ежа вельмі карысная для здароўя чалавека, — упэўнены Сергій. — Аднак для хрысціяніна, які толькі што прыйшоў да веры, і чалавека хворага меру посту трэба абмеркаваць са свяшчэннікам.

Усе шматдзённыя пасты, заўважыў Сергій, прыходзяцца на сезонныя пераходныя перыяды. На яго думку, гэта добрая падрыхтоўка арганізма для ежы новай пары года. Аднак калі акцэнт рабіць на харчаванні — гэта ўжо дыета, а не пост. Устрыманне ў ежы накіраванае не толькі на фізічнае аднаўленне чалавека, але і на духоўнае. Перш за ўсё пост — гэта час пакаяння, шлях перавагі духу над целам, шлях ад граху да дабрачыннасці. Так кажуць у манастырах.

Са здзіўленнем я даведалася, што паслушнік Сергій не мае ніякай кулінарнай адукацыі. На маё пытанне, як жа ў яго атрымліваецца так смачна, ён раскрыў свой галоўны сакрэт: трэба у час прыгатавання ежы быць у добрым, спакойным і малітоўным настроі.

Краіна здароўя

Выпуск № 15 (71)

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

Да канца сакавіка на тэлефоннай «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць дзяжурыць:

24 сакавіка — галоўны спецыяліст аддзела фармацэўтычнай інспекцыі Міністэрства аховы здароўя Алена Леанідаўна АЛЯКСАНДРАВА.

25 сакавіка — галоўны спецыяліст аддзела медэкспертызы і рэабілітацыі Міністэрства аховы здароўя Людміла Захараўна ГОРНАВА.

26 сакавіка — галоўны спецыяліст аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Сяргей Купрыянавіч МАРКІЯНАЎ.

27 сакавіка — начальнік аддзела ліцэнзавання фармацэўтычнай дзейнасці Міністэрства аховы здароўя Вольга Пятроўна ШЫШЭЯ.

28 сакавіка — галоўны псіхіятр Міністэрства аховы здароўя Павел Валянцінавіч РЫНКОЎ.

31 сакавіка — галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Валерый Віктаравіч ГРЫНЬ.

У графіку магчымыя змяненні.

Інфарм-укол

Мастацтва стасункаў

Французскі псіхасацыёлаг Жак Саламэ стварыў уласны арыгінальны метад, які дапамагае засвоіць мастацтва стасункаў. Ён заснаваны на чатырох базавых прынцыпах:

1. Адважыцца выказаць сваю просьбу іншаму чалавеку, без абвінавачанняў, папрокаў, пачуцця віны.

2. Адважыцца аддаваць без шкадавання і самапрынушэння і браць на сябе рызыку ўбачыць, што твой дар будзе прыняты або адвергнуты іншым.

3. Адважыцца прыняць дар іншага чалавека так, каб не лічыць сябе абавязаным яму. Не задавацца пытаннем «навошта ён зрабіў гэта?».

4. Адважыцца адмовіцца што-небудзь рабіць і не перажываць пры гэтым пачуццё віны. І ўзяць на сябе рызыку расказаць аб сваіх пачуццях так, каб не дыскрэдытаваць просьбу іншага.

Добрае пачуццё самакаштоўнасці

Нельга любіць дзіця за тое, што яно прыгожае, разумнае, добра вучыцца ці дапамагае па дому, — трэба любіць яго проста так: за тое, што яно ёсць.

Аднак прымаць дзіця не азначае ніколі на яго не злавацца, кажуць псіхолагі. Можна быць незадаволеным асобнымі дзеяннямі, але не дзіцем у цэлым. Калі чалавек ведае, што яго любяць такім, які ён ёсць, у яго закладваецца правільная самаацэнка або, як кажа амерыканскі псіхатэрапеўт Вірджынія Сацір, добрае пачуццё самакаштоўнасці. Гэта пачуццё абсалютна неабходнае для таго, каб чалавек быў паспяховым у кантактах і жыцці ў цэлым.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Карысная ежа

Салата з морквы, курагі і лімона

4 морквіны, 100 г курагі, 1/2 лімона, 100 г смятаны, зяленіва пятрушкі, соль, цукар.

Моркву надзерці на буйной тарцы, курагу нарэзаць, перамяшаць з морквай, дадаць нарэзаны лімон. Заправіць смятанай, цукрам і соллю. Упрыгожыць скрылькамі лімона і зяленівам пятрушкі.

Салата з грэйпфрутам і міндалем

Грэйпфрут — 2 шт., памідоры — 200 г, вэнджаны сыр — 200 г, ачышчаны міндаль — 50 г. Для соусу: аліўкавы алей — 3 ст. л., зяленіва пятрушкі — 1 ч. л., соль, перац чорны молаты — на смак.

Абабраны грэйпфрут нарэзаць тонкімі кружочкамі, памідоры — таксама кружочкамі, сыр — тонкімі скрылькамі. На блюда вылажыце слаямі грэйпфрут, затым памідоры і сыр, чаргуючы так, каб краямі яны лажыліся адзін на аднаго. Прыгатуйце соус, змяшаўшы і ўзбіўшы алей, зяленіва пятрушкі, соль і перац. Салату пасыпаць молатым міндалем, запраўце соусам і на паўгадзіны пастаўце ў халадзільнік.

Лімон стымулюе выпрацоўку страўнікавага соку, актывізуе абмен рэчываў, умацоўвае крывяносныя сасуды і спыняе кроватачывасць дзяснаў, прымяняецца для прафілактыкі варыкознага расшырэння венаў. Лімонны сок узбуджае апетыт і лепш за любы іншы напой прагняе смагу.

Лімонны морс

1 лімон, 4 шк. вады, 5 ст. л. цукру.

З лімона знімаюць цэдру і дробна яе наразаюць, заліваюць гарачай вадой і кіпяцяць 5 хвілін. Пакідаюць на 3—4 гадзіны. Адвар працэджваюць, дадаюць цукар і даводзяць да кіпення. Уліваюць адціснуты сок і ахалоджваюць.

Мандарын — яшчэ адна вітамінная кладоўка. Ужыванне мандарынаў садзейнічае павышэнню ўстойлівасці арганізма да розных захворванняў, паляпшэнню абменных працэсаў. Пацверджана проціастматычнае дзеянне мандарынаў. Мандарынавы сок рэкамендуецца ўжываць у клімактэрычны перыяд, асабліва пры моцных крывацёках. Адвар з лупіны мандарынаў знімае ўзровень цукру ў крыві.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

СЯМЕЙНЫ «ЛЕКАР»: БЕЗ ТАБЛЕТАК І ЎКОЛАЎ

Пасля рэканструкцыі гродзенскага «Аквацэнтра» тут пабывала больш за мільён жыхароў і гасцей горада

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Навошта? Вось толькі адзін канкрэтны прыклад. Літаральна пасля васьмі заняткаў з вопытным інструктарам мой адзінаццацігадовы сын ужо ўпэўнена трымаўся на вадзе, а неўзабаве праплыў 25 метраў, за што быў узнагароджаны спецыяльным значком. Наступны этап — 50 метраў, прычым той, хто пераадолеў гэту дыстанцыю, таксама атрымлівае значок. А потым можна дасканала авалодаць рознымі стылямі плавання і ў будучым нават трапіць у нацыянальную зборную па прыкладзе неаднаразовай чэмпіёнкі краіны, удзельніцы чэмпіянатаў і Кубкаў свету і Еўропы Іны Капішынай і іншых спартсменаў, для якіх «Аквацэнтр» цяпер — база падрыхтоўкі да Алімпійскіх гульняў у Пекіне.

Зрэшты, зусім не абавязкова прафесійна займацца водными відамі спорту. Уменне плаваць, граматна паводзіць сябе ў воднай прасторы — хіба ж гэта не такая ж абавязковая для кожнага чалавека норма, як правілы дарожнага руху?

Фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Юбілейны» будаваўся за кошт сродкаў, зароблены гродзенцамі на суботніках, і першых наведвальнікаў прыняў чвэрць стагоддзя таму, у сакавіку 1983 года. У яго паслужным спісе — шмат ганаровых грамат, пераходных знамёнаў і нават медаль Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. Аднак здарылася так, што і сам «лекар» сур'ёзна захварэў. Перад мясцовымі ўладамі паўстала пытанне: абмежавацца капітальным рамонтам, старым начыннем у абноўленых сценах альбо правесці карэнную рэканструкцыю, з новымі аздараўленчымі паслугамі на ўзроўні XXI стагоддзя?

Другі варыянт, якому аддалі перавагу, каштаваў больш за шэсць мільярдаў рублёў — на праект, сучаснае тэхналагічнае абсталяванне і будаўніча-мантажныя работы. Дорага, безумоўна. Але гэта меназіта той выпадак, калі інвестыцыі накіраваны ў самае каштоўнае — здароўе нацыі. І ўжо сёння відавочна каласальная аддача: менш чым за тры з паловай гады пасля рэканструкцыі «Аквацэнтра» яго паслугамі скарысталіся больш за мільён жыхароў і гасцей горада над Нёманам. Гэты аздараўленчы комплекс прызнаваўся лепшым інвестыцыйным аб'ектам турыстычнай інфраструктуры ў рэспубліканскіх конкурсах «Пазнай Беларусь», удастоены сертыфіката і хрустальнага знака «Алімпійская якасць паслуг» ад Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Дзяржстандарта нашай краіны.

— Прыходзьце да нас па здароўе, — запрашае чытачоў «Звязды» **дырэктар КУП «Аквацэнтр» Пётр МАКАРАЎ**. — Мы камфортна абслужым да дзвюх тысяч наведвальнікаў у дзень.

І сапраўды, паслугі тут на любы густ: 50-метровы плавальны басейн з чатырма дарожкамі, набор вышак і трамплінаў, аквапарк з воднымі горкамі, каскадамі-гейзерамі, джакузі, гідрамасажнымі струменямі, ручны гідрамасаж, душ Шарко, фінскія саўны з мікрабасейнамі, турэцкія лазні, трэнажорныя залы атлетычнай гімнастыкі і шэйпінгу, салярый... Можна не толькі навучыцца плаваць (колькасць аховтнікаў сярод дзяцей летась у параўнанні з папярэднім годам павялічылася амаль утрая), але і знізіць вагу, прыбадзь гібкасць целу на занятках па акваэробіцы.

Задачы на Год здароўя ў «Аквацэнтры», можна сказаць, грандыёзныя. Ужо падрыхтаваны праект будаўніцтва тэніснага стадыёна — чатыры корты пад дахам і два адкрытыя, з распранальнямі, душавымі, кафэ-барам і аўтастаянкай. Кліенты аздараўленчага комплексу не будуць прывязаны да сеансаў, а атрымаюць магчымасць свабодна распараджацца сваім часам. Аплата за ўсе паслугі (акрамя шырокага спектра ўжо існуючых, з'явіцца і новыя, да прыкладу, цыркулярны душ, кедравая лазня) будзе ажыццяўляцца праз індывідуальны бранзалет.

У практыцы «Аквацэнтра», дарэчы, былі выпадкі, калі сюды прыходзілі навучыцца плаваць дарослыя людзі, у прыватнасці, некаторыя прызыўнікі перад службай у арміі. І цяпер стаіць задача, каб гэта стала сістэмай. Разам з навучальнымі ўстановамі і ваеннымі камісарыятамі комплекс пачынае разгортваць сумесную праграму па падрыхтоўцы дапрызыўной моладзі, якая ўключае ў сябе навучанне плаванню.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

«Малако для старых» карыснае для сэрца

У мінулым годзе на Сусветным кангрэсе кардыёлагаў самым карысным для здароўя сэрца былі прызнаныя чырвонае віно і вінаградны сок. Гэтыя напоі ўтрымліваюць асаблівы склад антыаксідантаўфлаваноідаў, якія «прамываюць» крывяносныя сасуды, тым самым абараняючы іх ад атэрасклерозу.

У чырвоным віне ёсць поліфенолы — складаныя злучэнні, якія валодаюць выражанай біялагічнай актыўнасцю. Як толькі трапляюць у арганізм чалавека, яны пачынаюць блакаваць рэцэптары эндатэліну — бялку, які звужае «крывяныя вытокі» і паскарае развіццё гіпертаніі.

У Бургундыі віно называюць «малаком для старых». У Францыі, Іспаніі, Італіі для традыцыйнай кухні характэрныя даволі каларыйныя стравы, у якіх не самае нізкае ўтрыманне халестэрыну. А ўзровень сардэчна-сасудзістай паталогіі не самы высокі. Прадстаўнікі гэтых нацый значна радзей, чым жыхары Паўночнай Еўропы, пакутуюць ад ішэмічнай хваробы, інфарктаў і высокага ціску. Спецыялісты тлумачаць гэта тым, што французы, італьянцы і іспанцы натуральнае чырвонае віно п'юць амаль штодня.

Спецыялісты лічаць, што норма — келіх віна 2—3 разы на тыдзень. І лепш, калі гэта тры разы на тыдзень па келіху, чым тры келіхі за адзін раз.

Пасля адной порцыі напою крывяносныя сасуды мякка пашыраюцца, дазваляючы зменшыць аб'ём работы сэрца. У тых жа, хто не спыняецца на трох келіхах, адбываецца павышэнне артэрыяльнага ціску.

Але трэба памятаць, што чырвонае віно, гэта не лякарства. Анкалагічныя захворванні і хваробы сэрца яно не вылечыць. У яго сілах — зрабіць толькі ахоўнае дзеянне. Наступствы злоўжывання алкаголем самыя сумныя... Так што ва ўсім трэба ведаць меру.

Жаночае здароўе

ДЗІЦЯ ПА ПЛАНУ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Спецыялісты перакананыя, што сучаснай сям'і не абысціся без планавання. Паняцце планавання сям'і настолькі шырокае і рознабаковае, што аднаго артыкула не хопіць для пераліку ўсіх момантаў. Але найчасцей тут маецца на ўвазе працэс папаўнення канкрэтнай «ячэйкі». І самае распаўсюджанае пытанне, якое напрошваецца ў гэтым сэнсе — ды навошта планаваць нараджэнне дзяцей, калі столькі пакаленняў да нас не рабілі гэтага? Вакол яго і пойдзе размова з кандыдатам медыцынскіх навук, дацэнтам кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Віталем ДУДОЙ.

— Мы з вамі — дзеці незапланаваныя... Бо паняцця планавання сям'і колькі гадоў таму проста не існавала.

— Што ж паўплывала на яго з'яўленне?

— Аспекты, якія мы зараз закранём — гэта вузкая, выключна медыцынская, частка праблемы планавання сям'і. Я буду гаварыць пра такія канкрэтныя рэчы, як падрыхтоўка да зачацця і родаў. У гэтым сэнсе патрэба ў паняцці планавання сям'і абумоўлена значным ростам захворванняў і станаў, якія неспрыяльным чынам уплываюць на працяканне цяжарнасці і родаў, так і на стан здароўя дзіцяці. Пара, якая плануе павялічыць склад сваёй сям'і, павінна абследаваць стан свайго здароўя, і асабліва гэта важна для жанчыны. Ёсць шэраг станаў і захворванняў, пры якіх цяжарнасць можа ўзмацніць цячэнне апошніх, і нават выклікаць гібель жанчыны. Акрамя таго, падчас цяжарнасці ў жанчыны могуць праявіцца захворванні, аб якіх яна не здагадвалася. Ёсць і такія захворванні, пры якіх жанчына не ў стане нармальна вынасіць цяжарнасць і нарадзіць здаровае дзіця. Такім чынам, жанчына павінна наведаць акушэр-гінеколага, каб пераканацца ў рынцыповай магчымасці дзетанараджэння.

— Не так даўно гінекалогі гаварылі аб існаванні групы рэзерву родаў. Гэта практыка яшчэ не адмерла?

— Калісьці такая група была. Цяпер ідзе абмеркаванне магчымасці вярнуцца да гэтай практыкі, і ўключыць у групу рэзерву родаў жанчын ва ўзросце ад 15 да 49 гадоў. Праўда, пакуль не зразумела, якую менавіта работу варта з імі праводзіць. З другога боку, не зусім аб'ектыўным падаецца і ўзроставае абмежаванне. Так, у 15 гадоў не тое што раджаць, але і весці палавое жыццё яшчэ рана. А ў 49 гадоў татальная большасць беларусак не тое што не хоча, але, прабачце, і не можа быць далучана да працэсу дзетанараджэння. Сярэдні ўзрост наступлення менапаўзы ў нашых жанчын — 48—50 гадоў. Нарэшце, хто менавіта будзе займацца вышэйпамянёнай групай пры цяперашнім катастрафічным недахопе лячэбных кадраў? Па Мінску жаночыя кансультацыі ўкамплектаваныя ў лепшым выпадку на 30—50 працэнтаў... Адным словам, пытанне пакуль застаецца адкрытым.

— Вернемся да планавання... Які мінімум абследаванняў тут неабходна прайсці? І пакуль мы будзем гэтым займацца, верагодна, давядзецца прытрымлівацца пэўных мераў засцярогі?

— Кантрацэпцыя — адна са складовых планавання сям'і, фрагмент вялікай праграмы. У гэтым паняцці пэўнымі ведамі павінны валодаць і жанчыны, і мужчыны. Аднак падбор кантрацэптыўнага сродку для кожнай пары павінен выбраць урач. Як такога мінімуму пэўных працэдур, я думаю, не існуе. Але ў першую чаргу ўсіх трывожаць інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам. Вось тут хацелася б дабіцца пераймання вопыту развітых краін. Пакуль у планы тамтэйшай пары, якая жыве ў грамадзянскім шлюбе, не ўваходзіць дзетанараджэнне, яна абавязкова карыстаецца прэзерватывам. Як толькі ўзнікаюць сур'ёзныя планы, партнёры абавязкова абследуюцца на наяўнасць палавых інфекцый.

— Акрамя пералічаных вамі захворванняў, пры якіх адназначна нельга планаваць цяжарнасць без папярэдняга лячэння, існуюць «звычайныя» хваробы — артэрыяльная гіпертэнзія, напрыклад. Яе трэба ўлічваць перад верагодным зачаццем?

— Жанчына павінна ведаць пра ўсе свае захворванні. І гэта сапраўды найбольш важна менавіта для яе, паколькі яна будзе выношваць плод. Нельга забывацца на тое, што, па вялікім рахунку, здаровае дзіця можа нарадзіцца толькі ў здаровай жанчыны. На вялікі жаль, сёння ў нашай краіне 75 працэнтаў выпускніц школ маюць тыя ці іншыя захворванні. Да моманту планавання цяжарнасці колькасць здаровых сярод гэтых дзяўчат яшчэ зменшыцца. Прычым адна справа, калі мае быць, скажам, танзіліт, і зусім іншая — гепатыт, артэрыяльная гіпертэнзія, цукровы дыябет, парокі сэрца... На прывядзенне гэтых станаў у пэўную норму спатрэбіцца нейкі час. Калі ж гэтаму не надаць належнай увагі, то незапланаваную цяжарнасць, магчыма, давядзецца перарваць, каб усё роўна пралячыць захворванне.

— Дапусцім, шлюбная пара як след падрыхтавалася і пачала жыць адкрыта. Як хутка надыдзе цяжарнасць?

— Не пасля кожнага неабароненага палавога акта магчыма цяжарнасць. Звычайна яна наступае на працягу некалькіх месяцаў. Калі ж гэтага не адбываецца прыкладна на працягу года, неабходна звяртацца да ўрача.

— Чаму ў гінекалогіі ўсё роўна застаецца паняцце аптымальнага тэрміну для першых родаў? Хіба сучаснае актыўнае развіццё медыцыны не дазваляе жанчыне раджаць тады, калі яна вырашыла «пытанні выжывання»?

— Аптымальным тэрмінам для першых родаў застаецца ўзрост 20—25 гадоў. Чым большы ўзрост жанчыны, тым больш, як мы гаварылі, у яе самых розных захворванняў. Тым вышэй рызыка з'яўлення генетычных парушэнняў, развіцця гінекалагічнай паталогіі — дабракаснасць пухлін маткі, фібраміём, эндаметрыёзаў, мастапатый... Так, сярод жанчын, якія нарадзілі ва ўзросце 20 гадоў, гэтых праблем значна менш, чым сярод тых, што нарадзілі пасля 30 і тым больш пасля 40 гадоў.

— Своеасаблівае амаладжэнне арганізма пасля родаў — гэта міф?

— Не зусім. Цяжарнасць суправаджаецца каласальнай гарманальнай перабудовай арганізма. Колькасць палавых стэроідаў у гэты час павялічваецца ў дзесяткі і нават сотні разоў. Ёсць і такія гармоны, якія з'яўляюцца толькі падчас цяжарнасці. Мы наогул яшчэ досыць мала ведаем аб тым, што на самай справе існуе ў прыродзе, але для адказу на ваша пытанне дастаткова і высветленых момантаў. Як вядома, жанчыну робяць жанчынай эстрагены, і ўсё самае прывабнае ў ёй — менавіта ад гэтых гармонаў. Падчас цяжарнасці колькасць эстрагенаў павялічваецца ў дзесяткі разоў. Гэта сур'ёзная «падзарадка» для арганізма. Так што жанчына, якая перарвала дзве цяжарнасці, будзе выглядаць горш за тую, што нарадзіла дваіх дзяцей. Іншая справа, безумоўна, калі роды працякалі з ускладненнямі, прывялі да парушэнняў гарманальнага фону, праблемы набору лішняй вагі і іншых...

— Старыя дзевы могуць неяк застрахавацца ад шматлікіх праблем, абумоўленых адсутнасцю дзяцей?

— Тут вельмі важнымі будуць псіхалагічныя асаблівасці жанчыны. Хоць, як правіла, не рэалізаваны інстынкт мацярынства накладвае пэўны адбітак на меркаванні, разважанні і паводзіны жанчыны. Да таго ж факт застаецца фактам: такія гінекалагічныя захворванні, як фібраміёма маткі, мастапатыя і рак малочнай залозы пагражаюць у першую чаргу менавіта гэтым прадстаўніцам слабага полу.

— Каго варта «абвінавачваць» у росце выпадкаў бясплоднасці?

— У нас сёння ад 15 да 20 працэнтаў пар маюць дыягназ бясплоднасці. Глабальных прычын росту бясплоднасці шмат, а ў вузкім сэнсе гаворка ідзе звычайна пра аднаго з партнёраў. Колькі гадоў таму «вялікая роля» тут належала жанчыне, а сёння суадносіны «віны» пакрысе выраўноўваюцца. Дзесьці ў 30—40 працэнтах выпадкаў дзеці не нараджаюцца, што называецца, з-за мужчыны. І таму ніводзін акушэр-гінеколаг не пачне абследаванне жанчыны, у якой няма дзяцей, пакуль не будзе абследаваны партнёр: гэта намнога прасцей — усяго адзін аналіз.

— І ўсё ж такі чаму прырода адмаўляе ў натуральным працягванні роду кожнай шостай пары?

— З аднаго боку, былі і застаюцца некаторыя захворванні, пры якіх жанчына не ў стане зацяжараць. Ёсць захворванні нейраэндакрыннага паходжання, калі груба кажучы, палавыя органы жанчыны функцыянуюць... не як жаночыя. Пры некаторых станах прырода прадухіляе з'яўленне на свет хворых нашчадкаў. Ёсць рэчы, якія мы не можам растлумачыць выключна з матэрыяльнага пункту гледжання. Верагодна, у кожнай жанчыны — свой шлях... Некаторым у вырашэнні гэтай праблемы дапамагаюць спецыяльныя тэхналогіі, апошняй прыступкай якіх з'яўляецца на сёння экстракарпаральнае апладненне. Тэхналогія няпростая і дарагая. Дарэчы, у Вялікабрытаніі, напрыклад, некалькі падобных спроб ажыццяўляюцца бясплатна. У нас пакуль падобнай практыкі не існуе. Проста ёсць камерцыйныя і дзяржаўныя прапановы.

— Наколькі здаровых нашчадкаў раджаюць сучасныя беларускі?

— Колькасць здаровых нованароджаных няўхільна скарачаецца. І гэта абумоўлена ў тым ліку высокай колькасцю выпадкаў невыношвання цяжарнасці — 10—25 працэнтаў ад агульнай колькасці цяжарнасцяў і выхаджвання «заўчасных» дзяцей. У нас, дарэчы, адзін з самых нізкіх сярод многіх краін паказчык перынатальнай смяротнасці, — гэта значыць, ад 22 тыдняў цяжарнасці да першых сямі дзён пасля нараджэння. Але пры гэтым у нас — высокі працэнт глыбока хворых дзяцей, якія атрымліваюць інваліднасць. Тут можна вярнуцца да таго, што жанчына спачатку зацяжарала, а пасля выявілася маса нейкіх інфекцый, якія ўрачы будуць лячыць. А кожная таблетка дастаецца і плоду. Многія прэпараты аказваюць на плод самае неспрыяльнае ўздзеянне. Асабліва у першыя 13 тыдняў, калі закладваюцца ўсе органы і сістэмы.

— А чаму ў здаровых маці нараджаюцца хворыя дзеці?

— Гэта можа быць вынікам усё той жа моднай тэндэнцыі адкладваць цяжарнасць на «пасля». Знешняе асяроддзе для дзіцяці — не толькі навакольнае асяроддзе, у якім пражывае маці, але і ўласна яе арганізм. З цягам часу мы не становімся больш здаровымі. Да таго ж, разам з арганізмам у цэлым старэе і непасрэдна яйцаклетка. Усе яйцаклеткі «нараджаюцца» разам з дзяўчынкай. Зразумела, што ў 20 гадоў яйцаклетка перажыла меншае ўздзеянне шкодных фактараў, чым у 40.

— Гэта важна ў дачыненні толькі да першых родаў?

— Гэта важна для кожнай цяжарнасці. Пасля 35 гадоў у любым выпадку павышаецца верагоднасць праяўлення генетычных парушэнняў. Чым старэйшая жанчына, тым большая верагоднасць праяўлення таго ж сіндрому Даўна. Сярод 20-гадовых дзіця з такім захворваннем народзіць адна з 2000, сярод 40-гадовых — адна з 200.

— Наколькі магчыма ўбачыць парокі і недасканаласці развіцця плода падчас цяжарнасці?

— Усе жанчыны тройчы на працягу цяжарнасці праходзяць ультрагукавое даследаванне. Першае робіцца калі 12 тыдняў і абавязкова ва ўмовах генетычнага цэнтра. Таму што апараты, якія дазваляюць на ранняй стадыі выяўляць парокі, вельмі дарагія і іх няшмат. Ёсць яны ў РНПЦ «Маці і дзіця» і ў кожным абласным цэнтры. Калі парок будзе выяўлены, цяжарнасць давядзецца перарваць да 13 тыдняў. Другое і трэцяе даследаванне робіцца на базе перынатальных цэнтраў. Пры выяўленні парокаў на гэтым этапе гаворка пойдзе аб ст

Васіль ПАЎЛОЎСКІ,
намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання:

«НА ПРАВЯДЗЕННЕ ПАСЯЎНОЙ СПАТРЭБІЦЦА 2,7 ТРЫЛЬЁНА РУБЛЁЎ»

Ранняя вясна паспрыяла пачатку палявых работ: паводле апошняй інфармацыі, ужо засеяна 40 тысяч гектараў. Большая частка гэтых плошчаў прыпадае на Брэсцкую вобласць, дзе адзначалася даволі цёплае надвор'е. Па правілах неабходна, каб глеба прагрэлася да 8—10 градусаў, аднак, лічыць намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Паўлоўскі, нельга ўпусціць спрыяльны момант. Апошнія замаразкі не нанясуць шкоды пасевам, якія яшчэ не паспелі «праклюнуцца».

На правядзенне веснавых палявых работ спатрэбіцца 2,7 трыльёна рублёў. Гэта бюджэтныя грошы, крэдытныя рэсурсы (каля 1 трлн руб.), а таксама ўласныя сродкі гаспадарак. Пэўныя сумы будуць выдзелены і з фонду падтрымкі сельгасвытворцаў. Асноўныя пазіцыі расходаў — набыццё мінеральных угнаенняў, тэхнікі, а таксама гаруча-змазачных матэрыялаў. Створаны мінімальны запас паліва — у сярэднім на 5—7 дзён працы. Як запэўніў Васіль Паўлоўскі, гэты рэзерв ужо ў бліжэйшы час будзе папоўнены за кошт спецыяльнай крэдытнай лініі. На набыццё сельскагаспадарчай тэхнікі сёлета выдзяляецца 1,4 трыльёна рублёў. За гэтыя грошы гаспадаркі атрымаюць 1,5 тысячы трактароў, каля 1 тыс. камбайнаў, шэраг іншых неабходных агрэгатаў.

Як паведаміў Васіль Паўлоўскі, на разглядзе ў Міністэрстве эканомікі знаходзяцца прапановы аб павышэнні закупачных цэнаў на шэраг пазіцый раслінаводчай прадукцыі. Паводле слоў спецыяліста, мяркуецца павялічыць расцэнкі ў 1,5 раза, каб у гаспадарак быў важкі стымул для развіцця адпаведных накірункаў дзейнасці.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Газетны серыял «Жанацікі»

...КУДЫ ГРОШЫ ЗНІКАЮЦЬ?

Грошай ніколі не бывае шмат, і дабрабыт залежыць нават не ад іх колькасці. Галоўнае, напэўна, каб на ўсё хапала. Чамусьці апошні месяц бюджэт жанацікаў пакутаваў ад незапланаваных расходаў. Можа, трэба больш пільна сачыць за сямейнай бухгалтэрыяй, каб дэбет хоць як-небудзь сыходзіўся з крэдытам? А то і да банкруцтва недалёка...

З надыходам вясны, калі не толькі мядзведзі прачынаюцца ад спячкі, але і людзі заварушыліся, справы цякуць неяк па-іншаму. Ніколі не ведаеш, чаго чакаць наступным разам. Вось раніцай — бум-м-мм, шафа на кухні абвалілася, палова посуду — ушчэнт. Удзень жонка паведаміла, што ў маршрутцы з яе кішэні выцягнулі мабільнік. Што называецца, прыплылі. Колькі разоў на дзень ці не з кожнага праса папярэджваюць: «Уважліва сачыце за ўласнымі рэчамі», і ўсе роўна.

Вечарам яшчэ і з клуба кашачага патэлефанавалі. У красавіку сусветная выстава кошак у Пецярбургу будзе праводзіцца, і калі мы хочам выставіць там нашага ката — будзьце ласкавыя, тэрмінова прынясіце грошыкі за транспарт, аплату гасцініцы, паслугі. «Можа, ну яе, гэтую выставу. Наш Марцін і так самы лепшы?» — я спытаў на ўсякі выпадак. У сябе і ў Ганначкі. Але не, трэба ехаць. Якніяк, шанцы ёсць, каб кот атрымаў тытул чэмпіёна свету. І далей можна будзе расслабіцца, бо вышэйшых рэгалій не існуе. Заняцца вырошчваннем архідэй, напрыклад, ці ў секцыю бадмінтону запісацца. Таксама занятак яшчэ той...

Наш сённяшні эксперт — рэдактар штодзённіка «Топ-персона» Юлія МУДРЭЎСКАЯ, стаж яе сямейнага жыцця — пяць гадоў.

Сямейным бюджэтам распараджаецца муж. І не таму, што, згодна са стэрэатыпам, гэтая функцыя заўжды павінна належыць галаве сям'і. Проста ў яго гэта атрымліваецца лепш, чым у мяне. Ніколі не ведаю, колькі і на што мы патрацілі, але заўсёды перакананая: патрацілі правільна. Прыярытэтныя выдаткі — харчаванне, камунальныя плацяжы, выплата крэдыту. Астатняе — па меры неабходнасці. Калі казаць пра маю сям'ю, то мы ніколі не трацім, не падумаўшы. Усе пакупкі заўсёды ўважаныя. Таму незапланаваныя здзяйсняюцца рэдка, і калі сапраўды патрэбныя ў дадзены момант.

У кожнай сям'і па-рознаму. Калі вам абодвум камфортна — значыць, усё робіце правільна. Межы даўно размыліся, сёння цалкам нармальная сітуацыя, калі жанчына зарабляе, а мужчына гаспадарыць дома. Для мяне непрымальнае азначэнне «галава сям'і. Галоўнае — гармонія, а таксама раўнапраўе, як і ў любых партнёрскіх адносінах. І тым больш заробак тут ні пры чым.

Таким чынам, у нас з'яviліся даволі вялікія незапланаваныя. Мабільнік набыць — раз, аплата выставы — два, новы посуд — тры. Падлічылі, і атрымалася амаль дакладная лічба сярэдняй заработнай платы па Мінску. Да ўсяго, трэба за кватэру таксама плаціць, забяспечваць «харчовую бяспеку» сям'і, сёе-тое з адзення купіць. Ну, добра, посуд можна пакуль не набываць, таго, што засталося, хопіць. Але гэта сітуацыю не выратоўвае, усё роўна сямейны бюджэт трашчыць па ўсіх швах.

Ну што ж, давядзецца абмяжоўваць свае жаданні. Паходы ў кавярні, кіно і куды яшчэ там адмяняюцца, роўна як наведванні магазінаў, каб набыць «што-небудзь» — прыгожае, незвычайнае, хоць і не зусім патрэбнае. Гэта і карысна будзе, бо хоць з'явілася магчымасць прасачыць, якія траты ці пакупкі з'яўляюцца неабходнымі, а без якіх можна абысціся. І ўвогуле, вызначыць, на што трацімца больш за ўсё грошай? Таму ўсё, вырашана — сямейны бюджэт трэба планаваць уважліва. Ну, не да апошняга грошыка, не да кожнай дробязі. А то ведаем мы сем'і, у якіх муж клянчыць «пару тысяч» на больярд з сябрамі. Або больш тыповы выпадак, калі ўсялякія жаночыя штучкі тыпу шпількa-бальзам, без якіх прыгажуні ну проста не могуць жыць (гэта мужыкам можа быць слаба зразумела), даводзіцца выбіваць ці не з сямейнымі скандаламі.

Але генеральны план расходаў павінен быць. Ганна і я, напрыклад, вырашылі размяркоўваць грошы спачатку на неабходнае, а потым ужо вызначаць, чаго не хапае для душы і быту. І нейкую суму забіраць на ўласныя расходы, якімі распараджаемся самастойна.

Ва ўсім астатнім, што датычыцца заработнай платы, у нас поўная дэмакратыя. «Банкіра» няма, усе больш-менш вялікія пакупкі ці траты здзяйсняюцца пры ўзаемнай згодзе. Напрыклад, пайшла Ганначка месяца паўтара таму вывучаць... кітайскую мову. Ну як я мог не заступіць яе жаданню? Натуральна, у іерогліфах моц, у кітайцаў праз пяцьдзесят-сто гадоў, кажуць, палова народа нашай планеты ператворыцца. І не стаў я пярэчыць гэтаму прагрэсу народанасельніцтва. Цяпер вось па вечарах з цікавасцю назіраю, як мая жонка малюе закавыкі-палачкі і слухаю яе размову, якую добра разумее наш кот, бо вельмі падобныя гэтыя высокія гукі на мяўканне. Прынамсі, тое, што Марцін адказвае ёй таксама па-свойму, па-кітайску — відавочна. Застаецца толькі мне пайсці вывучаць які-небудзь усходні дыялект, каб разумець іх абодвух.

Мабільнік, дарэчы, набылі ў той жа дзень. Пад вечар я заказаў я праз Інтэрнэт-магазін. Вось першы па эканоміі бюджэту — у электронных крамах тэхніка рэальна больш танная, чым у салонах продажу. Толькі прасачыце, каб кур'ер аддаў вам гарантыйны квіток, на якім былі б усе пячаткі. І лепш заказваць тавар раніцай ці да абеду — больш шанцаў, што яго дастаўляць у гэты ж дзень.

Да наступнай сустрэчы на старонках «Звязды». Не засмучайцеся па дробязях!

Дзмітрый АЛЬФЕР.

ЗНАК ЗВЕРА

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

* * *

— Хто ён, кат Васюра?

— Да вайны, у 1937 годзе, ён скончыў Кіеўскае ваеннае вучылішча сувязі.

— Кадравы афіцэр!..

— Ён здаўся ў палон і потым «адпрацоўваў». Вучыўся ў нямецкай школе прапагандыстаў, добраахвотна паступіў на службу ў 118-ы батальён.

Вось здымкі з судовага працэсу — гэты стары на лаве падсудных... А вось яго погляд — сапраўдны твар ката Хатыні.

А вось выжыўшыя жанчыны са спаленых вёсак... Як ён быў незадаволены, калі сведкі яго выкрывалі на працэсе!..

— Погляд звера...

— Такія вось здымкі засталіся ў мяне на памяць. На працэс быў дапушчаны карэспандэнт БЕЛТА.

— Хоць рабіць фотаздымкі ў зале суда не прынята...

— Мы дазволілі, паколькі працэс быў адкрытым. Праўда, памяшканне было невялікае: сведак пасадзілі на лавачкі — і зала запоўнена. У вялікім памяшканні была б магчымасць прысутнічаць прадстаўнікам грамадскасці, увогуле ўсім, хто пажадае, — але на шырокі працэс не пагадзілася тагачаснае кіраўніцтва рэспублікі. Не ўсе журналісты маглі прысутнічаць у зале... Гэта вызначалі ў ЦК КПБ. Напрыклад, карэспандэнта «Труда» не дапусцілі на працэс.

У 1986 годзе, пасля завяршэння судовага працэсу, карэспандэнт газеты «Известия» Міхаіл Мікалаевіч Шыманскі падрыхтаваў вялікі артыкул аб працэсе. Не толькі як пра судовы разбор, але і пра тыя падзеі, якія не былі галоснымі да гэтага.

У самы апошні момант, калі паласа з хатынскім матэрыялам ужо была зацверджана рэдактарам, артыкул быў зняты з нумара.

— Ён так і не быў апублікаваны?

— Не.

— А па якой прычыне?

— Тагачасны сакратар ЦК кампартыі Украіны Шчарбіцкі сказаў, што гэта парушыць пачуццё дружбы паміж украінскім і беларускім народам.

Гэта глыбокая памылка! Стварацца падобны кантэкст было ідэалагічна няправільна. Таму што судзілі не ўкраінцаў, а здраднікаў Радзімы, фашыстаў. Аднак... такі час у нас быў.

Шырокай грамадскасці Савецкага Саюза, жыхарам многіх рэспублік так нічога і не вядома пра хатынскіх катаў.

— Але ж публікацыі пра судовы працэс былі?

— У беларускай прэсе былі лаканічныя артыкулы.

— Выбачайце, Віктар Васільевіч, у вас, дарэчы, адчуваецца лёгкая ўкраінская гаворка. Адкуль вы родам?

— З Луганскай вобласці. Украінскую мову вывучаў, чытаю свабодна па-ўкраінску. Бацька мой родам з Арлоўскай вобласці, маці — з Кіраграда, свайго заплаканага сына прад'явіла як доказ агрэсіўнасці бабулі. А стычкі яе з дачкой заўсёды пачынаюцца тады, калі безалаберная маці пачынае «выхоўваць» і так запалоханага хлопчыка. «Вось такое жыццё без прыўкрасаў, ад якога жыць зусім не хочацца», — зрабіла заключэнне мая суразмоўца. Адчувалася: на гэтым яна не збіралася спыняць гутарку, яна нібы прасіла сваіх падначаленых. Дарэчы, потым высветлілася, што ён да паўсмерці збіваў і рабочых саўгаса, за гэта яго «разбіралі» на сходах.

Хатынскі кат Васюра: погляд звера.

Паказанні дае сведка Кнап, этапіраваны на судовае пасяджэнне з папраўча-працоўнай калоніі (Комі АССР).

— Ён змог «выправіць» сабе дакументы удзельніка вайны?

— Нармальнаму чалавеку цяжка зразумець логіку здраднікаў — Васюры і іншых:

«Я ўдзельнік вайны, бо ваяваў і на гэтым баку, быў у Чырвонай Арміі... І быў на фронце да канца вайны». Няважна, за што і супраць каго яны ваявалі...

— Як ні парадаксальна, у XXI стагоддзі пра гэта не толькі не сароменюцца гаварыць, а нават гучна заяўляюць некаторыя асобы ў Прыбалтыцы, ва Украіне...

— Яны ж удзельнікі вайны, яны ваявалі! — вось логіка...

...Здраднік Радзімы Казышчанка з Саратаўскай вобласці праходзіў як сведка на працэсе. Прыехаў на судовы працэс — увесь ва ўзнагародах.

— ???

— У Саратаўскай вобласці ён атрымліваў узнагароды ў ваенкамаце — да святаў. Як удзельнік вайны. Але ж ён не ўдакладняў, дзе служыў... У першыя дні вайны ён трапіў у палон, а там перайшоў на бок ворага.

...У немцаў Васюра атрымаў дзве ўзнагароды — так сказаць, «сярэбраную» і «бронзавую», узнагароды дзвюх ступеняў. Гэта адзнака за адданасць фюрэру. За тое, што актыўна насаджаў тут нямецкія парадкі. І гэтыя парадкі ён падтрымліваў і ў сваім батальёне. Ён быў бязлітасна-жорсткі, збіваў

«Што вытваралі нелюдзі!...»

— Хто нап'ецца, хто засне на рабоце... Жорсткасць — вызначальная характарыстыка яго звярынай натуры.

...Васюры, напрыклад, далажылі, што некалькі карнікаў хочуць перайсці да партызанаў, нібыта мелі з імі кантакты. Ён вывеў іх за хлеў і расстраляў — публічна.

Дзэба і Співак — здраднікі, члены 118-га батальёна, у мяне на працэсе былі сведкамі. Расказвалі сітуацыю. У час аднаго з рэйдаў у вёсцы яны адабралі ў людзей самагонку, напіліся. Дык Васюра пісталетам ім зубы павыбіваў. Уся падлога была заліта крывёю. Ён прымусіў іх языком злізваць кроў на падлозе...

— А можа, гэта пэўныя адхіленні ў псіхіцы? Цяжка ўявіць, што чалавек з лёгкасцю ператвараецца ў звера?

— О-о, гэта быў спакойны чалавек. Добры бацька, выдатны сем'янін: былі дапытаны яго дачка, жонка.

— Яны не ведалі пра яго мінулае?

— Жонка Васюры разам з ім вярталася з Германіі. Яны прыдумалі легенду: нібыта быў у палоне, вызвалілі — і ён з жонкай вяртаецца... Напачатку жыў у сваёй роднай вёсцы. Але там стала вядома, што ён у немцаў быў. Пачаліся размовы — і ён з'ехаў адтуль...

Пасля вайны была не дастатковая кантрольная праверка. Васюра прыдумаў добрую легенду. Прызнаўся, што быў у палоне, служыў у немцаў — але не расстрэльваў, не спальваў... У 1952 годзе ваенны трыбунал асудзіў Васюру на 10 гадоў, але ў 1955-м яго вызвалілі па амністыі...

Таццяна ПАДАЛЯК.
Здымкі з асабістага архіва В.В. ГЛАЗКОВА.

(Заканчэнне будзе.)

Запасны аэрадром

Пазваніла жанчына, памаўчала ў трубку, а потым, уздыхнуўшы, пачала: «Чытаю вашы нататкі і ўспрымаю іх амаль як казку... Няўжо ёсць на свеце нейкія шчырыя адносіны, сапраўднае цяпло ў душах, калі жыццё насамрэч такое шэрае, цяжкае і празаічнае, а часам невыноснае?» Далей ішоў доўгі расповед пра гісторыю звычайнай жанчыны, якая нарадзілася і вырасла ў вёсцы. Пасля школы, як і многія аднакласнікі, падалася ў горад. Знайшла работу, маладой выйшла замуж. Не тое што па вялікім каханні, хутчэй за ўсё, таму, што так было прынята, што ўсе сяброўкі нібы спаборнічалі адна перад адной у тым, каб хутчэй атрымаць сямейны статус. Жылі з мужам, здавалася, як усе. Гадавалі дваіх дзяцей, з часам атрымалі трохпакаёвую кватэру. Праўда, галава сям'і з маладосці быў не супраць у чарку зазірнуць, а далей — болей. Старэйшая дачка з дзяцінства хварэла на дыябет. Ёй патрабавалася і харчаванне асаблівае, і лячэнне пастаяннае. Таму і круцілася, як тая вавёрка ў коле, зарабляла за дваіх, забяспечвала сям'ю. Калі ў пачатку 90-х прадпрыемства, на якім працавала наша гераіня, пачало паступова згасаць і ўсе яе таварышы па працы сядзелі на мізэрных зарплатах, пракліналі лёс, перабудову, развал дзяржавы, яна адной з першых у рыгранічным горадзе асцаніла перавагі памежжа. Па два разы на дзень паспявала абярнуцца ў Польшчу і назад спачатку з шырспажывам, потым са спіртам і цыгарэтамі і прывезці сюды хадавы тавар. Тады на падобным бізнэсе нядрэнна можна было зарабіць. Сям'і на жыццё хапала. Дачушку хворую песціла, пылінкі з яе здзімала, усе прызначэнні ўрачоў строга выконвала. І дзяўчына ўпэўнена ішла на папраўку. Не тое што зусім ад дыябету пазбавілася, але арганізм умацаваўся да такой ступені, што жыць стала магчыма паўнацэнным жыццём. Дачка выйшла замуж, нарадзіла дзіця, а вось працаваць не спяшаецца: прывыкла, што за ўсіх працуе маці. Такая яе роля задавальняла і мужа, апошнія дзесятка паўтара гадоў ён таксама не абцяжарваў сябе работай. А асалоду ад жыцця атрымліваў толькі з дапамогай бутэлькі. Прывычнай для суседзяў карцінай стаў яе п'яны гаспадар на лаўцы каля пад'езда або на прыступках лесвіцы.

Гэта на Захадзе прынята мець свайго псіхааналітыка, а ў нашых жанчын размова са старой сяброўкай або праполка градаў — вось і ўся табе рэлаксацыя.

І гэта не ўся яе бяда. Далёка не ўся. З цягам часу ён перастаў задавольвацца ціхай п'янкай, але яго скандалы, ваяўнічыя схільнасці яна навучылася ўціхамірваць, у крайнім выпадку наліць яшчэ сто грамаў, каб зваліўся сном. Сапраўднае гора спазнала жанчына, калі бацькавы манеры стала пераймаць дачка, якая вырасла, цяпер ужо вядома, закончанай эгаісткай. Яны з зяцем нярэдка даюць зразумець, што маці ў гэтай кватэры бывае лішняя, асабліва пасля таго, як прывалачэ з Польшчы чарговы мех прадуктаў. Валянціна Пятроўна па-ранейшаму ездзіць за Буг, хоць з гадамі такі спосаб заробку даецца ўсё цяжэй. А куды цяпер уладкуешся, калі даўно пераваліла за пяцьдзесят? Так і жыве, не раз даводзілася хавацца ад п'янага дэбошу сваіх сямейнікаў у суседзяў. Аднойчы міліцыю выклікала, але вартавыя парадку паверылі дачцэ. Тая вялікая актрыса аказалася, такі слёзны выгляд прыняла, і, самае прыкрае, свайго заплаканага сына прад'явіла як доказ агрэсіўнасці бабулі. А стычкі яе з дачкой заўсёды пачынаюцца тады, калі безалаберная маці пачынае «выхоўваць» і так запалоханага хлопчыка. «Вось такое жыццё без прыўкрасаў, ад якога жыць зусім не хочацца», — зрабіла заключэнне мая суразмоўца. Адчувалася: на гэтым яна не збіралася спыняць гутарку, яна нібы прасіла сваіх падначаленых. Дарэчы, потым высветлілася, што ён да паўсмерці збіваў і рабочых саўгаса, за гэта яго «разбіралі» на сходах.

І гэта не ўся яе бяда. Далёка не ўся. З цягам часу ён перастаў задавольвацца ціхай п'янкай, але яго скандалы, ваяўнічыя схільнасці яна навучылася ўціхамірваць, у крайнім выпадку наліць яшчэ сто грамаў, каб зваліўся сном. Сапраўднае гора спазнала жанчына, калі бацькавы манеры стала пераймаць дачка, якая вырасла, цяпер ужо вядома, закончанай эгаісткай. Яны з зяцем нярэдка даюць зразумець, што маці ў гэтай кватэры бывае лішняя, асабліва пасля таго, як прывалачэ з Польшчы чарговы мех прадуктаў. Валянціна Пятроўна па-ранейшаму ездзіць за Буг, хоць з гадамі такі спосаб заробку даецца ўсё цяжэй. А куды цяпер уладкуешся, калі даўно пераваліла за пяцьдзесят? Так і жыве, не раз даводзілася хавацца ад п'янага дэбошу сваіх сямейнікаў у суседзяў. Аднойчы міліцыю выклікала, але вартавыя парадку паверылі дачцэ. Тая вялікая актрыса аказалася, такі слёзны выгляд прыняла, і, самае прыкрае, свайго заплаканага сына прад'явіла як доказ агрэсіўнасці бабулі. А стычкі яе з дачкой заўсёды пачынаюцца тады, калі безалаберная маці пачынае «выхоўваць» і так запалоханага хлопчыка. «Вось такое жыццё без прыўкрасаў, ад якога жыць зусім не хочацца», — зрабіла заключэнне мая суразмоўца. Адчувалася: на гэтым яна не збіралася спыняць гутарку, яна нібы прасіла сваіх падначаленых. Дарэчы, потым высветлілася, што ён да паўсмерці збіваў і рабочых саўгаса, за гэта яго «разбіралі» на сходах.

Гэта на Захадзе прынята мець свайго псіхааналітыка, а ў нашых жанчын размова са старой сяброўкай або праполка градаў — вось і ўся табе рэлаксацыя. Мужчыны часцей за ўсё ідуць да спецыялістаў, то варта, мусіць, азірацца на нейкія векавыя традыцыі, на прыклады іншых. Памятаеце прымаўку наконт таго, што разумны чалавек не кладзе ўсе яйкі ў адзін кош? А многія менавіта так і робяць. Маюць адзіны сэнс жыцця, у кожнага свой, праўда — сям'я, дзеці, работа. Калі гэты — адзіны — дае трэшчыну, усё і заканчваецца. Ды трэба, выходзіць, клапаціцца пра змест кошыка загадзя, пра той самы запасны аэрадром, які ў крытычнай сітуацыі можа стаць паратункам альбо хоць спосабам перавесці дух сам-насам з сабой.

У коле маіх знаёмых ёсць некалькі адзінокіх жанчын, якія былі першымі на працы, займалі пасады, а потым выйшлі на пенсію. Здавалася б, такая крутая перамена ў іх жыцці магла б абярнуцца крызісам. А тут наадварот, кабеты змаглі знайсці сябе ў нечым іншым. І перш за ўсё таму, што рыхтаваліся да перамен. Ірына Сямёнаўна, былы кіраўнік установы, вышывае, вяжа, пляце карункі. Ніхто і не падазраваў такіх здольнасцяў, а яна стварае сапраўдныя творы мастацтва, дорыць іх сябрам, знаёмым. А Мая Пятроўна змагла стварыць вакол сябе нешта накшталт клуба цікавых людзей. Яна праводзіць суботнія званыя вячэры, на якія збіраюцца нават нашмат маладзейшыя яе сяброўкі. Кожная прыносіць у складчыну нешта сваё, напрыклад, фірменную салату, а гаспадыня гатуе адну асноўную страву. У іх атрымліваюцца не проста дамскія пасядзелкі з абменам кулінарнымі рэцэптамі, але і цікавая размова пра літаратуру, мастацтва, палітыку. Амаль як у салоне Ганны Паўлаўны Шэрар.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Вясновыя світанні

цей уцякаюць ад надзённых праблем з дапамогай рыбалкі, палявання, калектыўных паходаў у лазню, як не бутэлькі. Але ж калі не прывыклі мы звяртацца да спецыялістаў, то варта, мусіць, азірацца на нейкія векавыя традыцыі, на прыклады іншых. Памятаеце прымаўку наконт таго, што разумны чалавек не кладзе ўсе яйкі ў адзін кош? А многія менавіта так і робяць. Маюць адзіны сэнс жыцця, у кожнага свой, праўда — сям'я, дзеці, работа. Калі гэты — адзіны — дае трэшчыну, усё і заканчваецца. Ды трэба, выходзіць, клапаціцца пра змест кошыка загадзя, пра той самы запасны аэрадром, які ў крытычнай сітуацыі можа стаць паратункам альбо хоць спосабам перавесці дух сам-насам з сабой.

Тады паўстае лагічнае пытанне: а колькі разоў можна выконваць ролю шаферaў? Адказ можа быць толькі адзін: перадаць вэлюм (як сімвал хуткага замужжа) нявесты старшай шаферцы можна толькі адзін раз! Тым самым падкрэслівалася ідэя таго, што дзяўчына-шаферка толькі адзін раз за ўсё жыццё павінна быць замужам.

Такім чынам, магія «пачатку», або сакралізацыя першага, выконвала лёсавызначальную ролю (дзяўчына, якая пахрысціла першай дзяўчынку, тым самым аддала-пераадрасавала ёй сваю долю) у жыцці нашых продкаў. Блізка да гэтага патрабавання (забарона хлопцу хрысціць першым хлопчыка, а дзяўчыне — дзяўчынку) стаіць і забарона даваць дзецям імёны бацькоў (толькі праз пакаленне!). Ну а ў выпадку непрадказальных сітуацый існавала цэлая сістэма контрхадоў. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

Аксана КАТОВІЧ,
Янка КРУК.

Кантактны тэлефон у рэдакцыі: 292 21 03.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-4

Гэты класіфікацыйны конкурс працягваем дзесятым заданнем — эцюдам гросмайстра СССР Леаніда Вітошкіна (Гомель):



БЕЛЫЯ: e1, e3, дамка g1 (3). ЧОРНЫЯ: a3, g7, h4 (3). Выйгрыш. Калі ж a3 перастаўіць на b4 і ход чорных, тады дабаўляюцца яшчэ два кампазіцыйныя варыянты.

Па-за конкурсам разгледзьце і наступныя яго задумкі:

№ 1. БЕЛЫЯ: b2, c7, d2, e1, g3 (5). ЧОРНЫЯ: a5, c5, d4, f6, h4, h6 (6). 1. cd8 2. d:g5! 3. e:c3 cb4 4. ba3#.

№ 2. БЕЛЫЯ: a5, b6, c5, e5, g1, h4 (6). ЧОРНЫЯ: b8, e3, e7, g7, h6 (5). 1. gf2 2. ba7 3. a:c7 4. ab8 fe3 5. af4 6. h:d8x.

№ 3. БЕЛЫЯ: a1, a5, b2, d6, e1, e5, f2, f6, h4, h6 (10). ЧОРНЫЯ: a7, b4, b8, c3, c7, d2, d4, e3, g3, h2 (10). Пашукайце перамогу за белых самастойна.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Рубрыка «Шашкі».

ЗАРАДЗІМ МАЗГІ

Каб узмацніць свае мазгавыя сілы, вучоныя раяць часцей разгадваць крыжаванкі, шахматныя, шашачныя задачы. Для гэтай мэты 23 лютага мы аб'явілі і бліц-конкурс-37 з шасці заданняў. Сёння прапануем другое з іх — прабалему Дзмітрыя Камчыцкага (Магілёў):



БЕЛЫЯ: a7, c5, d4, e5, h2 (5). ЧОРНЫЯ: a3, b4, b6, c7, e7, g5, h4 (7). Перавага белых. Тым, хто з ім справіцца, будзе залічана і першае заданне.

Пераможцу чакае сюрпрыз ад нашага шчодрага, бескарыслівага чытача Іосіфа Апалінаравіча БУЯКА (в. Бацяны Воранаўскага раёна).

РАШАЕМ, ЗАРАБЛЯЕМ ПРЭМІЯЛЬНЫЯ

Праверце, калі ласка, рашэнні змешчаных раней пазіцый.

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»- 4: № 4 (Л. Вітошкін). 1. cb6 2. ed4 3. f:h6 4. h:a5 5. ac3 6. ed2x; № 5 (В. Шульга). e5 (d8A) hd6, eg3, a:c7#. A(h4) e5, a5-b6, e5-c3, c3, ab6, c5-b4#; № 6 (У. Бандарык). 1. bc7 2. ab4 3. ed4 4. f:f8 5. c:g5 6. f:a7x.

РАШАЕМ, ВЫЙГРАЁМ, ДАПАЎНЯЕМ: № 2 (Дуеў–Дранюк). 1. ... cb6! 2. c:a7 bc7 3. f:b8 hg5 4. h:f6 h:h2 і 5. ... h:b8#.

ЦІ АДБЫЎСЯ ПЕРАНОС? (даслаў І. Астроўскі): 1. gh8 de3 2. hg1x альбо 2. hg3x. Так што кампазіцыйны перанос ідэі Л. Вітошкіна з вялікай дошкі на маленькую не атрымаўся з-за пабочнага рашэння.

ПА-ЗА КОНКУРСАМ (У. Бандарык): № 1. 1. ed2 2. dc3 3. gf6 4. fg5 5. g:e7 6. h:a7x; № 2. 1. gh4 2. ed2 3. h:d6 4. a:g7 5. h:d8x; № 3. 1. ab6 2. fe3 3. ed6 4. ed4 5. f:h6 h:c:a7x.

ГОСЦЬ З УКРАІНЫ (У. Рычка): A(11) 7, 8, 20, 44, 35, 40, 50#.

Рашылі: К. Козел (в. Ласосна Гродзенскага раёна), Л. Вітошкін і В. Ціханенка (Гомель), А. Перавознікаў (Рагачоў), Аляксандра Камінская і А. Рогач (Вілейка), У. Бандарык, І. Калтовіч і А. Нячаеў (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), В. Жукоўскі (г. Барань Віцебскай вобласці), В. Краўчук і С. Нячаеў (Баранавічы), А. Еўсееў (Бялынічы), В. Белы (Калінкавічы), А. Кіслы (Узда), І. Астроўскі і В. Логвінаў (Мінск), А. Пярхальскі (Глыбокае), М. Трухан (п/а Пагост Першы Салігорскага раёна) і інш. Сярод іх П. Шклудаў з Наваполацка да задання «Ці адбыўся перанос?» прыводзіць свой эцюд (2001г.): белыя: дамкі a1, c7 (2), чорныя: a3, a5, e3, h8 (4). G3 (d2 AB) c3, e5x. A (g7) h8 (d2) c3, e5x. B (b4) e1 (g7 C) h8 (c3) a1x. C (c3, b2) c3x. П. Шклудаў і А. Белы з Наваполацка заўважылі супадзенне задання № 5 (В. Шульга) з задачай В. Шуміліна (1932 г.), якую паўтарыў і Г. Горбач (1978 г.). А У. Сапяжынскі (Рагачоў), А. Агіевіч (Кобрын), В. Гаўрыш (в. Навасёлкі-1 Пастаўскага раёна), І. Працук (Паставы), А. Раманюк, В. Сяўругін і А. Янчук (Камянец), Р. Сідарчук (Брэст), І. Козел (п/а Махнавічы Мазырскага раёна) і В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна) у гэтым заданні звярнулі ўвагу на прыватнае пабочнае рашэнне: 1. fe5 a:d8 2. cg1 (замест 2. hd6#) 3. hg3 4. g:d4 5. a7-b6 6. de5 7. eg3 8. bg1# з лішняй простай a5. Яны зарабілі па 0,5 прэміяльнага ачка і ўзначалілі конкурсную табліцу.

Забытае? Новае? Вечнае!

АБАВЯЗКІ ПЕРШАГА — НЕ ТОЛЬКІ ГОНАР, АЛЕ І АДКАЗНАСЦЬ

Марыя Іванаўна з Чэрвеньскага раёна задае пытанне і адначасова разважае: «Калі я была ў дзеўках, першай пахрысціла дзяўчынку. Ведаю, што гэта не лепшым чынам адбіваецца на жыцці, бо першым трэба было хрысціць хлопчыка. Сёння я замужам, але ці можна гэты негатыўны ўплыў нейкім чынам выправіць?»

Практычна ва ўсіх нашых публікацыях-адказах мы імкнёмся паказаць тое ці іншае правіла народнай культуры шырока, панарамна, рэльефна, ва ўсіх дэталях, якія нам вядомы, каб чытачы ўбачылі яго ў складаных сістэмных сувязях.

Ужо, відаць, даўно наспела неабходнасць падрабязна разгледзець сімволіку сакральных лічбаў у славянскай традыцыйнай культуры. Сярод іх асобнае месца належыць «сімволіцы першага» — як таму, што звязана з пачаткам. Лічылася, што *першае* мае лёсавызначальны характар. Яно практычна заўсёды свяшчэннае — тое, што ўплывае на развіццё падзей у нашым жыцці на адпаведным адрэзку часу, а то і на ўсім жыццёвым шляху чалавека. Узгадайце, якая вялікая ўвага надавалася пачатку сяўбы або жніва, першаму ацёлу каровы, першаму тосту за сталом, першаму вянку пры будаўніцтве хаты, першаму зубу, які з'явіцца ў дзіцяці.

Вельмі паказальным з'яўляецца ініцыятыва «першага» ў кантэксце пахавальнай абраднасці беларусаў. Увогуле галоўная ідэя пахавання — гэта сімвалізацыя **пераходу** чалавека з аднаго свету ў іншы, таму каб не парушыць парадак Пераходу і тым самым не навесці шкоду жывым, асабліва самым блізкім сваякам, трэба было дакладна прытрымлівацца рэгламентацый, прадпісаных традыцыяй, захаваных і перададзеных нам продкамі. У дадзеным аспекце логіка жыццёвых і абрадавых падзей абапіралася на бадай што адзіна магчымае правіла: наступным павінен пайсці самы старэйшы. Зразумела, што ў кожнага з нас свая доля, свой лёс, сваё прызначэнне, якія, хутчэй за ўсё, прадвызначаны Богам. Аднак усе разумелі: пражыў свой век — збірайся ў далёкую дарогу.

Менавіта таму практычна ва ўсіх асноўных абрадавых дзеяннях пахавання бліжэй да памерлага, а затым і да сімвалічных атрыбутаў яго зямной прысутнасці, павінен быў знаходзіцца самы старэйшы член роду або міжродавай вясковай абшчыны. Давайце прасочым за падзеямі, памятаючы абрадавы фразеалагізм «Не лезь паперад бацькі ў пекла». Якраз самы пажылы чалавек (часцей гэта быў мужчына) **першым** пакідаў могілкі («хто першым выходзіць, той першым і вернецца»), першым спыняўся перад парогам хаты, каб памыць рукі (змыць сляды «таго» свету — ад трох жменяў жаўтапёску), першым заходзіў у хату і першым садзіўся за жалобны стол. Напрыканцы «бяседы» ўсё той жа чалавек **першым** уставаў з-за стала — фактычна ў апошні раз падкрэсліваючы або акцэнтуючы ўвагу на логіцы разгортвальных падзей, — тым самым усім прысутным даваў зразумець: наступным да Бога збіраюся я. Няпісанае залатое правіла народнай традыцыі аўтаматычна вылучала гэтага чалавека на пярэдні план на ўвесь цыкл пахавальна-памінальных абрадаў, уключаючы «сараказіны» і «ўгодкі».

У структуры радзіннай абраднасці сімвалізацыя **першага** была бадай што яшчэ больш выразнай і шматграннай. Тут важным было ўсё — але, заўважым, на працягу таго ж года, першага ў зямным жыцці нованароджанага. Выключная ўвага надавалася першаму купанню дзіцяці, першаму кармленню, таму, як першы раз палажыць у калыску, калі і як упершыню выйсці з дзіцем з хаты, першаму зубу, кроку і г.д. Трэба сказаць, што з'яўленне дзіцяці на свет Божы было яшчэ адной падставай для ўмацавання не

Выбіраючы ласунак да кавы ці чаю, беларусы аддаюць перавагу «глыбоцкай згушчонцы». Гэты брэнд з савецкіх часоў добра вядомы не толькі ў нашай рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. І нават у самыя няпростыя для айчыннай эканомікі часы глыбоцкі камбінат не даў падстаў засумнявацца ў якасці сваёй прадукцыі. Апошнім часам звыклыя сінія бляшанкі з настальгіяй усё ахвотней набываюць расіяне, казахі, азербайджанцы, малдаване, кіргізы, таджыкі... Пры сённяшнім багацці выбару нават самыя патрабавальныя спажыўцы аддаюць перавагу праверанай дзесяцігоддзямі якасці. І не дарэмна.

Здавалася б, чым глыбоцкая прадукцыя адрозніваецца ад прадукцыі тых жа расійскіх вытворцаў? Нашы суседзі прапануюць сёння столькі відаў згушчанага малака, што проста вочы разбягаюцца... Тым не менш, адно папулярнае расійскае выданне нядаўна высветліла, што кожная другая бляшанка «згушчонкі», прадстаўленая на расійскім рынку, выраблена паводле не Дзяржаўнага стандарту, а згодна з Тэхнічнымі ўмовамі, якія вытворца распрацоўвае сам, хоць і па ўзгадненні з дзяржаўнымі органамі. Ці ёсць жа паміж двума вышэйпамянёнымі паняццямі розніца? Аказваецца, ёсць. Так, экспертыза паказала, што з 11 відаў найбольш папулярных малочных кансерваў (сярод якіх была і глыбоцкая згушчонка) 9 вырабляліся з адноўленага сухога абястлушчанага малака з дабаўленнем раслінных алеяў ад 80 да 90 працэнтаў. Так, цяпер вытворцам дазваляецца выпускаць прадукцыю па ўласных ТУ, але ці ведаеце вы, што звыклую нашаму воку маляўнічую, ярка аформленую сіне-белую этыкетку можна размяшчаць толькі на кансервах згушчанага малака, выпрацаванага паводле ДАСТу? Гэта значыць, толькі 2 прадпрыемствы з прадстаўленых 11 маюць на гэта права. І адно з іх — Глыбоцкі МКК. На жаль, па кошце немагчыма вызначыць, што менавіта вы набылі — прадукцыю, выраблену згодна з ДАСТам ці ТУ, але падобную інфармацыю лёгка знайсці непасрэдна на этыкетцы. І ў такім выпадку Дзяржстандарт з'явіцца гарантыяй таго, што згушчанае малако не ўтрымлівае, напрыклад, пальмавага алею...

Каб бліжэй пазнаёміць чытача з прадпрыемствам, дзе цякуць самыя якасныя «малочныя рэкі» і раскінуліся самыя смачныя «згушчаныя берагі», карэспандэнты «Звязды» наведаліся ў адзін з найбольш маляўнічых і, што ў нашым выпадку вельмі важна, экалагічна чыстых рэгіёнаў Віцебшчыны.

Генеральны дырэктар ААТ «Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат» Валерый ДУЛІНСКІ:

«НАШ ПРАВАДНІК НА ЗНЕШНІЯ РЫНКІ — ТРАДЫЦЫЙНА ВЫСОКАЯ ЯКАСЦЬ»

Па выніках 2007 года ААТ «Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат» удастоена Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь у галіне якасці

Валерый Браніслававіч ДУЛІНСКІ

ўзначаліў камбінат у чэрвені 2005 года. Прадпрыемства маладому кіраўніку дасталося не ў лепшым стане — толькі бюджэтная запазычанасць перавышала 1,5 млрд рублёў. Ледзь-ледзь удавалася зводзіць канцы з канцамі. Іншы б і рукі апусціў, а Дулінскі толькі «закасаў рукавы». Дзякуючы мэтанакіраванай працы па павышэнні эфектыўнасці вытворчасці, за даволі кароткі тэрмін МКК не толькі разлічыўся з даўгамі, але і выйшаў на неблагую рэнтабельнасць. Распачалася маштабная мадэрнізацыя вытворчасці, павялічылася загрузка і, што самае галоўнае, калектыў паверыў у кіраўніка, паверыў, што ўсе разам яны здольныя на многае.

Слова кіраўніку

— Мінулы год для прадпрыемства склаўся ўдала, — расказвае **Валерый Браніслававіч**. — Мы здолелі зарабіць каля 10,5 млрд прыбытку ад рэалізацыі прадукцыі, з іх 7 млрд — чыстага прыбытку. На прадпрыемстве выкананыя ўсе прагнозныя паказчыкі. Таму нашу работу нездарма высока ацанілі на ўзроўні Савета Міністраў: Глыбоцкі МКК па выніках мінулага года ўдастоены Прэміі Урада.

Мы выдатна разумеем, што вырабіць высакаякасную, канкурэнтаздольную прадукцыю сёння ўжо недастаткова: вельмі важна яе яшчэ і прадаць. Таму на прадпрыемстве пастаянна праводзіцца работа па пашырэнні рынкаў збыту. На гэтым накірунку мы таксама дасягнулі пэўных поспехаў, аднак заспакойвацца недапушчальна. Імкнёмся браць удзел ва ўсемагчымых галіновых выставах як у Беларусі, так і за мяжой, знаходзіць пастаянных кліентаў, заключаць доўгатэрміновыя дагаворы. Усё ж замежныя пастаўкі прыносяць нам асноўны прыбытак.

Каб і надалей развіваць экспартны накірунак, нам трэба атрымаць сертыфікаты на сістэму кіравання якасцю і бяспекай харчовых прадуктаў на аснове прынцыпаў ХАССП, экалогіі і аховы працы. Для выхаду на рынак Еўрасаюза неабходна атрымаць права нанясення СЕ-маркіроўкі. Паводле разлікаў, агульныя затраты на мерапрыемствы, звязаныя з выхадам на замежныя рынкі збыту, павінны акупіцца на працягу 3—4 гадоў.

Натуральна, працягваецца работа па ўдасканаленні якасці прадукцыі, ёсць планы па пераўзбраенні вытворчасці, яе мадэрнізацыі, рэканструкцыі вытворчай базы. У сваіх філіялах, а гэта адзін сельскагаспадарчы кааператыў і Браслаўскі філіял, дзе сёння вырабляем сыры — нам неабходна правесці рэканструкцыю малочнатаварных фермаў, вызначыцца з аб'ектамі незавершанага будаўніцтва, некаторыя будынкі патрабуюць сур'ёзнага рамонту.

— Валерый Браніслававіч, як на гэты момант складваюцца справы з загрузкай камбіната?

— Адразу адзначу, што гэты паказчык у першую чаргу прывязаны да рэалізацыі прадукцыі. Яшчэ два гады таму загрузка магутнасцяў складала толькі 50 працэнтаў. Нам у сцісліяй сіны з тамтэйшымі партнёрамі ў нас складваюцца нядрэнныя. Гэты рэгіён лічым больш цікавым з-за стабільнага попыту. Усё ж такі ў сталіцы публіка пераборлівая. Да таго ж там прадстаўлены практычна ўсе вытворцы падобнай прадукцыі.

— За кошт чаго ўдаецца канкураваць з расійскімі вытворцамі, вытворцамі з іншых краін СНД на замежных рынках?

— У Расіі прадпрыемствы вырабляюць прадукцыю ўсё больш паводле Тэхнічных умоў. Кожнае прадпрыемства распрацоўвае іх самастойна, а гэта прадукцыя ўжо зусім іншай якасці. Яна можа ўтрымліваць алей, вырабляцца з адноўленага малака... ДАСТ, які нанесены на этыкеткі глыбоцкіх малочных кансерваў, гарантуе абсалютную адпаведнасць прадукцыі самым высокім стандартам.

— Кадры вырашаюць калі не ўсё, то вельмі многае...

— Мы гэта выдатна разумеем. У нас працуе многа маладых спецыялістаў, а таксама вялікае звяно вопытных спецыялістаў, некаторыя з якіх стаялі ля вытокаў стварэння прадпрыемства. Такі сплаў, як раней казалі «маладосці і вопыту», і дае станоўчы вынік.

«За два гады на тэхпераўзбраенне накіравана больш за 6 млрд рублёў»

— За апошнія гады прадпрыемству ўдалося выкараскацца з эканамічнай ямы і цвёрда стаць на ногі, — расказвае **намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы Вольга КУЛАКОЎСКАЯ.** — Так, з 2005 года па аб'ёме вытворчасці мы прырастаем практычна па 10 працэнтаў штогод. Загрузка вытворчых магутнасцяў з 52 працэнтаў у 2005 годзе выраслa да 70 працэнтаў па выніках 2007-га. У многім гэта стала магчымым дзякуючы таму, што на працягу трох апошніх гадоў камбінат актыўна стаў займацца тэхнічным пераўзбраеннем. Мы падпалі пад Праграму развіцця мясной і малочнай прамысловасці да 2010 года. У 2006 годзе на прадпрыемстве быў распрацаваны адмысловы бізнэс-план. Дзякуючы праведзеным мерапрыемствам па мадэрнізацыі камбіната, укараненні новага энергазберагальнага абсталявання, эканомія склала каля 3 млрд рублёў. Калі ў 2006 годзе на энергазберажэнні мы выйшлі на мінус 3 працэнты, то летась гэты паказчык павялічыўся да мінус 16,7 працэнта.

Сярод буйных праектаў па энергазберажэнні, рэалізаваных летась, — перавод на прыродны газ кацельняў на асноўнай вытворчасці ў Глыбокім і на браслаўскім філіяле камбіната, мадэрнізацыя паветранай і аміячнай кампрэсарных станцый, замена маральна састарэлага вытворчага абсталявання. Такім чынам, выдаткі на энерганосьбіты пры пастаянным павышэнні іх кошту на прадпрыемстве зніжаюцца. Сёлета работа ў гэтым накірунку працягваецца. Увогуле, за два гады на тэхпераўзбраенне камбінат накіраваў больш за 6 млрд рублёў.

Прыбытковая работа камбіната дазволіла абнавіць і аўтапарк — па лізінгу былі закупленыя новенькія МАЗы, якія цяпер упрыгожвае фірменная эмблема «Глыбоцкі МКК».

— Што можна сказаць пра дынаміку экспарту прадукцыі?

— Летась рост экспарту прадукцыі прадпрыемства склаў 130 працэнтаў. У асноўным гэта адбылося за кошт новых рынкаў збыту. Добра папрацавалі на азербайджанскім, малдаўскім, кіргізскім, таджыкскім накірунках. Аднак найбольш павялічылі пастаўкі ў Казахстан. Там нават адкрылі сваё гандлёвае прадстаўніцтва.

З іншага боку, сам па сабе паказчык экспарту ні аб чым не гаворыць. Куды больш красамоўнае паняцце — знешнегандлёвае сальда. Дык вось, летась мы экспартавалі прадукцыі на 30,3 млн долараў, а імпартавалі — толькі на 4,3 млн долараў.

Поўнасцю адмовіцца ад завозу матэрыялу для выпуску бляшанак мы пакуль не можам, аднак ужо сёння актыўна працуем над заменай гэтага віду расфасоўкі. Так, летась разам з партнёрамі з «ТубаПакінСэрвіс» (г. Мінск) распрацавалі і паспяхова ўкараняем 150-грамовыя тубы для малочных кансерваў. Гэты від упакоўкі вельмі зручны для тых, хто накіроўваецца ў паездкі, камандзіроўкі, на адпачынак. З'явіліся і невялічкія поліэтыленавыя вядзерцы таксама айчыннай вытворчасці. На жаль, адмовіцца ад бляшанак мы не можам — многія аддаленыя рэгіёны, куды пастаўляем сваю прадукцыю, нацэлены толькі на гэты від упакоўкі. У першую чаргу з-за зручнасці транспарціроўкі і падоўжаных тэрмінаў захоўвання. У той жа час мы разглядаем магчымасць набыцця ў будучым для камбіната нашымі партнёрамі з Казахстана лініі накшталт «Тэтра-пак» з наступным яе выкупам.

Начальнік змены кансервавага цэха Ірына ВАСЬКОВІЧ.

З ГІСТОРЫІ ПРАДПРЫЕМСТВА

ААТ «Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат» — найбуйнейшы вытворца малочных прадуктаў у Беларусі, а таксама адзін з найбуйнейшых у СНД. Максімальна камбінат разлічаны на перапрацоўку 1000 тон малака ў суткі. На долю Глыбоцкага МКК прыпадае 50 працэнтаў валютных паступленняў Віцебскага абласнога аб'яднання мяса-малочнай прамысловасці. Сёння на прадпрыемстве працуюць 830 высакакласных спецыялістаў.

ААТ «Глыбоцкі МКК» быў запушчаны ў эксплуатацыю 30 снежня 1971 года. 1 студзеня 1972 года была ўведзеная першая чарга па вытворчасці згушчанага малака з цукрам, натуральнамалочнай прадукцыі і масла сметанковага. 1 ліпеня 1972 года была запушчана другая чарга па вытворчасці згушчанага стэрылізаванага малака без цукру.

Камбінат быў пабудаваны на базе прадпрыемстваў, размешчаных у чатырох адміністрацыйных раёнах Віцебскай вобласці: Глыбоцкім, Міёрскім, Шаркаўшчынскім і Браслаўскім, якія раней выпрацоўвалі масла жывёльнае і сыр тлусты.

29 снежня 1997 года рашэннем Віцебскага аблвыканкама № 628 створана ААТ «Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат».

У 2004 годзе Браслаўскі малочны завод з яго сыравіннай зонай стаў філіялам Глыбоцкага МКК.

Сёння ААТ «Глыбоцкі МКК» уключае ў сябе такія структурныя падраздзяленні, як:

1. Цэнтральны камбінат (кансервавы цэх, маслацэх, натуральнамалочны цэх, бляшаначны цэх, цэх па вытворчасці сухога абястлушчанага малака);

2. Браслаўскі малочны завод.

«Мы не спрачаемся пра густы — мы гарантуем якасць»

Дэвіз Глыбоцкага МКК абраны зусім невыпадкова, бо ў аснове поспеху прадпрыемства — выкарыстанне высакаякасных натуральных кампанентаў, якія адпавядаюць еўрапейскім стандартам, унікальная сістэма кантролю якасці гатовай прадукцыі на ўсіх этапах вытворчага працэсу, — расказвае намеснік генеральнага дырэктара па якасці і сертыфікацыі Лідзія СЕНІЧАВА. — Прадукцыя камбіната неаднаразова ўдастойвалася залатых медалёў на міжнародных выставах, а само прадпрыемства станавілася лаўрэатам прэстыжных конкурсаў як у Беларусі, так і за яе межамі. Па выніках 2007 года ААТ «Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат» удастоена Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь у галіне якасці, а малако сухое натуральнае 25-працэнтнай тлустасці ўвайшло ў лік 100 лепшых тавараў Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі. Прадпрыемствам атрыманы сертыфікат адпаведнасці якасці СТБ ІСО 9001-2001.

Генеральны дырэктар ААТ «Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат» Валерый ДУЛІНСКІ прымае з рук віцэ-прэм'ера Андрэя КАБЯКОВА Прэмію Урада Рэспублікі Беларусь.

Мікрабіёлаг Тамара СЦЯПАНАВА і намеснік генеральнага дырэктара па якасці і сертыфікацыі Лідзія СЕНІЧАВА (справа).

На сённяшнюю перапрацоўку малака на камбінаце ажыццяўляецца на абсталяванні фірмы «Альфа-Лаваль». Для вытворчасці малака згушчанага з цукрам згушчэнне праводзяць на вакуумвыпарных апаратах тыпу «Віганд-8000». Для вытворчасці кансерваў без цукру згушчэнне праводзіцца на плёнкавым вакуумвыпарным апараце «Шэферс-6000».

Нядаўна прадпрыемства набыло дазіруючы агрэгат для разліву і пакавання вадкіх прадуктаў у ламінатныя мяхі ёмістасцю ад 3 да 200 кг. Абсталяванне ізраільскай вытворчасці дазваляе фасаваць у сучасную ўпакоўку да 2 тон прадукцыі ў змену. Такая ўпакоўка рэалізуецца аптовым пакупнікам, у прыватнасці, кандытарскім прадпрыемствам. Закуплены аўтаклаў для вытворчасці варанага згушчанага малака, якое паступае ў гандлёвую сетку ў бляшанках і называецца «Лакомка». Ізраільская ўстаноўка разлічана на выпуск 1,5 тысячы бляшанак у гадзіну. Акрамя таго, Глыбоцкі МКК закупіў імпартны аўтамат фасоўкі згушчанага малака ў пластыкавае пакаванне — тубу ёмістасцю 150 грамаў.

«Сур'ёзна зацікавіліся еўрапейскім рынкам»

— Спецыялісты нашага прадпрыемства актыўна прадстаўляюць прадукцыю камбіната на розных выставах як у Беларусі, так і за яе межамі, — расказвае **маркетолаг Наталля ПЯТРОЎСКАЯ.** — Апошнім часам мы ўзялі ўдзел у такіх значных выставах, як «Петерфуд-2007» (Санкт-Пецярбург), «Прадэкспа-2007» і 15-я міжнародная выстава «Прадэкспа-2008» (Масква). Трэба адзначыць, што наша прадукцыя рэдка застаецца без узнагарод. Так, у Пецярбургу ў намінацыі інавацыйны прадукт залатога медаля была ўдастоена какава са згушчаным малаком і цукрам. У Маскве сярэбраны медаль і дыплом узяло глыбоцкае згушчанае малако з цукрам і цыкорыяй.

Асобна трэба адзначыць удзел камбіната ў выставе прадукцыі лепшых беларускіх прадпрыемстваў, што была наладжана ў Венесуэле ў снежні мінулага года. Мы правялі перамовы з венесуэльскімі партнёрамі, спадзяёмся, што яны прынясуць свой плён.

Кіраўніцтва прадпрыемства даволі ўважліва адсочвае сусветныя тэндэнцыі ў галіне. Апошнім часам нас сур'ёзна зацікавіў еўрапейскі рынак. На гэтым этапе вывучаем патрабаванні, якія там прад'яўляюць да малочнай прадукцыі, знаёмімся з сучасным імпартным абсталяваннем для яе выпуску. Прадпрыемства пастаянна ўдасканальвае сваю вытворчую базу ў тым ліку і за кошт сучасных рэсурсазберагальных ліній.

Не класікай адзінай...

У цяперашні час Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат выпускае больш як 80 найменняў прадукцыі — малочныя кансервы, натуральнамалочную прадукцыю, сметанковае масла, малако сухое натуральнае і абястлушчанае.

Прадпрыемства пастаянна працуе над засваеннем новых відаў прадукцыі. У ліку апошніх навінак — малако канцэнтраванае стэрылізаванае «Янтарнае», вяршкі канцэнтраваныя стэрылізаваныя, малако згушчанае ў тубах ёмістасцю 150 г (гэтая ўпакоўка накшталт цюбікаў зубной пасты, вельмі зручная для турыстаў, дачнікаў). Плануецца асвоіць выпуск натуральнага згушчанага малака з цукрам у асептычных мяшках ёмістасцю 20 кг з клапанам, а таксама сухога натуральнага малака ў дробнай фасоўцы — ад 500 г да 1 кг.

Хуткім часам на прадпрыемстве пачнуць выпускаць серыю натуральнамалочнай прадукцыі з кальцыем. Распрацоўваюцца новыя віды цвёрдых сыроў. Будзе ўдасканалена пакаванне тварожнай прадукцыі. Удзельная вага новых відаў прадукцыі ў агульным аб'ёме вытворчасці складае 14,4 працэнта.

Аператар Алена КАРАНЬКО.

Актуальны рэцэпт ад «Глыбоцкага МКК»

Пасха са згушчаным малаком

ІНГРЭДЫЕНТЫ:

тварог — 600 г
сметанковае масла — 150 г
цукар — 1/4 шклянкі
смятана — 1/2 шклянкі
згушчанае малако — 1/2 бляшанкі
разынкі (без костачак) — 1/2 шклянкі
ванілін — на густ



СПОСАБ ПРЫГАТАВАННЯ:

Тварог працерці праз сіта, дадаць цукар (лепш дробны), масла, ванілін. Усё старанна расцерці, дадаць смятану і згушчанае малако, перабраныя і вымытыя разынкі. Змяшаць. Масу пакласці ў любую ёмістасць пад гнёт і паставіць у халадзільнік.

Таксіколагі Валянціна САЦІНА і Марына СУРНІНА.

Майстар участка Таццяна ТАРАНЕНКА.

Кіраўнік маслацэха Аляксандр АКУЛЕНКА.

Публікацыю падрыхтавалі: Сяргей ПРОТАС, Віктар ПАЗНЯКОЎ, Марыя ЖЫЛІНСКАЯ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).
УНП 300022460

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Минское обувное открытое акционерное общество «Луч»

Адрес: 220004 Республика Беларусь, г. Минск, ул. Короля, 2, АБК каб. 415 Т/ф. 200 49 19/200 11 35
Единица измерения: млн. руб.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2008 года

АКТИВ	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	30177	33321
Нематериальные активы	120	4	3
Доходные вложения в материальные ценности	130		
Вложения во внеоборотные активы	140	318	365
В том числе: незавершенное строительство	141	9	10
Прочие внеоборотные активы	150		
ИТОГО по разделу I	190	30499	33689
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	3189	3828
В том числе:			
сырье, материалы и другие активы	211	632	489
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство и полуфабрикаты	213	1	44
расходы на реализацию	214		
готовая продукция и товары для реализации	215	667	1283
товары отгруженные	216	1519	1585
выполненные этапы по незавершенным работам	217		
расходы будущих периодов	218	370	427
прочие запасы и затраты	219		
Налоги по приобретенным активам	220	91	42
Дебиторская задолженность	230	1238	1207
В том числе:			
покупателей и заказчиков	231	30	30
поставщиков и подрядчиков	232	4	4
разных дебиторов	233	1180	1109
прочая дебиторская задолженность	234	24	64
Расчеты с учредителями	240		
В том числе:			
по вкладам в уставный фонд	241		
Прочие	242		
Денежные средства	250	98	37
В том числе:			
денежные средства на депозитных счетах	251		
Финансовые вложения	260	1706	1699
Прочие оборотные активы	270		
ИТОГО по подразделу II	290	6322	6813
БАЛАНС	300	36821	40502
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	697	34010
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411		
Резервный фонд	420	174	174
В том числе:			
резервы, созданные в соответствии с законодательством	421	174	174
резервы, созданные в соответствии с учредительными документами	422		
Добавочный фонд	430	32958	4394
Прибыль (убыток) отчетного периода	440		
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	1393	623
Целевое финансирование	460		
Доходы будущих периодов	470	18	18
ИТОГО по разделу III	490	**35240**	**39219**
IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510		
Краткосрочные кредиты и займы	520	509	473
Кредиторская задолженность	530	1047	762
В том числе:			
перед поставщиками и подрядчиками	531	290	72
перед покупателями и заказчиками	532	37	32
по оплате труда	533	70	77
по расчетам с персоналом	534	1	1
по налогам и сборам	535	101	159
по социальному страхованию и обеспечению	536	29	21
разных кредиторов	537	519	400
прочая кредиторская задолженность	538		
Задолженность перед учредителями	540	25	48
В том числе:			
по выплате доходов, дивидендов	541	25	48
прочая	542		
Резервы предстоящих расходов	550		
Прочие виды обязательств	560		
ИТОГО по разделу IV	590	**1581**	**1283**
БАЛАНС	600	**36821**	**40502**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	7891	6822
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	1349	1180
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020)	020	6542	5642
Из строки 010 сумма государственной помощи на покрытие разницы в ценах и тарифах	021		
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	4158	3676
Управленческие расходы	040	1099	856
Расходы на реализацию	050	439	177
Прибыль (убыток) от реализации (020-030-040-050)	060	846	933
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	070	5	810
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	071	2	2
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	080	3	808
В том числе:			
От сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование	081		
От выбытия основных средств и нематериальных активов	082	1	11
Прочие операционные доходы	083	2	797
Операционные расходы	090	31	800
В том числе:			
От сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование	091		
От выбытия основных средств и нематериальных активов	092	3	5
Прочие операционные расходы	093	28	795
Прибыль (убыток) от совместной деятельности	100		
Доходы (потери) от участия в уставных фондах других организаций	110	394	279
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (080-090±100±110)	120	366	287
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	41	43
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	7	5
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140	34	38
В том числе:			
От списания кредиторской задолженности	141		1
Курсовые и суммовые разницы	142		
Безвозмездно полученные активы (включая денежные средства и суммы государственной помощи)	143		
Прочие внереализационные доходы	144	34	37
Внереализационные расходы	150	331	304
В том числе:			
От списания дебиторской задолженности	151	30	6
Курсовые и суммовые разницы	152		
Безвозмездно переданные активы (включая денежные средства)	153	1	
Прочие внереализационные расходы	154	300	298
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	-297	-266
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (060+120+160)	200	915	954
Налоги и сборы, производимые из прибыли	210	543	453
Прочие расходы и платежи из прибыли	220		-7
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-210-220)	240	372	508
Справочно (из строки 240). Сумма льготы по налогу на прибыль			

Данные отчетности подтверждены *(наименование и номер лицензии аудиторской организации или наименование контролирующего органа, проводившего проверку)*	**Заключение РУП «Служба ведомственного контроля концерна «Беллегпром» от 04.02.2008 г. № 02-07/28**

Кол-во акционеров Всего **7283** В том числе: Юридических лиц **6** Физических лиц **7277**

ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	*Миллионов рублей*	**90**	**63**
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	*Рублей*	**129**	**90**
Обеспеченность акции имуществом Общества	*Тысяч рублей*	**56**	**50**
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	*Штук*	—	—
ИНФОРМАЦИЯ О ЗАДОЛЖЕННОСТИ			
Просроченная дебиторская задолженность	*Миллионов рублей*	**72**	**551**
Просроченная кредиторская задолженность	*Миллионов рублей*	—	**71**
Среднесписочная численность работающих (человек)		**77**	
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг		**Сдача в наем имущества**	
		Оптовая торговля	

Генеральный директор Стриж Николай Федорович
Главный бухгалтер Тарасенко Валентина Алексеевна

19 марта 2008 года УНП 100347020

КЛЯНОВІК ГЕНАДЗЯ ПАШКОВА

Сённяшні госць «Звязды» — дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя», паэт Генадзь Пашкоў

— Генадзь Пятровіч, ужо 13-ы год вы з'яўляецеся дырэктарам выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя»...

— Раней гэта пасада называлася «галоўны рэдактар». Таму што заснавальнік і першы кіраўнік Энцыклапедыі, народны паэт Беларусі Пятрусь Броўка, складаючы штатны расклад, сказаў: «Я не чыноўнік — галоўны рэдактар, а не дырэктар». Так і вялося доўгія гады.

— Выдавецтва крочыць у нагу з часам?

— У выдавецтве ў апошнія гады вельмі многае змянілася. Калі я пачынаў тут працаваць, тэхніка была «слабенькая»: наборныя машыны, прымітыўныя комплексы — калі глядзець з сённяшняга дня. Наступова набывалі сучасную тэхніку — каб паскорыць вытворчы працэс. Тым больш што стварэнне энцыклапедыі — надзвычай карпатлівая праца, нечым падобная на работу канвеера на прадпрыемстве, дзе неабходна гранічная дакладнасць. У нас не возьмеш рэдагаваць кнігу дадому, бо асноўныя рукапісы ствараюцца ў выдавецтве. Гэта невялікія артыкулы, якія патрабуюць вялікай працы шматлікіх аўтараў.

На сёння мы добра абсталяваныя. У мінулым годзе Міністэрства інфармацыі выдзеліла сродкі на набыццё электроннай тэхнікі.

— На якой мове выдаецца асноўная частка энцыклапедый?

— Летась мы выдалі 13 кніг. З іх на роднай мове: «Блакітны скарб Беларусі» (рэкі, азёры, кожны вадаём краіны), «Вялікае княства Літоўскае» (2 тамы), «Гарады і вёскі Беларусі. Брэсцкая вобласць», «Праваслаўныя храмы Беларусі». Асноўная частка літаратуры выходзіць на беларускай мове.

— Генадзь Пятровіч, праца ў выдавецтве не замінае літаратурнай творчасці?

— Пра гэта не даводзіцца нават і думаць. Сёння літаратар, як вы ведаеце, з творчасці сваёй не пражыве. Творчасць ёсць творчасць, а штодзённая праца — гэта праца. Ты ж не прымушаеш сябе пісаць вершы. Калі натхненне нараджаецца ў душы, іскрынка запала — нейкая ўражлівая падзея ці сустрэча...

На працы вершы, вядома ж, не пішаш. А вось сярод ночы можаш падняцца — і напісаць хоць адну выдатную страфу, якая пасля стане вершам. А можаш і цэлы верш напісаць... Каб была паэзія, павінна быць пэўнае ўтрапненне, натхненне.

— Як вы ставіцеся да меркавання, што ўзрост не спрыяе паэзіі, а зусім наадварот?

— Думаю, гэта не так. Ва ўсякім разе, па сабе адчуваю: душа яшчэ хоча лятаць, душа яшчэ хоча здзіўляцца, душа яшчэ хоча спяваць.

— Гэта, мабыць, радкі з аднаго з вашых апошніх вершаў?

— Не, гэта экспромт *(смяецца)*. Хоць... многае залежыць, безумоўна, ад характару чалавека. Ёсць і такія людзі: «Года к суровой прозе клонят...» А ёсць і зусім іншыя прыклады ў беларускай літаратуры. Да сталага ўзросту плённа працавалі і Аркадзь Куляшоў, і Пятрусь Броўка, і Максім Танк, і Пімен Панчанка, і Аляксей Пысін... Узрост не перашкаджаў пісаць цудоўныя вершы.

Генадзь ПАШКОЎ з Іванам ШАМЯКІНЫМ.

— Генадзь Пятровіч, вы нарадзіліся амаль у дзень вясновага раўнадзенства.

— Сапраўды: 23 сакавіка. Пра гэты дзень яшчэ гавораць: касмічная вясна. Адчуванне гэтага неяк грэе душу!

— Напэўна, гэта «касмічная» дата паўплывала на ваш характар, светаадчуванне?

— Усё можа быць... Калі чытаю гараскопы на тыдзень наперад — часам і супадае рэчаіснасць з тым, што прадказвалі зоркі.

— Як паэт, вы верыце ў прадказанні, «знакі лёсу», прыкметы?

— Мы шмат чаго яшчэ не ведаем — што там, у Космасе. Не ўсё яшчэ разумеем, што закладзена ў псіхалогіі чалавека. Сумнявацца ці ўвогуле рабіць выгляд, што нічога гэтага не існуе, відаць, няварта.

— Вы нарадзіліся ў Чашніцкім раёне, у вёсцы Ліпавічы...

— Але мне было 5 гадоў, калі сям'я пераехала на Гродзеншчыну. Жылі мы ў Смаргонскім раёне, на хутары каля вёскі Войстам. Маці была настаўніцай, а ў Заходняй Беларусі пасля вайны не хапала спецыялістаў.

— Там засталася сядзіба?

— Хаты ўжо няма. Але засталіся камяні хатняга падмурку. Некалі, яшчэ малы, я пасадзіў каля хаты чатыры рабінкі. Яны ўжо вялікія-вялікія... А непадалёк — ясень, я звычайна ўзлазіў на яго паглядзець, ці хутка прыйдзе маці са школы. На ўвесь падворак разрасłася пасаджаная мной шыпшына. І стаіць стары склеп, цалкам вылажаны з камянёў.

— Вы час ад часу там бываеце?

— Там пахаваныя і маці, і бацька. Хоць бы раз на год — абавязкова прыязджаю. І кожны раз заязджаю на наш хутарок. І калі ўзбіраюся на каменны «горб» старога склепа, то бачна вельмі далёка. Месца гэта — на скрыжаванні: стаіш у Смаргонскім раёне, бачна суседняя вёска Папоўка Вілейскага раёна, а там, за лесам, пяшчаная выспа, за якой возера Нарач у Мядзельскім раёне.

— А лецішча ў вас ёсць?

— Так. У гістарычным месцы, каля Заслаўя. Знакамітая пісьменніцкая Лысая Гара.

— Звычайна на ваш дзень нараджэння вясна дорыць бярозавы сок, бярозавік. А ў вас ёсць зборнік вершаў «Кляновік».

— Гэта мой самы першы паэтычны зборнік. Назваў яго так — бо вясной самы першы і самы салодкі сок акурат клёна. З дзяцінства ведаю!

— Цяпер таксама кляновік «здабываеце»?

— Не, такім «браканьерствам» ужо не займаюся.

— Але смак таго кляновіка з дзяцінства ў душы вашай, мабыць, адчуваецца?

— Каля нашай школы на гары рос клён, і мы, малыя, рабілі лунку-лапінку — прыпадалі вуснамі і так смакавалі кляновік.

— Якія асабістыя вяршыні вы самі вызначылі б у творчасці?

— У жыцці я наогул баюся вышыні. Хоць у самалёце люблю лятаць, бо ў ім адчуваю сябе ўтульна: у гэтай «капсуле» ёсць пэўнае адчуванне зямлі, хоць яна і няблізка... Але вышынь усё роўна баюся — асабліва там, дзе ты «адкрыты»: у гарах, дзесьці наверсе не зусім зручна сябе адчуваю. Можа, гэта страх дзяцінства?.. Каля вёскі на гары стаяў маяк. А каб туды не лазілі дзеці, верхняя прыступка была адбіта. Але ж дзіцячая дапытлівасць!.. Аднойчы я ўскараскаўся на той маяк, а назад не змог злезці. Мяне здымалі адтуль — літаральна сцягвалі на вяроўках. За гэты час я столькі страху нацярпеўся на вышыні...

Што датычыцца творчасці, усе мае вершы — як дзеці. Кожны верш дарагі. А калі гаварыць пра творчыя вяршыні, дык яны ў кожнага верша свае — большыя ці меншыя...

Таццяна ПАДАЛЯК.

АД РЭДАКЦЫІ.
Заўтра Генадзь Пятровіч Пашкоў будзе святкаваць юбілей. Шчыра віншуем!

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

Лекавыя парасткі

Самыя першыя вясновыя парасткі з'яўляюцца не ў лесе і не на агародзе, а ў нашых хатніх склепах, там, дзе захоўваецца агародніна. Калі пачынае прарастаць бульба, мы засмучаемся і імкнёмся пазбавіцца ад гэтай «напасці». Сапраўды, парасткі бульбы ўжываць нельга, затое ў народнай медыцыне яны лічацца выдатным сродкам ад некаторых захворванняў.

КАРЫСНЫ ЯД

Акрамя мноства неабходных нам мікраэлементаў, амінакіслот, вітамінаў (асабліва С і Р), у бульбе змяшчаецца стэроідны алкалоід — саланін. І больш за ўсё яго ў кветках, пазелянелай лупіне і парастках. Гэтыя часткі бульбы мы не выкарыстоўваем у ежу: пазелянелую лупіну абразаем, а парасткі абломваем і выкідваем. Бо саланін — гэта атрутнае рэчыва, гемалітычны яд. Аднак дзейнасць яго на арганізм залежыць ад дозы: у вялікай колькасці ён выклікае атручэнне, а ў малой валодае абязбольвальным, процізапаленчым і спазмалітычным дзеянне.

Бульбяныя парасткі — гэта сапраўдны паратунак для тых, хто пакутуе ад захворванняў суставаў. Таму акуратна збярыце іх, добра прамыйце і прыгатуйце лякарства.

РАСЦІРАННЕ ДЛЯ СУСТАВАЎ

Для лячэння артрытаў, артрозаў, падагры ў народнай медыцыне выкарыстоўваюць расціранне са спіртавога настою парасткаў бульбы.

Напоўніце двухлітровы слоік да «плечыкаў» прамытымі вясновымі парасткамі, заліце 70-працэнтным спіртам і пастаўце ў цёплае цёмнае месца на 2 тыдні. Перад уціраннем настойкі прамасіруйце хворы сустаў, а пасля працэдуры ўхутайце шарсцяной тканінай.

Абязбольвальны эфект ад такіх расціранняў звычайна адчуваецца вельмі хутка, а пры працяглым лячэнні праходзіць ацёчнасць і запаленне і пры поліартрыце.

КАМПРЭСЫ СУПРАЦЬ БУРСІТУ

Шмат пакут прычыняе бурсіт — запаленне калясустаўнай сумкі. І ў гэтым выпадку дапамагаюць бульбяныя парасткі.

Вазьміце 300 г парасткаў даўжынёй 5—6 см, старанна прамыйце, здрабніце ў мясарубцы. Атрыманую кашку заліце 300 г «Трайнога» адэкалону. У вас атрымаецца прыкладна паўлітровы слоік лякарства. Настойвайце яго ў цёплым цёмным месцы 10 дзён, штодня ўстрэсвайце.

З гэтай процізапаленчай і абязбольвальнай сумесі рабіце кампрэсы на балючае месца 3—4 разы на дзень.

ЗАПРАШАЕМ ДА СТАЛА

Рыбная салянка

1 кг марскога акуня, 8 белых грыбоў ці 15—20 шампіньёнаў (марынаваных), 1 шк. квашанай капусты, 1 салёны агурок, 100 г зяленіва, 1 цыбуліна, 2 ст. лыжкі мукі, 5—7 гарошын перцу, крыху расолу, 12—15 шт. маслін ці алівак, 50 г алею.

Прыгатуйце грыбны адвар, цыбулю абсмажце на алеі, а муку — без дабаўлення алею і развядзіце невялікай колькасцю вады ці булёну. Салёны агурок аблупіце, нарэжце лустачкамі. Падрыхтаваную рыбу нарэжце невялікімі кавалачкамі. У гатовы грыбны адвар пакладзіце спачатку рыбу, праз 5—7 хвілін квашаную капусту, агурок, абсмажаную цыбулю, муку, лаўровы ліст і перац. За 5—10 хвілін да гатоўнасці — агурочны расол. Упрыгожце лустачкай лімона, маслінамі ці аліўкамі, пасыпце зяленівам.

-2486-

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

Шкодны нораў новых аўтамабіляў

Даказана, што пах новага аўтамабіля хавае ў сабе шмат небяспек для здароўя чалавека. На думку вучоных, гэта цэлы кактэйль з вельмі шкодных кампанентаў, якія выдзяляюцца клеем, фарбамі, вінілам і пластмасамі, што выкарыстоўваюцца пры аздабленні салона машыны. Гэтыя лятучыя злучэнні могуць выклікаць галаўны боль, пяршэнне ў горле, ваніты, слабасць. Спецыялісты сцвярджаюць, што аб уроне здароўю можна казаць, калі чалавек праводзіць у новым аўтамабілі паўтары гадзіны ў дзень.

ПАРАДЫ ПСІХОЛАГА

Тэрыторыя камфорту

Здараецца так, што і ў сям'і нібыта ўсё нармальна, аднак, знаходзячыся дома, не-не, ды і адчуваеш нейкі дыскамфорт. Крыўдна? Так! Псіхолагі сцвярджаюць, што дыскамфорт гэты можна ўстараніць, трэба толькі выявіць яго прычыны і прыняць адпаведныя меры.

Адным з негатыўных фактараў з'яўляецца... цесната, адсутнасць магчымасці нават дома адасобіцца, адпачыць ад пастаяннага знаходжання «на людзях». А пабыць сам-насам бывае іншы раз проста неабходна, асабліва жыхарам вялікіх гарадоў.

Дзе ж выйсце, калі жывеш усёй вялікай сям'ёй у невялікай кватэры, а палепшыць жыллёвыя ўмовы так, каб кожны член сям'і меў па пакою, нельга? Аказваецца, становішча можна цалкам выправіць. Для гэтага дастаткова замацаваць за кожным членам сям'і аблюбаваную ім тэрыторыю. Напрыклад, жонка любіць увечары пасядзець з кніжкай на канапе, а муж у крэсле перад тэлевізарам. І вось, прыйшоўшы з работы і пакарміўшы сям'ю вячэрай, яна, як заўсёды, сабралася пачытаць перад сном... А любімае месца «акупаваў» муж: яму захацелася менавіта там пагартаць часопіс. Спрабуючы «задушыць» незадаволенасць, яна пачынае шукаць, куды б прыткнуцца. Калі такая сітуацыя будзе паўтарацца часта, то рана ці позна яна ўскіпіць і выплюхне назапашанае раздражненне на «акупанта». Успыхне сварка.



Каб пазбегнуць падобных канфліктаў, дастаткова дамовіцца з усімі хатнімі аб тым, што кожнаму адводзіцца свая «тэрыторыя» (крэсла, канапа, пісьмовы стол) і ўзяць за правіла: калі чалавек знаходзіцца дома, яго тэрыторыю без дазволу не займаць і, калі ён атабарыцца ў сваім «гняздзечку», не турбаваць.

Яшчэ адзін дзейсны прыём, які дазваляе палепшыць атмасферу ў доме і згладзіць канфлікты, — паставіць у кухні ці пакоі круглы стол. Па-першае, ён зойме значна менш месца, чым прамавугольны. Па-другое, вы самі здзівіцеся, як згладзіць ён атмасферу там, дзе звычайна збіраецца ўся сям'я. Менавіта за круглым сталом уладжваюцца, як правіла, усе канфлікты і заключаюцца перамір'і. Памятаеце абыходкавы выраз: «Перагаворы за круглым сталом»? Чаму за круглым? А таму, што круглы стол дазваляе пазбегнуць вострых вуглоў у зносінах, псіхалагічна настройвае тых, хто сабраўся вакол, на мірны лад. Недарэмна ж з даўніх часоў людзі пазбягаюць садзіцца на рагу стала, баючыся не выйсці замуж, не ажаніцца ці, крый божа, развесціся.

Дарэчы, таго ж прынцыпу варта прытрымлівацца і пры выбары шафаў, ложкаў, тумбачак і г.д. Аддавайце перавагу мэблі з закругленымі вугламі.

-2487-

Выстава

Падгледзець за любоўным жыццём раслін

прапаноўвае «Гербарый кахання» шведскага аўтара Эдварда Коіньера

Гэтая выстава працуе ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі і дае магчымасць адначасова дакрануцца да свету раслін, спасцігнуць сутнасць працы шведскага батаніка Карла Лінея і зразумець, што можа фотамастацтва, якое здолела ўвасобіць нават навуковую тэорыю!

Гэта сапраўды так, таму што Эдвард Коіньер умее зняць расліны так, што адсылае гледачоў да часоў Карла Лінея. Гэты даследчык нарадзіўся 300 гадоў таму, зрабіў шмат адкрыццяў і распрацаваў тэорыю пра любоўнае жыццё раслін. «Кветка — гэта шлюбны ложак, дзе песцік і тычынка ўступаюць у саюз...» Між іншым, Ліней праводзіў паралелі паміж сістэмамі размнажэння раслін і людзей. Але яго зямляк і наш сучаснік Коіньер накіроўвае сваю фотакамеру на прыгожыя расліны, быццам бы без намёкаў на іншых стварэнняў прыроды. Але захапляючыся дзівоснасцю кветак, напрыклад, міжволі думаеш пра тое, як гарманічна прырода распрацавала свае сістэмы, вяршыняй якіх з'яўляецца свет людзей. Нядзіўна, што гэтую выставу выдатна прынялі жыхары многіх краін свету — Кітая, Аўстраліі, ЗША, Паўднёвай Афрыкі і ў Еўропе. Дзякуючы Шведскаму Інстытуту «Гербарый кахання» прадстаўлены ў Беларусі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал 2008 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 31 сакавіка** ў рэдакцыю па адрасе:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, печ ЗВЧ, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Розыгрыш прызоў праводзіцца **4 красавіка 2008 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 12 красавіка**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 чэрвеня 2008 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2008 года і пашпарта. Дастаўку печы ЗВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 1 сакавіка 2008 года. Удачы ў гульні!

Тэрмін правядзення гульні — з 1.03.08 па 10.04.08.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 964 ад 26.02.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

5 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал 2008 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на II кв. 2008 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____
Колькасць камплектаў _____

на 2008 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)
_____
(адрас)
_____
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____

ПВ	месца	літар

Кошт: падпіскі _____ руб.; перадрасоўкі _____ руб.
Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)
_____
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Абітурыент-2008

На прафадбор актыўна рэгіструюцца толькі школьнікі...

Усяго 10 дзён засталося да заканчэння рэгістрацыі абітурыентаў, якія хочуць прайсці прафесійна-псіхалагічнае субяседаванне. У Беларускім дзяржаўным універсітэце рэгістрацыя ідзе надзвычай актыўна — штодня ў прыёмную камісію звяртаюцца з заявамі каля 200 чалавек. Такім чынам агульная колькасць маладых людзей, якія выбралі месцам праходжання папярэдняга прафадбору менавіта Белдзяржуніверсітэт, перавысіла ўжо 1,5 тысячы чалавек. Адметна, што прыкладна палова ад агульнай колькасці прайшоўшых рэгістрацыю збіраюцца паступаць на групу спецыяльнасцяў «права» і «эканамічнае права». Далей па папулярнасці ідуць «міжнародныя адносіны» і «журналістыка».

Такім чынам выказаныя раней меркаванні, што асноўная нагрузка пры правядзенні прафадбору можа легчы на плечы БДУ, спраўджваюцца. Напрыклад, у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка, дзе можна прайсці субяседаванне па спецыяльнасці «журналістыка», ажыятажу не назіраецца.

— Магчыма, абітурыентаў стрымлівае тая акалічнасць, што ў педуніверсітэце рыхтуюць журналістаў для дзіцячых і юнацкіх СМІ, — падзяліўся сваімі думкамі з карэспандэнтам «Звязды» намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі БДУ Аляксандр Шыбут. — Аднак для атрымання рэкамендацыі не мае ніякага значэння, дзе абітурыент будзе праходзіць прафесійна-псіхалагічнае субяседаванне. Тая ж сітуацыя і з «правазнаўствам». Субяседаванне пры паступленні на гэту спецыяльнасць праводзяць у сталіцы акрамя нас яшчэ шэсць прыватных ВНУ. Аднак абітурыенты «штурмуюць» менавіта Белдзяржуніверсітэт. Між іншым, нас вельмі хвалюе наступная акалічнасць: пакуль што ў прыёмную камісію прыходзяць пераважна школьнікі. Аднак прафесійна-псіхалагічнае субяседаванне абавязкова трэба прайсці ўсім, хто плануе паступаць на завочную форму навучання, на скарочаныя тэрміны навучання, на паралельнае навучанне, ці атрымліваць другую вышэйшую адукацыю. А такіх прыходзяць да нас толькі адзінкі. Падазраём, што да гэтай катэгорыі патэнцыяльных абітурыентаў патрэбная інфармацыя проста не дайшла. І іх чакае сур'ёзнае расчараванне, таму што рэгістрацыя завяршаецца 31 сакавіка, і далей ужо ніякія абставіны і тлумачэнні, маўляў, першы раз пачулі, не будуць брацца пад увагу. З планамі на паступленне давядзецца развітацца сама меней на год.

Рэгістрацыя ў БДУ праходзіць штодня, акрамя нядзелі. З панядзелка па пятніцу з 9.00 да 17.00, а ў суботу — з 9.00 да 14.00. Пад правядзенне субяседавання пакуль зарэзерваваныя тры суботы: 5, 12 і 19 красавіка. А 30 красавіка вырашылі пакінуць для тых абітурыентаў, якія па ўважлівых прычынах прапусцілі субяседаванне ў вызначаны для іх дзень.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Спорт-тайм

Хакеісты вызначаюць фіналістаў

У першых паўфінальных матчах экстралігі перамогу святкавалі мінскія «Керамін» і «Юнацтва», якія адпаведна выйгралі ў «Віцебска» (3:1) і «Дынама» (4:1). Наступная гульня серыі адбылася ўчора, далейшыя матчы пройдуць 24 і, калі спатрэбіцца, 25 і 27 сакавіка.

Бэкхэм адсвяткуе юбілей?

Зборная Англіі, сапернік беларускіх футбалістаў па адборачным турніры да ЧС-2010, рыхтуецца да таварыскага матча з французамі, які пройдзе 26 сакавіка ў Парыжы. Сярод 30 выкліканых ігракоў ёсць і прозвішча паўабаронцы «Лос-Анджэлес Гэлаксі» Дэвіда Бэкхэма. Тое, што галоўны трэнер англічан Фабіа Капэла вярнуў яго ў каманду, значыць, што ў выпадку выхаду на поле Бэкхэм правядзе ў складзе нацыянальнай зборнай свой 100 матч.

СЫХОДЗІЦЬ І НЕ СЫХОДЗІЦЬ

Прэм'ера

Барыс Луцэнка, які пакінуў пасаду мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага, тым часам паказвае, што мае намер працаваць як рэжысёр. У яго сваё ўяўленне пра тэатр, пра яго задачы. Барыса Луцэнку цікавяць загадкі чалавечай душы, а сам ён імкнецца знаходзіць да іх разгадкі. Вось такая гульня атрымліваецца.

Хоць сам пастаноўшчык новага спектакля, які мае назву «Сыходзіў муж ад жонкі», імкнуўся даказаць сваё працай: з чалавечай душой гуляць немагчыма. Два чалавекі, якія былі адзін аднаму не чужыя, імкнуцца разабрацца ў сваіх адносінах, дзе былі падман, крыўды, шмат болю, імкнуцца вырашыць, што будзе лепш для кожнага з іх — развітацца ці застацца жыць разам. І тое і тое — складана для герояў Бэлы Масумян і Алега Корчыкава. І калі меркаваць, што тэатр — таксама сям'я, то відавочна, што і сам рэжысёр Барыс Луцэнка ведае, як цяжка бывае сысці і як не проста заставацца...

Ларыса ЦІМОШЫК.

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

Суліма

Шчыт падзелены, у верхняй, залатой частцы паўарла чорнага, у ніжняй, чырвонай — тры каштоўныя камяні ў залатой аправе.

Гербам СУЛІМА карысталіся: Азямблоўскі, Анкудовіч, Баркоўскі, Браткоўскі, Вансовіч, Вештарт, Влодак, Вольскі, Вусовіч, Гаеўскі, Гамрат, Гарбоўскі. Даніловіч, Дзяржэнскі, Дзяржынскі, Дзяржноўскі/Дзярноўскі, Забалоцкі, Заблоцкі, Завіша, Задарноўскі, Заленскі, Залескі, Камінскі, Канапяльчыцкі, Лычкоўскі, Попель, Прыгодскі, Прылуцкі, Прыбароўскі, Пшавускі, Радзівіл, Рычгорскі, Савіч, Самойла, Самуйла, Станіслаўскі, Стравінскі, Суліма, Сулкоўскі, Уланоўскі, Шулякоўскі.

Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

СКАНВОРД (15 сакавіка). Па гарызанталі: Самбрэра. Вэлюм. Папа. Атос. Фарс. Гід. Стаж. Штыр. Сум. Эму. Альпака. Бра. Пан. Кут. Барк. Дуля. Сатрап. Фаска. Рынак. Гама. Нарада. Авар. Ксі. Саната. Пакт. Паляна. Крос. Клад. Ярмолка. **Па вертыкалі:** Стараста. Куфар. Вальс. Лем. Ясак. Сапа. Сноп. Апука. Сані. Сава. Манна. Палка. Эпас. Тырса. Ярд. Молат. Кіно. Ост. "Ася". Мыс. Прас. Крэм. Банан. Грубка. Ава. Рур. Кат. Канфедэратка. Ратонда.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Вадалеям трэба асцерагацца службовых раманаў, а Львам лепш не займацца капаннем у сабе

ВАЕН. На рабоце ўсё складваецца ўдала, у многіх справах вас чакае поспех і адчуванне асабістай незаменнасці. Важна правільна спланаваць справы на гэты тыдзень, каб не перарасходаваць сілы. Адчуўшы прыліў энергіі, не варта хапацца за некалькі спраў адразу — лепш спыніцца на чымсьці адным, найбольш значным для вас.

ЦЯЛЕЦ. Праявяцца вашы рознабаковыя таленты: аднолькава добра будуць удавацца як бытавыя, так і прафесійныя справы. Пастарайцеся не забывацца пра некаторыя правілы і праявіце рашучасць у пераадольванні цяжкасцяў. Парадуйце блізкіх — іх удзячнасць будзе спрыяць вашаму добраму настрою. У пятніцу адкладзіце дробныя справы, якія раздражняюць, і займіцеся рашэннем больш важных праблем.

БЛІЗНЯТЫ. У пачатку тыдня да вас можа падкрасціся работа: яна захопіць вас у палон, і вы трапіце ў вір першачарговых неадкладных спраў. Напружаны рытм тыдня можа паўплываць на працаздольнасць, а калі да абавязацельстваў, якія існуюць, дададуцца новыя, будзе цяжка з гэтым справіцца. У аўторак не ўцягвайцеся ў інтрыгі — гэта не дабавіць душэўнай раўнавагі.

РАК. Прафесійная галіна запатрабуе пільнай увагі і непасрэднага ўдзелу. Для таго, каб утрымліваць кантроль над сітуацыяй, вам спатрэбіцца развязвівасць і ўменне выконваць работу ў вызначаны тэрмін. У панядзелак пастарайцеся ні з кім не сварыцца. Аўторак — спрыяльны дзень для максімальнай актыўнасці і рашучых дзеянняў.

ЛЕЎ. Пажадана не займацца капаннем у сабе, каб у выніку не зведаць пачуцця расчаравання. Серада — адзін з самых паспяховых дзён тыдня, калі ведаеце, чаго хочаце дабіцца. Для дасягнення максімальнай паспяховасці спатрэбяцца такія якасці, як засяроджанасць і ўпэўненасць у асабістых сілах. У чацвер лепш не пачынаць нічога новага, а ўсе важныя справы і сустрэчы перанесці на пятніцу.

ДЗЕВА. З'явіцца магчымасць зрабіць шмат добрых спраў і дабіцца значных поспехаў на рабоце, але гэта не нагода для зазнайства. Пры жаданні і засяроджанасці на галоўных пытаннях зможаце дасягнуць добрых вынікаў і рэалізаваць практычна ўсё, што намецілі. Самым неэфектыўным днём можа аказацца панядзелак — не варта пачынаць нічога новага і пажадана захоўваць асцярожнасць ва ўсім.

ШАЛІ. Нечаканыя сустрэчы і дзіўныя выпадкі пройдуць як у калейдаскопе і наўрад ці дадуць вам засумаваць. Лавіце ўдачу: выкарыстайце гэты час не толькі для забаў, але і па справе. Можаце пачуць нямала камплімента ў — многія будуць упэўніваць вас у тым, што вы надзвычайная асоба. Вам па сілах арганізацыя цікавага і незвычайнага мерапрыемства. Не шкадуйце часу на зносіны і перамяшчэнні — усё будзе складвацца цудоўна.

СКАРПІЁН. Давядзецца адстойваць свой аўтарытэт і, магчыма, нават пацвярджаць кампетэнтнасць у пытаннях работы. У панядзелак будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі. У аўторак можа парадаваць цікавая інфармацыя. Не адцягвайце ўвагі, рабіце сваю справу і дайце магчымасць іншым займацца сваімі пытаннямі. Цяпер неабходна працаваць на бліжэйшую будучыню, рэалізацыю і зацвярджэнне новых ідэй і планаў.

СТРАЛЕЦ. Будзьце больш уважлівымі да цікавых супадзенняў і дробных дэталяў, бо менавіта ў іх і будуць утрымлівацца адказы на ўсе вашы пытанні. Панядзелак спрыяльны для атрымання тайных ведаў. У гэты дзень непажадана глядзецца ў люстэрка. Серада — дзень, поўны ілюзій: не прымайце ніякіх рашэнняў. Другая палова тыдня спрыяльная для пачатку рамонту ці іншых сур'ёзных перамен у вашым доме.

КАЗЯРОГ. Фартуна на вашым баку і вы можаце справіцца практычна з любой праблемай. Удача будзе спадарожнічаць у пачынаннях, якія звязаны з творчасцю. Папоўніце кола зносінаў з прыемнымі і карыснымі для вас людзьмі. Перш чым прыняць сур'ёзнае рашэнне, пастарайцеся ўсё добра абдумаць. Панядзелак паспяховы для новых спраў і пачынанняў. У серадy праявіце асцярожнасць і ўважлівасць.

ВАДАЛЕЙ. Дзелавыя адносіны, якія складваліся нядрэнна, нечакана могуць перайсці ў іншую плоскасць. Асцерагайцеся службовых раманаў: яны могуць загубіць кар'еру. Не выключана, што вам давядзецца пачынаць наноў. Пажадана перагледзець свой стыль паводзінаў, магчыма — змяніць імідж. Панядзелак — адзін з самых плённых дзён тыдня, калі можна зрабіць значна больш, чым запланавана.

РЫБЫ. Сумленнай працай вы справядліва заваюеце ўвагу навакольных. Аўторак не лепшы дзень для прыняцця адказных рашэнняў, але спрыяльны для творчай працы. У серадy вас могуць падтрымаць аднадумцы і начальства, з'явіцца магчымасць паказаць свае здольнасці. У пятніцу адмоўцеся ад асабістых амбіцый — гэта дазволіць захаваць час, сілы і нервы. Нядзелю лепш правесці дома, займаючыся бытавымі дробязямі.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ 2008 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Люстэрка Чарнобылю
Местное самоуправление
Свая справа
Жыві на Гандолі
Чырвоная змена
Купі лепшае! Тавары Паслугі Цэны
Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8800 рублёў на месяц 26400 рублёў на квартал 52800 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	8300 рублёў на месяц 24900 рублёў на квартал 49800 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	14000 рублёў на месяц 42000 рублёў на квартал 84000 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	12800 рублёў на месяц 38400 рублёў на квартал 76800 рублёў на паўгоддзе
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)		
ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	7460 рублёў на месяц 26400 рублёў на квартал 44760 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	6990 рублёў на месяц 20970 рублёў на квартал 41940 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	9938 рублёў на месяц 29814 рублёў на квартал 59628 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	9431 рубель на месяц 28293 рублі на квартал 56586 рублёў на паўгоддзе

Усміхнёмся!

Жонка і муж:
— Што — зноў? Дзе піў, туды і ідзі, зразумеў!?
— Зразумеў. Алё, Ваван, усё ў парадку, я адпрасіўся!

☺

Раніцай едзеш на дачу, а ўвечары вяртаешся з гэтага паганага агарода.

☺

— Ты што, пакрыўдзілася?
— Не, я па сякеру...

☺

Аб'ява ў электрычцы па гучнай сувязі:
— Грамадзяне безбілетнікі, якія перабягаюць на прыпынках з вагона ў вагон! Будзьце асцярожныя — платформа сырая і слізкая!

☺

— Адкуль у цябе на штанах гэты светлы волас?
— Мусіць, у трамваі прычапіўся...
— А ці не мае ён адносінаў да тваёй бялявай сакратаркі?
— Глупства, я заўсёды здымаю штаны.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.06	18.27	12.21
Віцебск —	5.56	18.17	12.21
Магілёў —	5.57	18.17	12.20
Гомель —	5.54	18.13	12.19
Гродна —	6.21	18.42	12.21
Брэст —	6.23	18.42	12.19

Месяц
Поўня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны
Пр. *Наталлі, Валерыя, Івана, Іллі, Мікалая, Пятра, Рыгора, Сяргея, Тараса.*
К. *Катарыны, Багуслава, Захарыя, Паўла, Казіміра.*

Дзве даты

22 сакавіка

1894 год — адбыўся першы афіцыйны хакейны матч: у матчы за Кубак Стэнлі сустрэліся каманды «Манрэаль» і «Атава» (3:1).



1951 год — Амерыканская асацыяцыя ўрачоў упершыню заявіла, што курэнне выклікае рак.

Цытата дня:

«Чаму ў нас няма дзевяці жыццяў, як у кошкі? Ды мы і адну не выкарыстоўваем як след!».
Уініфрэд Хоултбі.

НАДВОР'Е на заўтра



Приорбанк
Открытое акционерное общество
RZB Group

УТВЕРЖДЕНО:
Решением Наблюдательного совета «Приорбанк» ОАО
Протокол № 2
от 27 февраля 2008 г.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций «Приорбанк» Открытого акционерного общества третьего выпуска, обеспеченных обязательствами по возврату основной суммы долга и уплате процентов по предоставленным кредитам на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости

1. Наименование эмитента (на белорусском и русском языках):
На белорусском языке:
полное — «Прыорбанк» Адкрытае акцыянернае таварыства;
сокращенное — «Прыорбанк» ААТ.
На русском языке:
полное — «Приорбанк» Открытое акционерное общество;
сокращенное — «Приорбанк» ОАО.

2. Дата и номер государственной регистрации эмитента как юридического лица, наименование регистрирующего органа, дата основания (учреждения):
«Приорбанк» Открытое акционерное общество зарегистрировано в Национальном банке Республики Беларусь 12 июля 1991 года под номером 12. Дата основания: 20 января 1989 года.

3. Место нахождения эмитента, юридический и почтовый адрес, телефон, факс, электронный адрес (E-mail):
Юридический и почтовый адрес: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А, тел./факс 289 90 87. Электронный адрес: info@priorbank.by.

4. Номер расчетного и валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при открытой продаже облигаций, наименование и код обслуживающего банка (для эмитентов, кроме банков):
№ 3811 999000105 в «Приорбанк» ОАО, код 749 (для юридических лиц — не банков)
№ 1811 999000107 в «Приорбанк» ОАО, код 749 (для юридических лиц — банков)

5. Сумма зарегистрированного уставного фонда, количество акций по категориям и типам привилегированных акций:
Размер зарегистрированного уставного фонда составляет 102 801 217 650 (Сто два миллиарда восемьсот один миллион двести семнадцать тысяч шестьсот пятьдесят) белорусских рублей.
Номинальная стоимость одной акции 1 275 (Одна тысяча двести семьдесят пять) белорусских рублей.
Количество простых именных акций — 80 618 406 (Восемьдесят миллионов шестьсот восемнадцать тысяч четыреста шесть) штук.
Количество привилегированных именных акций —10 000 (Десять тысяч) штук.

6. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента, и сроки ее публикации:
Периодическое печатное издание «Звязда» не позднее 31 марта года, следующего за отчетным.

7. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии):
Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:
— в центральном офисе «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, В. Хоружей, 31-А с 9:00 до 12:30 и с 13:15 до 16:00;
— в информационном центре «Приорбанк» ОАО (ежедневно кроме выходных и праздничных дней): по телефону +375 17 289 90 87, 187 (в Минске), 487 (для абонентов Velcom и МТС);
— на Интернет-сайте Эмитента — www.priorbank.by (круглосуточно).
Дата принятия решения о выпуске облигаций, номер протокола и наименование органа, принявшего это решение:
Решение о выпуске облигаций принято Наблюдательным советом «Приорбанк» ОАО «27» февраля 2008 года, протокол № 2.

8. Цель выпуска облигаций:
Рефинансирование ранее выданных кредитов на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости.

9. Объем эмиссии, количество и форма и вид выпуска облигаций и связанные с ними права:
Объем эмиссии облигаций составляет 20000000000 (Двадцать миллиардов) белорусских рублей.
Количество облигаций 200000 (Двести тысяч) именных дисконтных бездокументарных облигаций.
Серия «ПР-3», номера «000001—200000».
Облигации выпускаются в виде записей на счетах.
Владелец облигации имеет право на получение по ней номинальной стоимости (основного долга), выплачиваемой при погашении облигации.

10. Номинальная стоимость:
Номинальная стоимость облигации — 100000 (Сто тысяч) белорусских рублей.

11. Период проведения открытой продажи облигаций:
Дата начала продажи: 24 марта 2008 года.
Дата прекращения продажи: 18 июня 2008 года.
Период обращения облигаций с 24 марта 2008 года по 12 марта 2009 года.

12. Место и время открытой продажи облигаций:
Продажа облигаций осуществляется в «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А с 9:00 до 16:00 в рабочие в Республике Беларусь дни, либо на аукционе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

13. Срок обращения облигаций и период начисления процентов:
Срок обращения облигаций с 24 марта 2008 года по 12 марта 2009 года. (353 дней).
Дата погашения облигаций 19 марта 2009 года.
Период начисления процентов с 24 марта 2008 года по 19 марта 2009 года. (360 дней).

14. Дата начала погашения и порядок погашения облигаций:
Погашение облигаций осуществляется по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А «Приорбанк» ОАО с 9:00 до 16:00 в рабочие дни, начиная с 19 марта 2009 года.
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием «Приорбанк» ОАО на дату, следующую за датой окончания срока обращения облигаций (дата закрытия реестра).
Эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев в дату погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций. Списание денежных средств производится по реквизитам последнего держателя, указанным в реестре владельцев облигаций «Приорбанк» ОАО на дату закрытия реестра.
Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета Эмитента по реквизитам владельцев облигаций.

15. Условия и размер выплаты дохода по облигациям, и порядок его определения:
Доходность по размещаемому выпуску облигаций — 11,6 % годовых при размещении «до погашения» на первичном рынке. Выплата дохода по дисконтным облигациям осуществляется единовременно, при погашении облигаций.
Дисконтные облигации продаются по стоимости ниже номинальной и погашаются по номинальной стоимости.
Размер дохода по облигациям определяется как разница между номинальной стоимостью и ценой приобретения облигации у Эмитента.

16. Условия и порядок возврата средств инвесторам при отказе от выпуска облигаций (запрете продажи):
Эмитент производит возврат средств не позднее 10 рабочих дней со дня запрета или приостановки выпуска облигаций (запрете продажи).

17. Дата и номер государственной регистрации облигаций:
«21» марта 2008 года №5-200-02-0126

18. Информация об обеспечении облигаций:
Обеспечением облигаций являются обязательства юридических и (или) физических лиц по возврату основной суммы долга и уплате процентов по предоставленным банком кредитам на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости.
В соответствии с действующим законодательством эмиссия облигаций на любую дату до их погашения (досрочного погашения) не должна превышать 70 процентов основной суммы долга по кредитам на жилищное строительство. Эмитент осуществляет выпуск облигаций в пределах данных ограничений.

19. Порядок перехода прав собственности на облигации на вторичном рынке ценных бумаг, условия конвертации, условия и порядок досрочного погашения облигаций:
Эмитент имеет право выкупить свои облигации для перепродажи, повторного размещения или досрочного погашения. Облигации могут быть досрочно оплачены по решению Эмитента. При принятии положительного решения Эмитентом, оплата производится в течение 6-дней с момента подачи заявки на досрочную оплату. Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении юридическими лицами осуществляется в установленном законодательством порядке через торговую систему открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Конвертация производится согласно решению о выпуске облигаций.

Временно и.о. Председателя Правления **Л.В. Никанорова**

Главный бухгалтер **В.В. Манцивода**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 26 апреля 2007 года. УНП 100220190

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018 Індэкс 63850. Зак. № 1556. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12